# БЕЛАРУСКІ РЭЗЫСТАНС

ЧАСОПІС НАЙНОЎШАЙ ГІСТОРЫІ

**№ 1(17)/2016**

Заснаваны ў 2004 г. у Менску.

**Галоўны рэдактар:** Сяргей Ёрш.

Пры перадруку спасылка абавязковая.




**ЗЬМЕСТ:**

# АРХІЎ РЫГОРА ЗЫБАЙЛЫ

*Беларускі афіцэр пасьля вайны трапіў у Французскі замежны легіён*

У ліпені 2016 году разам з слонімскім краязнаўцам Сяргеем Чыгрыном наведалі Івацэвіцкі раён, дзе пазнаёміліся з сынам беларускага дзеяча часоў Другой сусьветнай вайны Рыгора Зыбайлы (1913 — 1987) Юрыем. Падчас размовы ён распавядаў пра бацьку, паказваў фотаздымкі, дакумэнты, запісную кніжку. Было спадзяваньне, што даведаемся нешта сэнсацыйнае пра ўдзел Зыбайлы ў беларускім Супраціве. Але аказалася, што з сынам на гэтую тэму ён увогуле не размаўляў...

Пачну з таго, што пра Рыгора Барысавіча Зыбайлу ўпершыню даведаўся з кнігі Васіля Раманоўскага “Саўдзельнікі ў злачынствах” (Мінск, 1964). Там згадваўся яго ўдзел у заснаваньні Беларускай незалежніцкай партыі, пасьля — у падрыхтоўцы батальёну “Дальвіц”. Зразумела, што называлі яго “здраднікам”.

У пачатку 1990-х складаў біяграмы кіраўнікоў БНП. Пра некаторых зь іх інфармацыі амаль не было. У кнізе “Другі Ўсебеларускі кангрэс” (Мюнхэн, 1954) прачытаў наступнае: “Зыбайло Рыгор — настаўнік, працаўнік Беларускае Народнае Самапомачы ў Слонімшчыне, акруговы камандзір Беларускае Краёвае Абароны ў Глыбоцкай Акрузе, афіцэр беларускіх збройных сілаў на эміграцыі, сябра БНП, згінуў ад кулі ў падвалах 2-кі польскай арміі Андэрса ў Марсэлі ў 1945 годзе”.

Пра яго трагічную сьмерць напісаў і эмігрант Іван Касяк. У канцы 1944-га беларускі батальён на заходнім фронце перайшоў на бок саюзьнікаў, у яго складзе быў і Зыбайла. Многія, як былыя грамадзяне Польшчы, выказалі жаданьне служыць у польскай арміі Андэрса. У Марсэлі іх правярала польская разьведка. “Падчас праверкі дакумэнтаў надлейтэнант БКА Рыгор Зыбайла прыпадкова выпусьціў на падлогу фатаграфію, на якой ён быў зьняты ў форме лейтэнанта БКА, — піша Касяк. — Разьведчыкі зажадалі пабачыць гэтую фатаграфію, а наступна і ўвесь бумажнік. Агледзеўшы ўсе паперы, яны выявілі Зыбайлу праз заднія

*Рыгор Зыбайла, 1968 г.*

дзьверы. Ніхто ня бачыў яго жывым пасьля таго. Прыпушчальна, ён быў застрэлены польскай разьведкай".

У канцы 1990-х ад дзеяча БНП Віктара Сікоры я даведаўся, што

Рыгора Зыбайлу бачылі ў савецкіх канцлягерах. Нібыта, ён пасьля вайны быў на Захадзе, працаваў у школе выведкі, аднак савецкія агенты яго захапілі і вывезьлі ў савецкую зону. Такую гісторыю Сікора чуў ад кагосьці зь вязьняў.

А ў 2000-м выпадкова сустрэўся з Пятром Пархутам, слонімцам, былым вязьнем ГУЛАГу, які жыў у Калінінградзкім краі Расеі. Падчас сустрэчы ў Слоніме ён згадаў, што падчас нямецкай акупацыі працаваў разам з Зыбайлам і сустракаўся зь ім пасьля вяртаньня зь лягероў у Івацэвіцкім раёне.[1] На той час Рыгора Зыбайлы ўжо не было сярод жывых. Ён памёр 15 лістапада 1987 году. Многія факты зь яго біяграфіі аднак выклікалі пытаньні.

Дык што пра яго вядома? Рыгор Барысавіч Зыбайла нарадзіўся 15 верасьня 1913 году ў вёсцы Елкі ў цяперашнім Івацэвіцкім раёне. Падчас нямецкай акупацыі некаторыя знаёмыя называлі яго "інжынерам", але дзе дакладна ён вучыўся, невядома. З падачы эмігранта Сяргея Хмары памылкова лічылася, што Зыбайла ў 1941 годзе належаў да дывэрсійнага Першага штурмовага зьвязу. Ён сапраўды супрацоўнічаў з абвэрам, працаваў у беларускім камітэце ў Белай-Падляшскай. У Беларусь жа прыехаў з Польшчы летам ці восеньню 1941 году. У канцы 1941-га ён стаў кіраўніком акруговага камітэта Беларускай народнай самапомачы ў Слоніме. У 1942-м удзельнічаў у нарадах нелегальнай Беларускай незалежніцкай партыі ў Менску, друкаваўся ў "Бюлетэні БНП". Апублікаваныя дакумэнты сьведчаць, што Рыгор Зыбайла змагаўся з польскім уплывам у Слоніме, у сваіх справаздачах называў прозьвішчы ўдзельнікаў польскай кансьпірацыі.[2] Як піша ў сваіх успамінах С. Хмара, у 1942-м Р. Зыбайла, як агент абвера, быў вымушаны суправаджаць супрацоўнікаў Баранавіцкага СД, якія праводзілі арышты палякаў у горадзе.[3] Пазьней, калі ён пачаў пратэставаць супраць нямецкіх карных акцый, паленьня вёсак, яго адправілі на працу ў Дзярэчын. Летам 1943 г. Юрый Сабалеўскі забраў яго ў Менск на пасаду намесьніка старшыні Беларускай Самапомачы. З вясны 1944 году Зыбайла ў ранзе лейтэнанта камандаваў БКА ў Глыбокім. Летам-восеньню 1944-га быў афіцэрам "Дальвіца", пасьля ў складзе беларускай вайсковай адзінкі апынуўся на заходнім фронце, разам зь іншымі перайшоў да саюзьнікаў.

Юрый Грыбоўскі на падставе архіўных матэрыялаў даводзіць, што Рыгор Забайла сапраўды ўцёк зь нямецкага лягеру, быў затры-

маны савецкімі памежнікамі падчас пераходу мяжы, знаходзіўся ў турме ў Берасьці. Там у жніўні 1940-га яго завербавалі “з мэтай распрацоўкі асяроддзя беларускіх нацыяналістаў”, ён “дзейнічаў у якасці канфідэнта пад псеўданімам “Ёлкін”. Але не ўдакладняе, дзе Зыбайла дзейнічаў. Паводле Грыбоўскага, падчас нямецкай акупацыі ён “часова страціў сувязь з савецкімі службамі дзяржбясьпекі”. Яго арыштавалі 1 чэрвеня 1946 г. у Бэрліне. Асуджаны Рыгор Зыбайла быў ваенным трыбуналам МУС Гарадзенскай вобласьці 21 сакавіка 1947 году на 10 гадоў зьняволеньня.[4]

Што новага ўдалося дадаць да біяграфіі Рыгора Зыбайлы пасьля размовы зь яго сынам? Была ў яго вялікая сям’я, братоў і сясцёр каля дзясятка. Да вайны ён скончыў нейкую ”камерцыйную вучэльню”. Зыбайлу прызвалі ў польскае войска яшчэ да пачатку Другой сусьветнай вайны. У адным з баёў ён быў цяжка паранены асколкам у жывот. Распавядаў, што пашанцавала — кабура з пісталетам выратавала ад горшай раны. Нейкі хірург у тых жахлівых умовах зрабіў яму аперацыю. Зыбайла выжыў, але апынуўся ў нямецкім палоне. Быў ён таленавіты і здольны. Калі немцы пачалі набіраць у лягеры на працу на гадзіньнікавы завод, Рыгор Зыбайла запісаўся, хаця ў тых гадзіньніках не разьбіраўся. Але хутка навучыўся. Праца ж давала лепшае харчаваньне — хутчэй набіраўся сілаў, аднаўляў здароўе. А калі здарыўся зручны момант, разам зь іншымі, Зыбайла з працы ўцёк і падаўся на ўсход.

Яго затрымалі савецкія памежнікі. Сын кажа, што ад таго часу бацька працаваў на савецкую разьведку. Але пра той перыяд яго біяграфіі ён ведае вельмі мала. Таксама Юрый Рыгоравіч сьцьвярджае, што ў бацькі была сувязь з савецкай разьведкай ці з партызанамі падчас нямецкай акупацыі (ці не праз будучую жонку Еўдакію Казлову?). “Ён быў такі рызыкоўны — на нямецкім матацыкле езьдзіў па партызанскіх зонах. Не баяўся”, — кажа сын. А Казлова Рыгора прасіла, каб ён быў больш асьцярожны, але той толькі жартаваў на гэта.

Юрыю Рыгоравічу запомнілася, як бацька выказваўся пра Барыса Рагулю, казаў, што той “немцам задніцу лізаў”. Адмоўна характарызаваў дзеяча, зь якім разам быў і ў БНП, і ў “Дальвіцы”.

Фотаздымкаў Зыбайлы з часу нямецкай акупацыі няма. Сын кажа, што пасьля вайны бацька апынуўся ў Французскім замежным легіёне. Колькі там служыў, ня ведае. Паводле слоў Юрыя Рыгоравіча, бацька пра гэта толькі крыху гаварыў, калі выпіваў. У Афрыцы ён быў. Відаць, ваяваў. А як трапіў да саветаў, ня ведае.

Кажа, што бацька хацеў вярнуцца з Захаду на Радзіму.

Бацькі Рыгора Зыбайлы пасьля вайны выехалі ў Польшчу, узялі з сабой частку дзяцей, а некаторыя засталіся ў Беларусі. Высьветлілася, што Зыбайла і Казлова часта езьдзілі ў Польшчу, ім дазвалялі. Аднак пераехаць у ПНР бацька не хацеў, сьцьвярджае сын.

Рыгор Зыбайла і Еўдакія Казёл (відаць, Казловай яна стала падчас "першых саветаў") былі знаёмыя зь дзяцінства. У вайну яны сустрэліся ў Слоніме. Сябравалі, але да блізкіх адносінаў не дайшло. А неўзабаве лёс разлучыў іх на доўгія гады. Пасьля лягеру Зыбайла ў Сыбіры ажаніўся, прывёз жонку ў Беларусь. Але тут у яго не было ні хаты, нічога, і яна яго кінула, уцякла. Казлова



11 апреля 1957 г.

Справка

Дана тов. Зыбайло Григорию Борисовичу в том, что он действительно работает в Орджоникидзевском Сульфатном Заводе Красноярского края на должности зав. производством и находится в отпуску с 11-го апреля по 5 мая 1957 года.

Директор
Сульфатного Завода /Водозик/

СССР

МИНИСТЕРСТВО
ВНУТРЕННИХ ДЕЛ
Управление
Озерного лагеря
23 января 1955 г.

Форма «Б»

ВИДОМ НА ЖИТЕЛЬСТВО НЕ СЛУЖИТ,
ДЛЯ ПРОПИСКИ НЕ ДЕЙСТВИТЕЛЬНА.

3-ЗЛ

СПРАВКА № 517

Дана гр-ну Польши Зелбайло Григорию
(указать гражданство-подданство)
Борисовичу 1913 г., Косовского р-на Брестской обл. белорус.
(Фамилия, имя, отчество, год и место рождения, национальность)
в том, что он освобожден „23“ января 1955 г. из места заключения МВД и следует в гор. Красноярск - в распоряжение [illegible] на поселение
(республики, края, области)

Выдана для представления в отделение милиции по месту избранного жительства, где обязан получить установленный вид на жительство для гр-на Польши
(указать для иностранных граждан, подданных или лиц без гражданства)

При освобождении выданы документы не выдавались
(наименование их, кем, когда выданы, номера и сроков их действия)

Печать

Подписи:

Начальник Озерного Исправтрудлагеря (ИТК, тюрьмы)
(Звотинцев)

Начальник 2 отдела
(участного аппарата)
(Цвалев)

адразу па вайне выйшла замуж за савецкага афіцэра, дзяцей у іх не было, праз нейкі час яны разьвяліся. У другой палове 1950-х Рыгор і Еўдакія сустрэліся, стварылі сям'ю, нарадзіўся сын. Яна працавала настаўніцай беларускай мовы, гаварыла па-беларуску, ён размаўляў пераважна па-руску.

Зыбайла ў лягеры стаў добрым спецыялістам у будаўніцтве. Працаваў у будаўнічай галіне і пасьля вяртаньня ў Беларусь. Быў "прабіўны", меў сувязі, умеў дамаўляцца з людзьмі з міністэрстваў, часта езьдзіў у камандзіроўкі, у тым ліку і ў Расею. Сын кажа, што бацьку цікавіла выключна яго прафесійная справа — будаўніцтва, любіў чарцяжы рабіць. А яшчэ рамантаваў гадзіньнікі.

Гартаючы запісную кніжку Зыбайлы і Казловай, заўважыў толькі некалькі асобаў, якія падчас нямецкай акупацыі ўдзельнічалі ў беларускім нацыянальным руху. Атрымліваецца, што з былымі сябрамі БНП, якія жылі ў Беларусі, Літве, Расіі, ён сувязяў не падтрымліваў.

**Сяргей Ёрш**

*[1] Ёрш С. Рыгор Зыбайла не загінуў у Францыі, а прайшоў савецкія канцлягеры // Голас камбатанта (Слонім), 2000, № 3, жнівень.*

*[2] Грыбоўскі Ю. Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе "Беларусь" (1941-1944 гг.) // Беларускі гістарычны зборнік, № 25. Беласток, 2006, б. 157-162.*

*[3] Хмара С. Пад гітляроўцамі // Беларускі голас, 1969, 23 верасьня.*

*[4] Беларускі гістарычны зборнік, № 25. Беласток, 2006, б. 129.*

*Рыгор Зыбайла са сваякамі ў Польшчы. 1960-я гады.*

МВД СССР

УМВД по Красноярскому краю

УДОСТОВЕРЕНИЕ №

Зыбайло

Григорий Борисович

1913 года

районе, Красноярского края.

*Рыгор Зыбайла з бацькамі ў Польшчы. 1960-я гады.*

*На рыбалцы.*




*Здымкі з архіву сям'і Зыбайлаў.*

## У Брэсцкай вобласьці пасьля Другой сусьветнай вайны дзейнічала больш за 20 “беларускіх нацыяналістычных фармаваньняў”

На тэрыторыі Брэсцкай вобласьці ў пасьляваенны час дзейнічала “больш за 20 беларускіх нацыяналістычных фармаваньняў, якія таксама [як і ўкраінскія] кіраваліся з-за мяжы”. Гэта цытата з артыкула ў брэсцкай дзяржаўнай газэце “Заря над Бугом”* пра кнігу ветэрана КГБ (служыў у вайсковай контрвыведцы) Аляксея Крывашэіна “Контрразведчыкі. Лёсы ў полымі вайны”.** Як можна меркаваць, гаворка ідзе пра цяперашнюю Брэсцкую вобласьць. У паваенны час — гэта Брэсцкая, Пінская і часткова Баранавіцкая вобласьці. Згадка пра тое, што гэтыя фармаваньні мелі сувязь з замежжам, важная. Яна сьведчыць пра тое, што маюцца на ўвазе не стыхійныя атрады “лясных братоў”, якія складаліся з мясцовых жыхароў і часта не выяўлялі нацыянальнага аблічча, а атрады, якія мелі за мэту змаганьне за незалежную Беларусь.

**СЁ**

**Протасевич Р. Судьбы в пламени войны // Заря над Бугом, 2013, 8 лістапада; http://www.zara-bug.by/?p=8986*
***Кривошеин А. Контрразведчики: судьбы в пламени войны. — Брест, 2006.*

## Статыстыка антыпартызанскай барацьбы ў былой Пінскай вобласьці ў першыя пасьляваенныя гады

У справаздачы Пінскага абкаму кампартыі ад 16 красавіка 1949 году* ўтрымліваюцца статыстычныя дадзеныя пра антыпартызанскую барацьбу за пяць пасьляваенных гадоў. Адзначаецца, што з 1945 году (менавіта з гэтага году, а не з 1944-га) органы МГБ пры дапамозе міліцыі ліквідавалі 161 “узброеную банду”. Падчас гэтых апэрацыяў было забіта 475 “бандытаў”, 826 трапілі ў палон. Атрымліваецца, што альбо атрады “лясных братоў” былі малалікія (у сярэднім, каля 8 чалавек у кожным), альбо значная частка іх удзельнікаў заставалася на волі. Неясна,

ці ўлічаныя ў згаданай статыстыцы крымінальныя банды.

Колькасьць забранай зброі і боепрыпасаў не называецца, у дакумэнце напісана толькі пра іх “вялікую колькасьць”. На тэрыторыі вобласьці ў акрэсьлены пэрыяд ліквідавалі больш за паўсотні “антысавецкіх нацыяналістычных арганізацый і групаў”. Паведамляецца, што да вясны 1949-га было затрымана 19 120 чалавек — “шпіёнаў”, “здраднікаў Радзімы”, “дэзерціраў Савецкай Арміі” і “іншых антысавецкіх элементаў”.

У 1948 годзе ў Пінскай вобласьці было зьдзейсьнена 94 напады “бандыцкіх” і “кулацка-нацыяналістычных элементаў”. Загінулі 23 савецкіх, партыйных актывіста ды “найбольш актыўных грамадзян”. Вясной 1949-га ў вобласьці было неспакойна, працягвалі дзейнічаць “кулацка-нацыяналістычныя элементы”. Па-ранейшаму зьдзяйсьняліся тэракты (маецца на ўвазе забойства партыйных і савецкіх актывістаў).

“Барацьба з узброенымі бандамі абцяжарваецца тым, што Пінская вобласьць засьмечана кулацка-нацыяналістычным і іншым антысавецкім элементам, — чытаем у справаздачы Пінскага абкаму. — У вобласьці маецца больш за 600 кулацкіх гаспадарак, каля 2000 сем’яў, сваякі якіх рэпрэсаваныя ворганамі МГБ, да 400 чалавек нямецкіх стаўленікаў, каля 260 чалавек украінскіх і беларускіх нацыяналістаў, 600 сем’яў сваякоў бандытаў”.

**Васіль Сушко**

**НАРБ, ф. 4, в. 62, спр.16, арк. 30, 31.*

# Каля Ліды быў выяўлены і зьнішчаны “цэнтар дывэрсійных групаў”

Ва ўспамінах ветэранаў вайны часам сустракаюцца сэнсацыйныя дадзеныя, згадкі пра падзеі, пра якія мы нічога ня ведаем. Магчыма, з-за таго, што пэўныя дакумэнты дагэтуль засакрэчаныя.

Выпадкова знайшоў у інтэрнэце публікацыю пра ветэрана з Сургута (Расея) Фёдара Паклонава, які да 1949 году ўдзельнічаў у баях супраць “лясных братоў”, у тым ліку і беларускіх. У 1944-1945 гадах ён дакладна знаходзіўся ў Беларусі, на тэрыторыі тагачасных Гарадзенскай і Берасьцейскай абласьцей. Тое, што Паклонаў распавёў, заінтрыгавала. Пашукаў

іншыя публікацыі пра яго, знайшлося нават кароткае відэа. Падаю інфармацыю, ня ўлічваючы храналогію яе зьяўленьня.

Фёдар Паклонаў паходзіць з Алтайскага краю Расеі. З 1942-га, калі яму споўнілася 18 гадоў, хлопец служыў у войсках НКВД (МВД), спецыялізаваўся на ахове важных аб'ектаў, прайшоў спецыяльную падрыхтоўку. Ветэран успамінае, што іх падразьдзяленьне ішло на захад за фронтам і брала пад ахову розныя аб'екты (масты, вадакачкі), якія "часта спрабавалі падарваць банды дыверсантаў". У адной з публікацый адзначаецца, што "ў Беларусі салдат Паклонаў удзельнічаў у захопе цэнтру кіраваньня дывэрсійных групаў".* Здарылася гэта ці ў другой палове 1944-га, ці ў першыя месяцы 1945 году.

У наступных публікацыях пачынаюць зьяўляцца новыя дэталі пра тое здарэньне. У адным выпадку паведамляецца, што Фёдар Паклонаў у Беларусі ўдзельнічаў "у захопе цэнтру кіраваньня дывэрсійных групаў". Далей ідуць успаміны ветэрана: "Зямлянкі там і былі пабудаваныя як дамы, вялікія пакоі, калідоры, сьвятло. Але калі нашыя салдаты акружылі бандытаў, нягледзячы на вялікую колькасьць кулямётаў і аўтаматаў, яны памарудзілі і ім давялося здацца. Мы вывезьлі з зямлянак цэлы грузавік зброі".**

І што вам гэта нагадвае? Вялікі бункер, пабудаваны нямецкімі спецслужбамі, забясьпечаны электрычнасьцю, запасамі зброі. Шкада, што ўспамінае шэраговец, а не афіцэр, які мог бы ведаць больш пра аб'ект і тых, хто на ім знаходзіўся.

Яшчэ адна публікацыя мае відэа з гутаркай з Фёдарам Паклонавым. Ён распавядае: "Вось так цяпер у Чачэніі, вось мы зь імі змагаліся. У Лідзе было фармаваньне, зямлянкі былі, тым арганізоўвалі. Ведаеш, якія зямлянкі — там сьвятло было, там усё было. Прыйшлі мы, акружылі іх, а ў іх кулямёты, аўтаматы, усё было ў іх, усё на сьвеце".***

І яшчэ адзін штрышок. Валянціна Быкава з савету ветэранаў міліцыі ў Сургуце пісала: "Падчас вайны Фёдар Паклонаў служыў на асабліва небясьпечных аб'ектах стралком у горадзе Гродна ў Беларусі. У траўні сорак пятага прыйшла доўгачаканая перамога. Фёдара Карнеевіча яна засьпела ўжо ў Берасьцейскай вобласьці".**** Атрымліваецца, што на аперацыю пад Ліду выязджала падразьдзяленьне НКВД з Гродна (цікава, што яно пасьля рабіла аж на Берасьцейшчыне, шукалі іншыя бункеры?). Трэба пашукаць яе сьляды. Магчыма, нешта яшчэ трапіла ў адкрытыя крыніцы.

**Мікалай Шыбіцкі**

**Пресс-служба УМВД России по г. Сургуту. Полицейские Сургута поздравили ветеранов Великой Отечественной войны с наступающим праздником // 2015, 8 траўня; https://86.мвд.рф/news/pravkporadok_ugri/item/3444095/*

***Горбунова Т., пресс-служба УМВД России по г. Сургуту. С праздником Вас победители! // 2012, 10 траўня.*

****Парий О. С праздником Победы поздравили ветеранов МВД // 2012, 9 траўня; http://sitv.ru/arhiv/news/social/44164/*

*****Быкова В. Внимание, понимание и любовь — вот секрет семейного долголетия // 2011, 13 ліпеня; http://admsurgut.ru/article/21001/77680/-Vnimanie-ponimanie-i-lyubov---vot-sekret-semeynogo-dolgoletiya*

# Знойдзены архіў партызанскага камандзіра Івана Раманчука

У кастрычніку 2016-га краязнаўца з Барысава Андрэй Цісецкі нарэшце агучыў інфармацыю пра знойдзены раней архіў беларускага партызанскага камандзіра Івана Раманчука (1920 — 1987, падпольная мянушка “Ястраб”). Паводле яго слоў, калісьці рабочыя разьбіралі драўляны дом, у якім да сваёй сьмерці жыў Раманчук, і знайшлі на гарышчы скрыню з паперамі. Вельмі часта ў такіх сытуацыях архівы зьнішчаюцца (калі не трапляюць у рукі “сілавікоў”), а тут знайшоўся чалавек, які зразумеў каштоўнасьць дакумэнтаў ды захаваў іх. А пасьля пра гэты архіў даведаўся Цісецкі і здолеў яго здабыць.

Што ж за паперы цудам захаваліся? Гэта разнастайныя дакумэнты Івана Раманчука, а пераважна яго ліставаньне — з блізкімі людзьмі, з прыватнымі асобамі, у тым ліку з такімі вядомымі, як Мікола Ермаловіч, Уладзімер Караткевіч, з дзяржаўнымі ўстановамі. Лісты адносяцца і да таго часу, калі Раманчук знаходзіўся ў зьняволеньні, і да таго, калі ён ужо выйшаў на волю. Яны пацьвярджаюць нашую версію, што Караткевіч зьбіраўся пісаць раман менавіта пра Івана Раманчука, зь якім быў знаёмы.*

Раманчук быў паранены ў баю ў траўні 1949 году і ўзяты ў палон. Паколькі ў той час у СССР было адмененае сьмяротнае пакараньне, ён ня быў расстраляны, атрымаў 25 гадоў зьняволеньня. Знойдзены архіў дае шмат інфармацыі пра яго асобу. Ён ня быў толькі “чалавекам вайны”, гэта быў мысьляр, інтэлектуал. Раманчук быў за калючым дротам, а ў пачатку 1960-х прапанаваў уладам БССР усталяваць у Менску помнік Кастусю Каліноўскаму і вёў у






гэтай справе перапіску. Ён цікавіўся гісторыяй Беларусі, меў свой погляд на яе, палемізаваў з дасьледчыкамі, з пісьменьнікамі.

Спадзяемся, што ў бліжэйшыя гады архіў Івана Раманчука будзе апублікаваны. Наступным крокам у дасьледаваньні жыцьця і дзейнасьці гэтага вялікага беларускага патрыёта мусіць стаць адкрыцьцё доступу да яго крымінальнай справы.

**СЁ**

**Гл. наступную публікацыю: Ёрш С. Іван Раманчук — беларускі партызанскі камандзір і кіраўнік “Саюзу змаганьня за незалежнасьць Беларусі” // Беларускі Рэзыстанс, 2011, № 1(10), б. 3-32.*

# Камандзір атрада УПА Яўген Штэндэра і яго сьведчаньні пра беларускі Супраціў

Сярод тых нямногіх камандзіраў УПА, якія пакінулі сьведчаньні пра беларускі Супраціў і кантакты зь ім, варта згадаць Яўгена Штэндэру (1924 г. н.). Ён быў у шэрагах украінскіх паўстанцаў з 1943 году, паказаў сябе здольным камандзірам, дзейнічаў на тэрыторыі ПНР (Холмшчына), камандаваў 28-м тактычным адрэзкам УПА “Данілів”. Вясной 1946-га пад яго камандаваньнем украінскія атрады, сумесна з польскімі паўстанцамі з арганізацыі “Воля і незалежнасьць”, зьдзейсьнілі пасьпяховы напад на Грубяшоў. У 1947 годзе пад псеўданімам “Прірва” ён быў камандзірам атрада

УПА, які зьдзейсьніў рэйд ва Ўсходнія Прусы. У 1948 годзе Штэндэра здолеў перайсьці праз Польшчу на Захад, жыў у Заходняй Нямеччыне, а пасьля пераехаў у Канаду. Працаваў бібліятэкарам, рэдагаваў украінскія газэты і часопісы, з 1975 году быў галоўным рэдактарам кніжнай серыі "Літопис УПА".

У гэтым паведамленьні мы разгледзім два яго сьведчаньні пра беларускіх партызанаў і падпольшчыкаў, якія ён пакінуў яшчэ ў канцы 1940-х гадоў. У пачатку 1949-га Я. Штэндэра даў кароткае інтэрвію беларускай эміграцыйнай газэце "Бацькаўшчына".* Яно было ананімным. Адзначалася толькі, што камандзір УПА "нядаўна прыбыў у Нямеччыну з бацькаўшчыны разам з групай украінскіх паўстанцаў, а цяпер знаходзіцца ў Мюнхэне".

Спачатку ў Штэндэры спыталіся, ці мае ён дакладныя дадзеныя пра Беларусь і зь якога часу? "Першыя дакладныя дадзеныя я маю з 1945-1946 г., — адказвае камандзір. — Тады я хадзіў з адным з нашых аддзелаў УПА-Поўнач у БССР у ваколіцы Пінск-Баранавічы".

"Ці Вы спатыкаліся зь беларускімі партызанскімі аддзеламі, ці толькі зь беларускім насельніцтвам і як яно да Вас адносілася?", — пацікавіўся журналіст. Яўген Штэндэра адказвае: "У часе нашага паходу мы некалькі разоў спаткаліся зь беларускімі партызанамі. Супольна зь некаторымі зь іх правялі баі з энкавудзістымі, якія закончыліся нашай перамогай. Беларускія партызаны біліся вельмі заўзята й мужна. Праўда, гэта былі нявялічкія групы, але ад іх мы чулі, што ў Беларусі ёсьць і большыя партызанскія аддзелы. Напатканыя намі групы вялі прапагандыўна-баёвую дзейнасьць.

Беларускае насельніцтва адносілася да нас вельмі прыхільна. Яно вельмі цікавілася нашым змаганьнем, пыталася нас, калі мы ўжо канчаткова зьнішчым бальшавікоў, давала нам ахвотна ўсякія інфармацыі й наагул памагала, чым магло".

Найбольш цікавым быў адказ украінца на пытаньне пра тое,

што ён ведае пра прымусовае высяленьне беларусаў з ПНР. “Зь беларускіх земляў, прылучаных да Польшчы, беларускае насельніцтва было пераселенае яшчэ ўзімку 1945-46 г., — распавядае Яўген Штэндэра. — Перасельвалі ў першую чаргу нацыянальна сьведамых, каб іх пазьней лягчэй было зьліквідаваць. Праўда, частка нацыянальна сьведамых беларусаў яшчэ асталася дома. Некаторыя зь іх самі пераяжджалі ў Польшчу, каб ратавацца перад бальшавіцкім тэрорам. Гэта датычыць пераважна тэрыторыі Беласточчыны, дзе я сам некалькі разоў быў, калі мы хадзілі ў Усходнюю Прусію цераз Ломжу. Старэйшыя сяляне гаварылі з намі выключна пабеларуску, тады як маладыя стараліся гаварыць папольску. Магчыма, гэта было дзеля таго, што мы спачатку заўсёды выступалі, як польскія партызаны.

У 1947 г. мы мелі сувязь зь беларускім вызвольным рухам цераз аднаго сьвятара ў усходняй частцы Беласточчыны. Нашая разьведка паведаміла нас, што беларускія партызаны ўжо тады перайшлі адсюль у БССР. Мы атрымалі тады некалькі адозваў беларускага вызвольнага руху да насельніцтва, каб яно не пакідала родных земляў, пры гэтым выясьнялася правакацыя бальшавікоў. Іншыя былі зваротам да ахвіцэраў і жаўнераў варожых фармацыяў. Некалькі невялікіх беларускіх партызанскіх групаў яшчэ рэйдавалі ў Белавескай пушчы. Яны рабілі напады на бальшавіцкіх актывістых”.

Апошняе пытаньне карэспандэнта “Бацькаўшчыны” датычыла жыцьця беларусаў ва Ўсходніх Прусах. Яўген Штэндэра (“Прірва”) адказаў так:

“Беларускае насельніцтва жыве тут пераважна асобнымі групамі, творачы асобныя вёскі, радзей у калёніях па некалькі сем’яў. Беларусы жывуць тут сваім нацыянальным жыцьцём,

БАЦЬКАЎШЧЫНА

НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ
Гутарка з Камандзірам УПА

гавораць выключна пабеларуску, сьпяваюць свае родныя песьні, утрымоўваюць свае традыцыі й звычаі. Такія вёскі раскінутыя ўздоўж польска-савецкай граніцы й сягаюць аж да Кэнігзбэргу. Я праходзіў тут каля мястэчка Скандава, на захад ад станцыі Корш і на поўнач ад Аленштайну, Бартошыцаў, Лімбарку й Бранева. Я асабіста начаваў у некаторых беларускіх сялян. Адзін зь іх, даведаўшыся, што я зьяўляюся ўкраінскім партызанам, расказваў мне шмат аб беларускім вызвольным руху, у якім ён прыймаў таксама выдатны ўдзел у 1917-18 г., аб Беларускай Народнай Рэспубліцы й аб змаганьні беларусаў за сваю незалежнасьць у апошнія часы. Ён быў пераканаланы, што хутка вернецца на вольную бацькаўшчыну. Ён верыў таксама й у тое, што ягоная родная Сакольшчына будзе належыць да Беларусі. Аб дзейнасьці беларускіх партызанаў ён быў даволі добра паінфармаваны.

Аб дзейнасьці беларускага вызвольнага руху шмат пісалася яшчэ ў 1946 г. у бальшавіцкай прэсе Беласточчыны. Побач з паведамленьнямі аб баёх органаў бясьпекі зь беларускімі партызанамі, бальшавіцкая прэса заўсёды называла іх фашыстымі, гітлераўскімі недабіткамі й іншымі падобнымі, добра ведамымі, бальшавіцкімі тэрмінамі".

Такім чынам, маем сьведчаньні камандзіра атрада УПА пра беларускіх партызанаў у рэгіёне паміж Пінскам і Баранавічамі ў 1945-1946 гг, а таксама ў Белавежскай пушчы ў 1947 годзе. Таксама ён згадвае ўлёткі, якія беларускія партызаны распаўсюджвалі на Беласточчыне.

Нам удалося выявіць артыкул "Прірвы" на тую ж тэму, які зьявіўся ў 1949 годзе ва ўкраінскім эміграцыйным выданьні "Визвольний шлях".** Цікава параўнаць гэтыя тэксты. Высьвятляецца, што ў другой публікацыі зьяўляюцца новыя, вельмі каштоўныя дэталі, якія не былі згаданыя ў першай.

Штэндэра пісаў:

"На беларускіх землях я быў у рэйдзе 1947 г. на захад ад горада Беластоку /цяперашняя Польшча/. Было гэта ў той час, калі беларускае насельніцтва высялялі бальшавікі ў СССР. Высяленьне было прымусовым. У 1947 г. была на гэтых землях толькі невялікая частка беларусаў, якая, каб застацца на родных землях, называла сябе палякамі. Таксама з беларускім насельніцтвам я сустракаўся ва Ўсходніх Прусах у ваколіцах Кенігсбэргу /Крулевец/. Яно прыехала ва Ўсходнія Прусы таму, каб не ехаць у СССР у калгасную паншчыну, верачы, што ў Польшчы яшчэ нейкі час можна будзе жыць больш свабодна і пазьбегнуць матэрыяльнай

нястачы. Насельніцтва верыць, што хутка вернецца на свае родныя землі, што будзе вайна, у якой беларускі народ здабудзе сабе самастойнасьць.

Ад беларускіх сялян я даведаўся, што падчас высяленьня беларусаў з усходняй часткі Беластоцкага ваяводзтва дзейнічалі там іхнія супрацьбальшавіцкія аддзелы і баёўка. Тады былі раскіданыя ўлёткі супраць высяленьня і беларускае падпольле зьдзейсьніла некалькі ўдалых замахаў на афіцэраў НКВД, якія займаліся высяленьнем /зіма 1944-45 г./. Пра дзейнасьць беларускага вызвольнага руху ў цяперашняй Польшчы я не раз чытаў у польскіх камуністычных газэтах 1945 г. Там звычайна былі весткі пра баі польскіх органаў УБ з беларускімі паўстанцамі. Бальшавіцкая прэса ім таксама закідала, што яны зьяўляюцца супрацоўнікамі Гітлера.

1946 г. На загад камандаваньня УПА-Захад з нашага адрэзку выслана сувязных да беларускага вызвольнага руху ў Польшчы. Адна наша разьведчыца мела знаёмага беларускага [праваслаўнага] сьвятара ва ўсходняй частцы Беластоцкага ваяводзтва, які пасьля высяленьня застаўся ў Польшчы. Гэты сьвятар заявіў, што беларускія паўстанцы адыйшлі позьняй восеньню 1945 г. у беларускія землі ў СССР. Ён перадаў нашай разьведчыцы дзьве ўлёткі, выдадзеныя беларускім вызвольным рухам [у] 1945 г. Заявіў, што мае весткі, што ў ваколіцах Белавежскай пушчы цяпер рэйдуе іх аддзел, але нам зь ім

зьвязацца не ўдалося.

У 1946 г. былі рэйды за лінію Керзона аддзелаў са злучэньняў УПА-Поўнач і я гаварыў з камандзірамі і стральцамі гэтых аддзелаў. Між іншым яны таксама расказвалі пра свой рэйд у 1945 г. на беларускія землі ў СССР у ваколіцы Пінск — Баранавічы. Яны расказвалі пра свае сустрэчы з беларускімі паўстанцкімі аддзеламі і пра адносіны да іх беларускага насельніцтва. Беларускае насельніцтва да аддзелаў УПА адносілася вельмі прыхільна. Цікавілася нашай барацьбой і расказвала пра сваю барацьбу з бальшавізмам. Аддзелы УПА мелі таксама сумесна з беларускімі аддзеламі баі з НКВД. На жаль, я пры рэйдуючых аддзелах са злучэньняў УПА-Поўнач быў толькі некалькі гадзінаў і мае веды пра той рэйд вельмі абмежаваныя.

У аддзеле УПА, якім я камандаваў у 1945 г. і 1946 г., было адно аддзяленьне /10 чалавек/, складзенае з прадстаўнікоў паняволеных СССР народаў. Было між імі чатыры беларусы. Гэтае аддзяленьне хадзіла ў савецкіх уніформах і яго выкарыстоўвалі ў спецыяльных баявых акцыях, паколькі стральцы вельмі добра гаварылі па-руску і маглі дзейнічаць пад выглядам энкавудыстаў. Яны, пад выглядам НКВД, рабілі налёты на польска-бальшавіцкія групы, месцы пастою ды і на саміх энкавудыстаў. Яны звычайна пад выглядам групы НКВД крычалі: “Вы — бандэраўцы, здавай зброю!”. І пакуль вораг апамятаўся, ён ужо быў абяззброены. Гэтая група мела легендарную славу”.

Далей Я. Штэндэра прыгадвае некалькі эпізодаў з дзейнасьці гэтай групы. Высьвятляецца, што камандзірам аддзяленьня быў Дуброва.

Такім чынам другая публікацыя дае шмат новых фактаў. На жаль, невядома, што за беларускі партызанскі аддзел дзейнічаў на Беласточчыне і ў канцы 1945-га перайшоў у БССР.

**Андрэй Адамчык**

**Курыловіч У. На роднай зямлі. Гутарка з Камандзірам УПА // Бацькаўшчына (Мюнхэн), 1949, № 7(51), 9 сакавіка.*



# БЕЛАРУСКІ ЧАСОПІС “ВАЙСКОВЫ”, 1921 ГОД. ПЕРАДРУК

***“БР” працягвае перадрук беларускага часопіса “Wajskowy” (“Вайсковы”), які ў 1921 годзе выдаваўся ў Коўне. Раней на бачынах нашага выданьня былі зьмешчаныя пяць нумароў (2013, № 1(14), б. 50-91; 2014, № 1(15), б. 25-39; 2015, № 1(16), б. 28-46), якія захоўваюцца ў Літоўскай нацыянальнай бібліятэцы ў Вільні. У гэтай кніжцы мы перадрукоўваем 6-ы нумар “Вайсковага”.***

ВАЙСКОВЫ

# ВАЙСКОВЫ

Двутыднёвік для беларусаў-ваякаў Літвы.

Выданьне вайск[ова]-навук[овага] аддзелу Міністэрства абароны Краю.

№ 6. Коўна, 1921 г. ліпеня/liepos 31 д[ня].

Кошт 3 ауксін.

# Беларуская вайсковая літэратура

У кнігапісі 3 н[умар]а “Wajskowaha” мы пералічылі усе выданыя на беларускай мове вайсковыя рэгуляміны і падручнікі. Пакуль што іх ня шмат: — толькі сем. Спробуем хоць укароткасьці пазнаёміць чытачоў з імі.

Усе сем кніг выданы БВК*, зложанай у восень 1919 году у Городні, і потым паступова перанасімай у Вільню, Менск, Ліду і, нарэшце, — у Лодзь. Склад камісіі з пачатку яе істнаваньня быў такі: поўкоўнікі Канапацкі і Якубоўскі, шт[абс]-капітаны Кушэль і Якубоўскі, п. п. Рак-Міхайлоўскі, Аўсянік, Мурашка, Прушынскі (Алесь Гарун)+ і Аляксюк.

У сшытку “ПАДАРУНАК БЕЛАРУСКАМУ ЖАЎНЕРУ” (Менск, 1919) БВК зварачваецца да беларускага народу і прыгукае грамадзянства йсьці на службу да беларускіх часткаў. “Лепшыя дні пачаліся”, — пішэць БВК. — “наш прыяцель Язэп Пілсудзкі даў згоду прэдстаўнікам тваім, каторыя ад імя твайго працуюць на агульную карысьць, — згоду на фармаваньне беларускага войска”.

Паказаны парадак, як мусіла фармавацца войска. Камплектаваньне ахвіцэрамі вядзецца ось як: пры паступленьні яны залічаюцца да запасу** і толькі праслухаўшы паўтарыцельныя ахвіцэрскія курсы і курсы беларусазнаўства і мовы, назначаюцца ў часьці. Маладыя людзі пасылаюцца да школы падхарунжых у Варшаву, дзе закладаецца беларуская кляса (пасьля была адчынена беларуская вайсковая школа ў Лодзі).

Аб супольнай працы з палякамі характэрнай зьяўляецца заява п. Аляксюка: “Мы будзем працаваць побач з польскай уладай вайсковай і цівільнай і трэба зусім шчыра сказаць, што нашая шырокая работа магчыма толькі пры шчырасьці і прыхільнасьці да яе гэтай улады. Я цьвёрда веру, што гэта будзе так, што шчырае жаданьне Я. Пілсудзкага будзе праводзіцца на мясцох. Мы не заплюшчываем вачэй на тую сільную оппозіцыю, якую спаткаем у колах “тоже-белоруссовъ”, якія будуць варочаць тэрмінамі “польская интрига”, “польская армия”... Адылі, з далейшага ўбачым, што пажаданьні гэтак і асталіся пажаданьнямі... Не кахайцесь...”.

У “ПАДАРУНКУ” звыш гэтага зьмешчаны цікавыя “10 прыказаньняў для беларускага жаўнера” З. Бядулі***, “Слова праўды аб мове і долі беларуса” — А. Зязюлі (кароткая гісторыя вершам), дзьве жаўнерскія песьні і інш.

Захопліваючымі ёсьць яго лёзунгі: яны пранікаюць да душы кожнага беларуса — “Мы доўга цярпелі-цярпець больш ня можам!”, “І

ты, што жыці рвешся — беларусам завешся!”, “Няхай жыве ПАГОНЯ на браме Незалежнай Беларусі!”, “За Бацькаўшчыну гэй наперад!”, “Няхай жыве незалежная, непадзельная і вольная Беларусь!”, “Стварайце беларускае войска — для гэтай ідэі варта жыць!”...

Звярнемося цяпер да рэгулямінаў і падручнікаў. Трэба сказаць, што усе яны перакладзены з польскай мовы (палякі у сваю чаргу тлумачылі альбо апрацовывалі з нямецкіх кшталтаў).

“ВАЙСКОВАЯ СТЫЛІСТЫКА” (Менск, 1920) — кніжка вельмі цікавая, з яе можна даканацца, што вынайдаваньні п. п. паперапэцкуноў-канцэлістаў знайшлі у абшары пісьмаводства і дзелаводства шырокі ужытак. Пэўна, перапіска вядзецца падчас вайны у полі на палявых кніжках, бяз пераховы рэгуляміну мірнага часу, але за тое, гэты апошні запраўды велькапышны, свайго роду, “мэтрычная сістэма” з акуратнымі дробязнымі паказаньнямі на сколькі сантімэтраў ці мілімэтраў адступіць ў паперы ад верхняга яе берагу, ад бланку і г. д. У формах папераў у дастатку узораў дэклінацыі слова “пан” ва ўсіх склонах, са ўсімі дадаткамі пачлівасьці і ветлівасьці, як “Ягомосьці”, “Высакашаноўны”, “Ваш падуладны і паслушны слуга” і г. д. Урэшце, частае ўжываньне слова “пан” гэтак жа звычайна сярод беларусаў, як сярод літоўцаў “Tamsta”. У кніжцы ёсьць досьць збытачных палёнізмаў, іншыя кніжкі ў гэтым сэнсі ёсьць больш звальнёнымі з пад гэтага заходнага ўплыву.

Добра перакладзены статут “ПЯХОТА” (Менск, 1920).

**Беларуская Вайсковая Камісія.*
***Atsargz — рэзерв.*
****Надрукаваны ў “Варце Бацькаўшчыны” 1920 г.*

Для прыкладу падаём тры уступныя артыкулы з яго:

“Вайна вымагае жалезнай пакорнасьці і натугі усіх сіл. Бой патрабуе разважных, прызвычаенных да самачыннасьці камандзераў і самастойных стральцоў.

На вайне удаюцца толькі простыя рэчы, дзеля гэтага шмат залежыць ад усваеньня і умеласьці стасаваньня простых формаў. Ніякае мудрагэльства не дапушчаецца. Установленыя формы павінны быць усвоены грунтоўна. Дзеля ўмацаваньня пакорнасьці трэба найбольшай акуратнасьці пры стасаваньні формаў.

Доўгае заняцьце адным прадметам змагае мысьлі і цела. Раецца заняцьці рабіць больш разнароднымі. Час і спосаб заняцьцяў трэба дапасоўваць да ступеннага разьвіцьця сілаў жаўнера, бо лішняя

змора вызывае брак увагі, дрэнна адбіваючыся на пакорнасьці”.



Гэтакія ж вылячэньні друкуюцца з “ВОСЕМТЫДНЁВАЙ ПРАГРАМЫ ВЫШКАЛЕНЬНЯ РЭКРУТА ПЯХОТЫ” (Лодзь, 1921). Вельмі паўчыцельна увядзеньне абавязковага вывучываньня гісторыі Бацькаўшчыны.

Замыкаючы наш кароткі агляд заўважым, што агульна кнігі выданы прыгожа.

Хайныя вокладкі з беларускай Пагоняй, прызвуітая па цяперашнім, дрэнным дзеля кнігавыдавецтва часам папэра, малая колькасьць друкарскіх абмылкаў складаюць іх вартасьць звонку.

Нутраная вартасьць выданьняў БВК вялікая: 1) Беларуская мова ўзбагацілася радом новых слоў, у большасьці удатных і маючых поўнае права увайсьці у народную мову, 2) ворагам беларусшчыны бліскуча даведзена, што дзеля беларусаў суздром неабавязкова вучыцца ці на польскім, ці на маскоўскім статутам, 3) нарэшце, заложаны моцны падмурак у справу стварэньня беларускае вайсковае літэратуры.

І за ўсё гэта беларусы усіх часьцей разарванай мацнейшымі суседзямі БЕЛАРУСІ заўжды будуць удзячны БВК.

Дзеля нас гэтыя кніжкі ёсьць важнымі, бо могуць быць выкарыстаннымі дзеля беларускіх вайсковых часткаў арміі.

Запраўды, аграмадны працэнт ахвіцэраў і жаўнераў, ня валадаючы дзяржаўнай мовай, вучацца па прыпадкова раздабываемым маскоўскім статутам. Пэўне, з 1919 году рабіліся і у нас спробы перакладу, хоць самага [нечытэльна] патрэбнага на родную мову і нешта у гэтым кірунку зроблена, але гэтага мала. Толькі выкарыстаньне статутаў, выданных БВК (адмены ужытачна ад статутаў нашага войска вытварыць лягко) паставіць навучаньне беларускага жаўнера на пэўны, трывалы грунт, дасьць

магчымасьць ужываць родную мову ня толькі як “сялянскую хамскую гутарку”, але і як службовую, камандную мову.

Кошт усіх выданьняў БВК вельмі танныя.

**Ал[яксандар] Ружанцаў**

# Сусьветная вайна у беларускай краснай пісьменнасьці

(гл. №№ 4 і 5)

Распачаўшаяся сусьветная завіруха выцягнула з родных хат мільёны людзей, змусіла прыняць учасьць у біцьве і, быць можа, загінуць на векі.

Паэта Ясакар у вершы “Волат”* стараецца адбіць псыхічны настрой гэтага мамэнту як усяго народу, перажываючага самы факт вайны толькі як сьведка, так і тых учасьнікаў гэтага факту — “юнакаў”, нясучых сваё маладое жыцьцё на аўтар вайны.

**Волат — асілак — Didvyris — Bohatyr.*

“Сьмерць... Бура... Трывога...
Ня йдзі, ой, ня йдзі ты, асілак, юнача!
Ляжыць прад табою страшная дарога;
Пагінеш, пагінеш... нейнача!
Чырвоныя коні пад небам нясуцца,
Пярун і грымоты вакруг раздаюцца,
І страх і атрута ўвесь сьвет абляглі...
І нішчыцца ўсё па зямлі...
І кроў... І руіны...
Ой, горкая будзе, дзяцюк, твая доля!
Сьмерць зрэжаць касою, бы кветку-расьліну,
Груган зьнясець косьці па полю...
Пайду! Я жадаю п’янець, загарэцца!
Ўсім сьветам магу кіраваць я, здаецца,
І пушчанай Богам імпэтнай стралой
Памчуся ўгару над зямлёй..
Мне полымя! Сілу!
Люблю я лунаць, бы арол, па абшары...

Віхор нясець гібель, капаець магілу...
І цемрай ахоплены хмары...
І пруцца, і рвуцца, і пеняцца хвалі,
І плачуць, і скачуць. — О, волю ім далі!
А мора шалёнае — брацейка мне...
А бура ў грудзях у мяне!
Я — цар уладарны!
Я — сьмерці таварыш! Я славай кірую!
Я — сонца адвечнага сын сьветазарны!
Я з сілай сьмяротнай ваюю...
Свой гнеў праз мяне Бог на сьвет пасылае,
Я — помста за мора няшчасьця і сьлёз!
Мне — шаг ад зямлі да нябёс!
........................................................................
Памчаўся, далёка...
Прапаў!.. І ня вернецца сьмелы ніколі...
Яго не убача ўжо матчына вока...
І грудзі парвуцца ад болі...
Яму за адвагу пахвалы не трэба,
Яму шлях агністы — зарніца у небе,
Ён — шчасьце, дыханьне адважных людзей...
Ён — шчасьце старых і дзяцей...

І вось “памчаўся... далёка... прапаў” у бурлівым віру вайны чалавек, кінуўшыся у бітву усім сваім жыцьцём быц ў будзённую працу.

Усё асталося для яго забытым, толькі гарматныя стрэлы займаюць увесь ягоны слых.

Рознаколёрныя абразы ваеннага жыцьця мігацяць прад нашымі вачыма і, смуткам сваім і жалем поўнячы нашыя душы, робяць з нас усіх нявольных учасьнікаў сусьветнага пажару.

Вось перад нашымі вачыма абраз паэты Ясакара: страшэнная бітва на Нёмне пры адходзе расейскай арміі з Усходніх Прусаў:

“Ад крыві чырвонай Нёман фарбаваўся,
Ладзіліся гаці з трупаў па вадзе;
Стогн разьні адважнай гулка раздаваўся...
Бітва, як ніколі... Бітва, як нідзе!
Людзі, коні ніклі каласамі ў полі,

Малаціў галовы алавяны град...
Жартавалі ў сьмерці — лезьлі яшчэ болей;
Топчылі жывыя няжывых грамад.
Затуманіў неба цёмна-дымны порах,
Жорлішчы гарматаў каркалі агнём;
Ціхія сялібы нішчыў дзікі вораг...
І дабро людзкое панясло віхром.
У зямлі глыбока рыліся шрапнэлі,
Над зямлёй высока пёрся самалёт;
Сярод іх над полем труганы ляцелі,
На гульню-вячору ладзілі паход.
Ой, для іх пажыва вельмі ўжо богата!
Ой, вісіць бязьмерна гібель над зямлёй!
Ой, крыві залішне! Ой, крыві занадта!
Ажна ап'янелі, патанулі ў ёй!..
Гэй ты, бацька — Нёман, бачыў ты спрадвека
Гэткія рабункі на сваіх вадах?..
Ці няма граніцы злосьці чалавека?
Ці ўвесь сьвет павінен гінуць у сьлязах?
А крывавы Нёман з берагоў падняўся,
Як бы пасыцеў ён ад сваіх ахвяр.
Па пяску, каменьні буйна разагнаўся,
У абоймах сьціснуў ён палёў абшар...
Нёман сказ свой гукнуў... Хай гудзяць віхоры!
Хай грымяць гарматы! Хай нясецца стогн!
Хай шкілеты, косьці вырастуць у горы.
Я пішу крывёю, вечны свой закон: —
Да сваіх я добры! Іх кармлю, гадую!
Да чужых я страшны, ніба пекла ліх...
З гэткаю любоўю, як сваіх шкадую,
З гэткай самай злосьцю нішчу я чужых.
(працяг будзе)

**Я. Фарботко**



НЯМЕЧЧЫНА. Павэдле Вярсальскага міру лік войска (Reichswehr) устанаўлёны у 100.000 людзей, з іх 4.000 ахвіцэраў. Флёта (Reichsmarine) мае 15.000 людзей, у тым ліку 500 ахвіцэраў. Флёта складаецца з 6 лёгкіх крэйсяроў і 12 мінанішчыцялеў.

Агульны склад войска — 7 пешых і 3 конных дывізіі.

Пешую дывізію складаюць:

адна пешая брыгада (3 поўкі),

адзін гарматны поўк (3 групы, па тры батарэі (з 4 гарматаў) у кожнай; з іх дзьве батарэі маюць 7,7 см гарматы, адна — 10,5 см),

адзін піанэрны баон,

адзін швадрон,

аддзелы дзеля злучнасьці і санітарнае службы,

абоз.

Склад пешага поўку:

тры баона,

адна кампанія,

адзін няшыховы баон.

Склад батальёну:

тры пешыя кампаніі,

адна кампанія кулямётаў.

У кожным поўку ёсьць адна кампанія самакатчыкаў.

ПОЛЬШЧА. Па весткам польскае прэсы тры старэйшыя гады жаўнераў дэмабілізаваны. Да 1 мая жыхарам перадана 10.000 дэмабілізаваных каней.

Кіраўнік агляду польскай вайсковай часопісі (“Bellona”) піша, што супрацоўніцтва пранцускай* місіі з польскім міністэрствам вайны, што раз робяцца больш сардэчнымі і плоднымі. Часопісь “Bellona” выдае вайскова-навуковы аддзел польскага

міністэрства вайны, рэдагуе капітан Tokarz**; часопісь мае мэтаю выпрацаваць пры дапамозе пранцускіх ахвіцэраў польскую ваенную дактрыну.

**Французскай. — “БР”.*

***Вацлаў Токаж (1873 — 1937) — польскі вайсковы гісторык, палкоўнік польскага войска. — “БР”.*

У Варшаві ёсьць акадэмія гэнэральнага штабу, у якой цяпер ёсьць 61 слухач: з іх 42 ахвіцэры былых лігіонаў Пілсудзкага, 11 — былых аўстрыяцкіх войскаў, 5 — былых маскоўскіх і 3 — былых нямецкіх войскаў.

“KARYS”

**R. Z.**

## У касьцелі

Грыміць арган, сумуюць гукаў хвалі,
Гуляюць зайчыкі ад слонца ў цёмнай раме,
Ўчора зноў братоў мы пахавалі...
О, Езу, Збаўца, змілуйся над намі!

18 чэрвеня 1921, Коўна **Алесь Смаленец**




## Дзяржаўная падгатоўка вайны

Разглядзеўшы выжэй, што такое вайна і войска ў уснові, мы у данны раз разбярэм, як павінна вясьцісь падгатоўка вайны дзяржавлю наагул. Выходзячы з таго стану, што войска толькі “змагаецца”, але “ваюе” дзяржава цалком, то пэўна, што апошняя мусіць заўчасна прадбачыць усе меры, якімі б для войска у час

вайны была забясьпечана поўная свабода дзеяньня. Да гэтакіх мераўжываньняў магчыма больш альбо менш аднясьці: a) палітычную падгатоўку, в) грашовую і фінансовую, c) грамадзкай думкі, d) харчавую і гаспадарскую.

Разглядаючы кожную з іх па чарзе, можна сказаць, што палітычная падгатоўка павінна разумецца ў забясьпечаньні за сабой гатоўнасьці да вайны пры сучасных варунках. Але да гэтага трэба дадаць, што добрыя весткі пра становішча і пляны рожных суседзяў могуць у гэты час паказаць на спосабы, пры дапамозе каторых зручная дыпляматыя сумее дужа дапамагчы сваёй стратэгіі. Ня трэба траціць шмат слоў, ляпей будзе, калі дзеля большай зразумеласьці прывяду адзін дужа добры прыклад з гісторыі.

Банапарт у року 1805-м, жадаючы нэйтралітэту з боку прускага караля, аддае яму Ганновер. Такім лоўкім дыплёматычным манёўрам ён забясьпечвае сабе ня толькі ад лішняга ворага, але яшчэ атрымлівае магчымась[ць] вывесьці на тэатр вайны лішні корпус, які знайходзіўся там на окупацыі, чым яшчэ больш падкрэсьлівае сваю шчырасьць.

Што датыча справы грашовай, то тут пра гэта так сама ня трэба шмат разважаць, бо гэта з аднаго боку справа адумыслоўная, але з другога настолькі складаная, што займе шмат часу. Яе мусяць вырашыць у зьвязку з абставінамі адумысловыя дзяржаўныя ўстановы. Для нас жа зразумела, што зачынаць і вясьці вайну бяз грошаў немагчыма. Вялікі гетман дзяржавы (альбо гэтман польны) не павінен быць абмяжаваны у коштах, калі на карту ставіцца вартасьць, гонар і цэласьць дзяржавы. Немагчыма сказаць нічога проціў найбольш жорсткага кантролю выдачаў, няхай ён будзе, але-ж шкадаваньне грошаў у гэтакія мамэнты жыцьця дзяржавы ёсьць немагчымым.

Пераходзячы далей да разгляду мераўжываньняў дзяржавы, нам у даным разе прыйдзецца троху спыніцца на пытаньні пра падгатоўку грамадзкай думкі. Трэба сказаць, што ў гэтым пытаньні ніхто ня стане пярэчыць, што агулам грамадзкае спачуцьцё вайне ёсьць надта вялікай паслугай для памыснага яе вядзеньня. У такіх выпадках войска лепш змагаецца, бо яно, атрымліваючы весткі з дому, ведае, што яго праца на карысьць народу і дзяржавы ёсьць каштоўнай і што кожная кропля крыві будзе там зарахавана і знайдзе водгук славы ва ўсіх сэрцах грамадзян. Калі грамадзянства дзяржавы ад старага да малага жыве інтэрэсамі войска і ўраду, дык гэта складаецца так і дае магчымасьць войску і ураду шукаць

сабе падсілак і спачуцьцё у народзе. Але на жаль гэтыя жаданьні дужа часта бываюць толькі лятункамі, а асабліва у нас. І паходзіць усё гэта з таго, што мы і дагэтуль не маем спадзеўнага спосабу да пазнаньня праўдзівай грамадзкай думкі, якая, на жаль, ня падлягае ані статутам, ані спосабам рожных гурткоў і партыяў, але тварыць сваё разьвіцьцё па простаму шляху звычаяў.

Калі ня выказвае гэтай думкі урад, дык тым больш ня выказвае яе і нашая прэса і рожныя партыі. Дык яшчэ і зразумела, бо калі на Захадзе прэса яшчэ больш менш паказуе і концэнтруе у сабе гэтую думку, то у нас, пры сучасным стане анархіі і тэрору, няпісьменнасьці і беднасьці народу, добрая палавіна ня толькі ня чытае часопісь, але нават ня ведае, што робіцца ў суседнім сяле. Пры такім стану пэўна няма чаго казаць пра ацэнку народнымі масамі агульнага становішча рэчаў, дый я думаю, што невялікі лік і інтэлігэнтаў упоўне яго ацэніць. А што да нашае прэсы, дык пан Бог ім судзь[д]зя, бо калі так званыя нашыя “палітычныя партыі” ня сабраліся выпрацаваць яснае і закончанае праграмы у справе будаваньня дзяржавы, дык чаго ж вымагаць ад прэсы — тут ужо так, што каму Бог на душу палажыў. Кожны цягне сваю рысу...

З гэтага магчыма зрабіць адзін вывад, што грамадзкую думку трэба пачаць гадаваць іншымі спосабамі. Але праз тое, што гэта справа грамадзкіх арганізацыяў і установ, то яны і павінны з прыводу гэтага паразумецца, мая справа тут толькі прыпомніць. Да гэтага можна дадаць толькі тое, што зьвяртаючы ўвагу на Захад, дзе грамадзкай думкай карыстаюцца як разраджэньнем лейдэнскай банкі*, дык у нас патрэбна сабе загатаваць гальванычную батарэю.

(працяг далей)

поўкоўнік **Полтавець-Остряныца**

**Першы электрычны кандэнсатар, які вынайшлі ў 1745 годзе ў Лейдэне. — “БР”.*

РАЗЬВІТАНЬНЕ ГЭНЭРАЛА ЖУКОЎСКАГА. Павэдле Загаду Войску № 125 я ухаджу са службы. Падэшлы узрост і разбуранае здароўе не дазваляюць мне дольш аставацца у вашых дзельных радах. Я шчасьлівы, што хоць канчатак жыцьця мне давялось паслужыць роднаму краю, стоючы на чале вас, дзельныя волаты. Разьвітаючыся з вамі, як стары ваяка, я лічу сваім абавязкам даць вам апошнюю, ваяцкую раду. Заўжды і скрозь няхай будзе дэвізам вашым — усе за аднаго, адзін за ўсіх. Гэтым — войска моцнае і страшнае. Адлучаюсь ад вас, але душой і сэрцам жыву з вамі[,] весялюся вашым вясельлем, сумую вашым сумом. Сэрдэчна зычу вам, волаты, каб шчасьце не кідала вас на палёх бойкаў. Няхай жыве Айчызна, няхай жыве Войска.

(Загад гэтмана польнага № 2).

УТРЫМАНЬНЕ ВЕТЭРЫНАРНЫХ ПАДАХВІЦЭРАЎ.
Ветэрынарныя падахвіцэры з боку утрыманьня прыраўнаны да санітарных п.-ахвіцэраў (Загад войску № 157 параграф 13).

БЕЛАРУСКАЕ ПРЭС БЮРО У АМЭРЫЦЫ: U.S.A.
THE WHITE RUSSIAN PRESS BEAURO 63 PARK ROW NEW-YORK N.Y. ROOM 1109.




(заканчэньне ў наступным нумары)

# Пра барацьбу з “кулацкім бандытызмам” на Гомельшчыне ў 1931 годзе

Стыхійны супраціў савецкай уладзе ў БССР працягваўся і ў 1930-я гады. Даведзеныя да адчаю людзі, якіх рабавалі, высялялі ў Расею, арыштоўвалі, даставалі прыхаваную зброю і стралялі бальшавіцкіх актывістаў, чэкістаў, сэксотаў. Барацьба іх была безнадзейная, паколькі лякальныя кропкі супраціву савецкія сілавыя структуры падаўлялі хутка. Таму многія бачылі толькі адзін выхад — прарывацца за мяжу — у Польшчу. Але шанцавала далёка ня ўсім.

Зьмяшчаем два дакумэнты на гэтую тэму. Яны адносяцца да падзеяў, якія адбываліся на тэрыторыі цяперашняй Гомельскай вобласьці вясной-летам 1931 году. Зь іх мы даведваемся прозьвішчы камандзіраў паўстанцаў: Жураўскі, Біран, Жэбет, Хамутоўскі, Бараноўскія, Заланы.

**Інфармацыйнае паведамленьне П[аўнамоцнага] П[радстаўніцтва] *ОГПУ* па БССР аб барацьбе з кулацкім бандытызмам. 16 ліпеня 1931 г.**

Зусім сакрэтна

Нам[есьніку] старшыні *ОГПУ* Ягодзе
Начальніку С[акрэтнага] А[пэратыўнага] У[праўленьня] *ОГПУ* Еўдакімаву
Памочніку начальніка С[акрэтнага] А[пэратыўнага] У[праўленьня] і начальніку А[собага] А[дзьдзелу] ОГПУ Ольскаму

Масква

## Аб выніках праведзенай аперацыі па барацьбе з бандытызмам у Лельчыцкім і Барадзінскім* раёнах БССР

**У самім дакумэнце “Барадзінскі” раён ня згадваецца. — “БР”.*

Палітычнае становішча ў Лельчыцкім раёне за апошнія гады не адрозьнівалася асаблівай устойлівасьцю. Травеньска-чэрвеньскае (гэтага году) высяленьне кулацтва было праведзена як адміністрацыйнае мерапрыемства і без усялякага палітычнага забесьпячэньня. Раённае кіраўніцтва такім чынам адцяніла мэтазгоднасьць удзелу раённай арганізацыі ў высяленьні: “У нас ёсьць больш важныя справы, што тады будуць рабіць ворганы ГПУ, калі мы будзем займацца высяленьнем” (старшыня РВКа і член бюро райкама Данец). У выніку гэтага бедняцка-серадняцкія масы і калгасьнікі ня толькі не былі зьяднаныя для больш пасьпяховага правядзеньня задачаў, пастаўленых савецкай уладай, але ў частцы сваёй былі гэтай аперацыяй напалоханыя, і зьявіліся зручным матэрыялам для ўспрыманьня кулацкай і поль[скіх] разьведворганаў агітацыі. Калі дадаць, да прыкладу, яшчэ такі метад правядзеньня высяленьня, як разгон з вуліцы з рэвальверам у руках мясцовым партыйцам насельніцтва, а такія рэчы хутка становяцца здабыткам многіх сёлаў, то стане зразумелым, які адмоўны палітычны эфект у часткі насельніцтва Лельчыцкага раёну зрабіла апошняе высяленьне кулакоў . Нельга няўлічыць таксама і пары году, якая аблегчыла кулацкую агітацыю: сыходзіць у лес, арганізоўваць банды, прарывацца ў Польшчу.

Але адсутнасьць палітычнага забесьпячэньня высяленьня кулацтва зьяўляецца не адзінай “заслугай” раённага кіраўніцтва, які прывёў раён у чэрвені да стану “відавочна пагрозьлівага”, як ацаніла яго 7 чэрвеня гэтага году аб’яднанае пасяджэньне бюро РК, прэзідыюма РКК, фракцыі РВК і камісіі ЦК і ЦКК. Нездавальняюча была праведзеная тлумачальная праца па новым сельскагаспадарчаму падатку, як сярод насельніцтва, так і сярод нізавых работнікаў. У выніку гэта прывяло да няправільнага ўліку аб’ектаў абкладаньня і да сур’ёзных перагібаў у частцы індывідуальнага абкладаньня серадняцкіх гаспадарак. “Факты няправільнага падыходу ў дачы цьвёрдых заданьняў серадняцкім гаспадаркам, слабая праца па выяўленьні сапраўды кулацка-заможнай часткі вёскі і нерэальнасьць цьвёрдых заданьняў, а адсюль практыка непасільных штрафаў, прывялі і да спусташэньня шэрагу серадняцкіх гаспадарак” (з той жа рэзалюцыі). Усё гэта: адсутнасьць масава-палітычнай працы з бедняцка-серадняцкай масай сялянства, абвостранае становішча паміж калгасамі і індывідуальнымі гаспадаркамі па віне раённага кіраўніцтва і несвоечасовае ўказаньне па адводзе сенажацяў — прывяло да абвастрэньня становішча з асноўнымі масамі сялянства.

І ўсё гэта мае месца, нягледзячы на тое, што сяло засвоіла лінію партыі і савецкай улады на калектывізацыю, разумее яе неабходнасьць і непазбежнасьць і ў цэлым настроенае “пайсьці ў калгасы”. Больш таго, мы маем выпадкі ахвотнага аказаньня дапамогі індывідуальнымі гаспадаркамі калгасам: “Як жа можна інакш, гэта ж наш уласны калгас, яму патрэбная была дапамога, і мы пайшлі і дапамаглі, але нам калгас ніколі не дапамагае”, — так кажуць сяляне. Гэта дакладна, і ў гэтым віна раённага кіраўніцтва. Больш таго, такое мерапрыемства, як адабраньне сенакосу ад індывідуальных гаспадарак без усялякай замены (быдла асуджанае на гібель) і перадача яго калгасу, прычым, апошні яго ня можа выкарыстаць, выклікае зразумелае абурэньне індывідуальнікаў. Ці такі прыклад: калі лугі з 1917 г. выкарыстоўваліся індывідуальнымі гаспадаркамі, а ў гэтым годзе леспрамгас іх забірае, і на маленьні сялян яго прадстаўнік прапануе ім: “Ці можаце касіць сена, але за карыстаньне лугам палову аддайце нам”. Можна прывесьці дзясяткі пачварных прыкладаў з Лельчыцкай практыкі: прыпісваньне зямлі без абмеру, індывідуальны падатак за продаж гарэлкі; быў таксама выпадак, калі адзін селянін 9 гадоў меў самастойную гаспадарку, яго аб’ядноўваюць з гаспадаркай бацькі, каб атрымалася кулацкая і г. д. Вось такім чынам бязладнае кіраўніцтва раёнам прывяло да непажаданых і небясьпечных палітычных наступстваў, нягледзячы на тое, што ў наяўнасьці абсалютна ўсе неабходныя элементы для самага пасьпяховага і поўнага правядзеньня ў жыцьцё лініі партыі.

Ніякай працы раённая арганізацыя не вяла сярод нацыянальных меншасьцяў і асабліва сярод палякаў, нягледзячы на блізкасьць раёну да Польшчы. Дастаткова прывесьці такія заявы сялян-палякаў: “Што нам рабіць, усіх палякаў ня любяць і ўсё роўна будуць высылаць”. І палякі-серадрнякі і беднякі — рыхтуюцца да высылкі (прыгатавалі сухары), і ніхто ім не тлумачыць выключна класавай сутнасьці гэтага пытаньня. Больш таго, яны баяцца гаварыць, што яны палякі. Сярод іх адчуваецца пэўная напалоханасьць. Але запалохваньне ёсьць ня толькі сярод іх. На сельскім сходзе партыец-прадстаўнік раёну заяўляе: “У нас для вас сьвінцу хопіць”, — гэта ў дачыненьні да тых, што не ўступаюць у калгас. Гэтыя фразы ведаюць дзясяткі і сотні сялян, яны разумеюць, што ў нас могуць быць асобныя галавацяпы, і яны чакаюць, што за гэта іх выключаць з партыі і прыцягнуць да адказнасьці, але чакаюць дарэмна, бо “гэтыя менш важныя” пытаньні, як і высяленьне кулацтва, не маглі займаць раённае кіраўніцтва. І тады ўжо масы

сялянаў пачынаюць пачварства асобных партыйцаў і раённых работнікаў адносіць на кошт савецкай улады і партыі ў цэлым. Настрой сярод насельніцтва (аднаасобнікаў) шэрагу сельскіх саветаў было нервова-напружаным, працоўная дысцыпліна моцна зьнізілася, антысавецкія чуткі распаўсюджваліся ў масавым парадку, і становішча сярод часткі сялянства было нейкім чакальным. На такую глебу трапіла насеньне агітацыі кулацтва і поль[скіх] разьведорганаў.

Кулакі, якія ўцяклі з высылкі, і старыя памагатыя розных бандаў (Гарася ў тым ліку) зьявіліся асноўнымі кадрамі для арганізацыі кулацкага контррэвалюцыйнага выступу ў раёне, у частцы сваёй бандыцкага і які меў тэндэнцыю перарасьці ў паўстанцкі. Поль[скія] разьведорганы выкарыстоўвалі старых бандытаў, а таксама ўцекачоў, якія зьбеглі за мяжу. Кадры гэтыя арыентаваліся на частку сельскага насельніцтва, пакрыўджаную савецкай уладай. Падыход быў такі: а) блізкая вайна з Польшчай, называлі нават “Пятроў дзень”; б) у Польшчы ўсяго многа і танна; в) там можна спакойна працаваць на зямлі; г) усе сяляне, якія пасьпелі пабываць у Польшчы, пасьля іх вяртаньня ў СССР карыстаюцца абаронай поль[скіх] уладаў. Польскі ўрад загадае СССР не абкладваць іх цьвёрдымі заданьнямі, падаткамі, штрафамі і г. д.; д) сёньня высяляюць кулакоў, а заўтра — сераднякоў, сёньня цябе, заўтра яго, і г. д. Як ні наіўныя здаюцца дадзеныя ў пункце “г”, але яны мелі вялікі посьпех сярод велізарнай колькасьці сялянаў. І ўсёй гэтай агітацыі верылі. Уцёкі ў лес пачаліся масавыя і стыхійныя. Гэтая зьява, нарэшце, прыняла характар нейкага псыхозу. Сярод тых, хто ўцёк у лес і балоты, ёсьць індывідуальна абкладзеныя, якія атрымалі цьвёрдае заданьне, аштрафаваныя, ёсьць і такія, якія ня могуць назваць, чым іх савецкая ўлада пакрыўдзіла, ёсьць былыя чырвоныя партызаны, былыя чырвонаармейцы, былы камандзір аддзяленьня РККА, былы старшыня сельскага савету. Беглі з жонкамі і бяз іх. Пакідалі дзяцей, быдла, гаспадарку часта на волю лёсу. З сабой бралі толькі ежу.

Памылкі, дапушчаныя раённым кіраўніцтвам, былі выкарыстаныя кулаком і яго агентурай у бок узмацненьня ўплыву на бедняцка-серадняцкіх частку вёскі, якія прывялі да таго, што ў шэрагі ворагаў савецкай улады былі кінутыя блізкія і адданыя нам сацыяльныя групы ў вёсцы. Шэраг сёлаў рабілі самае гнятлівае ўражаньне: мужчын не відаць, няма і маладых жанчын, у доме куча дзяцей без усялякага догляду. У тых сёлах, зь якіх не ўцякалі

сяляне ў лес, пры зьяўленьні вайскоўца ўсе кідаліся бегчы. Усё гэта адносілася толькі да індывідуальнага сэктару. Калгасы стаялі ў баку ад гэтага, але нічым не процідзейнічалі. Бязьдзейнічала і партыйная арганізацыя ў раённым цэнтры і на месцах. І нават тады, калі контррэвалюцыйны выступ набыў масавы і вельмі сур’ёзны характар, раённае кіраўніцтва ня толькі нічога не зрабіла ў дачыненьні да мабілізацыі арганізацыі і інфармацыі яе аб становішчы, але фактычна распусьціла актыў: старшыня РВК сышоў у адпачынак у канцы чэрвеня, сакратар райкама адправіўся ў Менск у ЦК КП(б) для дакладу па пытаньні аб кадрах і быў вернуты ў Лельчыцы з Калінкавічаў камісіяй ЦК і ЦКК, член бюро, рэдактар газэты з Лельчыц зьехаў за фарбай, амаль усе сакратары ячэек былі адпраўленыя ў адпачынак і камандзіроўкі. Бандгрупа, якая арганізавалася ў красавіку, ачольвалася Хамутоўскім С., братамі Бараноўскімі, бацькам і двума сынамі Залан. Бараноўскія і Заланы — кулакі, якія маюць сваяцкія сувязі з Польшчай, а адзін сын Залана служыць у Віленскай паліт[ычнай] паліцыі; Хамутоўскі — серадняк, які ведае кавальска-сьлясарнае рамяство, у свой час зьвязаны з бандай Гарася. Актыўнасьць банда пачала выяўляць ў пачатку чэрвеня гэтага году: у ноч з 8 на 9 чэрвеня яна зрабіла налёт на дом лесьніка Філіпцава, што за два кіламетры на поўнач ад вёскі Сініцкай-Поле, забраўшы стрэльбы апошняга. 9 чэрвеня бандай быў забіты калгасьнік-камсамолец Чэчко Аляксей, які актыўна ўдзельнічаў у раскулачваньні Бараноўскіх і Заланаў. 10 чэрвеня ёю быў зьдзейсьнены напад на возчыкаў, якія езьдзілі з Лельчыц на станцыю Ельск. 17 чэрвеня ёю зьдзяйсьняецца напад на групу мясцовых работнікаў Кармянскага сельскага савету Каралінскага раёну, прычым, апошнія, уцёкшы, пакінулі бандзе вінтоўку. 23 чэрвеня банда пачала канцэнтравацца ў Алахоўскім балоце, што на поўнач ад мястэчка Лельчыцы. У ноч з 24 на 25 чэрвеня бандай падпальваецца калгас “Чырвонае Лядо” Лельчыцкага сельсавету, дзе было зьнішчана да 30 галоў рагатай жывёлы і розны сельскагаспадарчы інвентар.

Да гэтага часу кіраўнікі банды рассылаюць сельскім саветам лісты пагрозьлівага зьместу і робяць надпісы на дрэвах, слупах і пабудовах з заклікам да паўстаньня. 27 чэрвеня бандыцка-кулацкая група з 80 чалавек з Алахоўскага балота накіравалася ў бок мяжы. Ішла яна па зусім ненаселеных месцах праз балоты і лясы. Наперадзе групы ішла разьведка з 10 чалавек, зь іх 7 чалавек, узброеных вінтоўкамі. Усяго ў бандгрупе было 7 вінтовак і столькі ж паляўнічых драбавікоў. Кулацкая

бандгрупа мела цьвёрды намер сілай зброі прарвацца ў Польшчу. Тых, хто ўцёк з сваіх гаспадарак, да гэтага часу налічвалася да 200 чалавек. Але і сярод часткі сялян, якая яшчэ не ўцякла, настрой быў такі, што, калі б атрымаўся сыход за кардон групы 80-ці, гэта было б заразьлівым прыкладам для іншых з самымі нечаканымі і небясьпечнымі наступствамі.

Мерапрыемствы камісіі ЦК і ЦКК бачныя з рэзалюцыяў бюро райкама, прэзідыюму РКК і фракцыі РВК ад 30 чэрвеня і 7 ліпеня, якія, у асноўным, зводзяцца да наступнага:
1) сакратар РК, старшыня РВК і старшыня РКК былі вызваленыя ад сваіх абавязкаў;
2) партыйная і камсамольская арганізацыі былі мабілізаваныя на барацьбу з становішчам, якое стварылася;
3) была праведзеная найшырэйшая масавая палітычная работа сярод калгасьнікаў, серадзнякоў і беднякоў, прафсаюзаў з выкарыстаньнем праведзеных арг[анізацыйных] мерапрыемстваў; 4) быў арганізаваны прыём скаргаў і вырашэньне іх, галоўным чынам, па пытаньнях індывідуальнага абкладаньня, цьвёрдых заданьняў і штрафаў;
5) праведзеная самая шырокая кампанія па добраахвотнай яўцы тых, хто ўцёк у лясы і балоты з 2 да 7 ліпеня;
6) ўзмоцненая работа па выкананьні чарговых задачаў: арганізацыя новых калгасаў і прыліў у старыя, уборачная кампанія, пазыка 3-га рашаючага году пяцігодкі;
7) праз РКК прыцягнутыя да адказнасьці партыйцы, вінаватыя ў перагінах і запалохваньні насельніцтва;
8) дадзена выразная і ясная ацэнка стану раёну і апошніх падзеяў, і на гэтай аснове праведзена выхаваўчая работа, пачынаючы ад кіраўніцтва раёну, уключна з самымі шырокімі масамі.
Мерапрыемствы па лініі ГПУ, у асноўным, зводзіліся да наступнага:
1) у Лельчыцкі раён была высланая аператыўная група работнікаў С[акрэтнага] А[дзьдзелу] П[аўнамоцнага] П[радстаўніцтва], У[праўленьня] П[амежнай] А[ховы], А[собага] А[дзьдзелу] Гомельскага аперсэктару і 18-га памежнага атраду пад кіраўніцтвам начальніка У[праўленьня] П[амежнай] А[ховы] тав. Чарнобыльскага;
2) была ўзмоцнена ахова межаў;
3) на ўсіх магчымых шляхах руху ад мяжы ў тыл былі арганізаваныя аператыўныя і зьнішчальныя групы;
4) ўзмоцненая ахова мяжы і тылавых дарог зрабіла немагчымым перасоўваньне бандгрупы і асобных кулакоў;
5) аператыўная праца была даведзеная да максімальнага напружаньня, прычым, спецагентура ўкаранялася падчас

самой аперацыі (як унутраная, так і для закардоннай работы); 6) да ўдзелу ў аперацыі ў пэўныя яе перыяды ў Жыткавіцкім і Тураўскім раёнах прыцягваўся мясцовы актыў, што таксама стала магчымым і ў Лельчыцкім раёне ў апошнюю пяцідзёнку; 7) з 2 да 7 ліпеня было забясьпечана масавае добраахвотнае вяртаньне тых, хто ўцёк у лясы і балоты; 8) з 7 па 10 ліпеня праведзены пільны ператрус лясоў і балот ўчастку 18-га памежнага атраду; 9) арганізаваная і, у асноўным, праведзена сьледчая праца па справе. У выніку ўсіх мерапрыемстваў партыйна-палітычнага, аператыўнага і вайсковага характару мы маем:

1. 28 чэрвеня банда, дасягнуўшы чатырох з паловай кіламетраў ад лініі мяжы, з крыкамі “ўра” напала на засаду, выстаўленую ў паўтара кіламетрах на поўдзень ад хутара Жадзен, у выніку перастрэлкі паміж засадай і бандай, [нелегалы], страціўшы 16 чалавек забітымі, кінуліся адступаць ў тыл, тры чалавекі было дадаткова забіта пры спробе прарвацца ў іншым месцы за мяжу — на ўчастку 10-й заставы.
2. У выніку перасьледу і аператыўна-вайсковых мерапрыемстваў пасьля было захоплена 59 чалавек, добраахвотна зьявілася 44 чалавекі, забіты ў тыле адзін чалавек.
3. Усяго за аперацыю: забіты — 21 чалавек, захопленыя — 75 чалавек, добраахвотна зьявіліся — 44 чалавекі. Усяго: 140 чалавек. Неабходна таксама ўлічыць, што лічба забітых фактычна павінна быць большай за прыведзеную, паколькі, несумненна, што ў балотах засталіся непадлічаныя трупы і памерлыя параненыя.
4. Сярод захопленых маюцца кіраўнікі банды — Хамутоўскі С., бацька, і адзін з сыноў Залана.
5. З 14-15 адзінак зброі, якая была ў бандзе, захоплена 8 адзінак, частка бандытамі кінута ў балота.
6. Сыход у лес і балота канчаткова спыніўся.
7. Маса зваротаў са скаргамі на дзеяньні мясцовых уладаў у камісію ЦК і ЦКК пра ўцекачоў у лес і балоты зьяўляецца адным з самых яркіх доказаў рэзкай зьмены настрою насельніцтва да лепшага і праявы даверу да савецкай улады.
8. Арганізаваныя тры новыя калгасы і 84 гаспадаркі, прыбыло ў старыя калгасы 85 гаспадарак. Рушыла наперад практычнае вырашэньне пастаўленых партыяй задачаў на вёсцы. Палітычнае становішча ў раёне патрабуе далейшай узмоцненай палітычнай і чэкісцкай працы, паколькі не выключаныя рэцыдывы контррэвалюцыйных выступаў і ў асаблівасьці дывэрсій з-за мяжы.

Пра стан раёна ў бліжэйшы час будзе пастаўлена пытаньне на бюро ЦК ВКП(б), дзе будзе вырашана пытанне аб кіраўніцтве раёну і неабходных мерапрыемствах па раёне. № 6650.

Нам[есьнік] ПП *ОГПУ* па БССР **Гродзіс**

Начальнік А[собага]А[дзьдзелу] ПП *ОГПУ* па БССР **Наўякайціс**

*Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле наступнага выданьня: ”Совершенно секретно”: Лубянка — Сталину о положении в стране (1922 — 1934 гг.). Т. 9. — Масква, 2013, б. 391-396.*

***

# Дакладная запіска П[аўнамоцнага] П[радстаўніцтва] ОГПУ па БССР пра барацьбу

## з бандай кулакоў. 5 жніўня 1931 г.

*Зусім сакрэтна*

*Нам[есьніку] старшыні ОГПУ Ягодзе*
*Копія ў А[собы] А[дзьдзел] ОГПУ Заліну*

*Масква*

З канца чэрвеня месяца гэтага году ў Гомельскі Апер[атыўны] сэктар ПП ОГПУ БССР сталі паступаць зьвесткі пра тое, што на стыку Хойніцкага і Брагінскага раёнаў з мясцовых кулакоў, якія ўцяклі з высылкі, арганізавалася банда ў колькасці 15-20 чалавек, якая, быўшы добра ўзброеная, нічым сябе не выяўляе, хаваецца ў лясах і праводзіць вярбоўку ў сваю банду нявысланых кулакоў і цьвёрдазаданьнікаў*, праз іх жа стварае паўстанцкую арганізацыю. Пры праверцы гэтыя зьвесткі пацьвердзіліся, прычым, было ўстаноўлена, што банда гэтая ўзначальваецца высланым вясной 1930 г. кулаком вёскі Пудакова Паселіцкага сельскага савету Хойніцкага раёну Жураўскім Аляксандрам, 48-мі гадоў, які ўцёк з высылкі, і яго памочнікам, які таксама ўцёк з высылкі, кулаком вёскі Мікулічы таго ж сельсавету Брагінскага раёну Біран Рыгорам. Шляхам распрацоўкі банды і яе сувязяў нам удалося ў другой палове ліпеня месяца зладзіць спатканьне шасьці нашым крыніцам (па легендзе — кулакам-уцекачам) з бандытамі банды Жураўскага. Пры спатканьні памочнік верхавода банды Біран Рыгор прапанаваў нашым крыніцам часова хавацца асобна ад банды з меркаваньняў канспірацыі да моманту, пакуль яны створаць моцную паўстанцкую арганізацыю для ўзняцьця паўстаньня, так як у выпадку, калі банда разрасьцецца, то ім прыйдзецца зьдзяйсьняць узброеныя рабаваньні для таго, каб пракарміць сябе, што, у сваю чаргу, можа пацягнуць за сабой іх разгром, бо на месца будуць высланыя войскі.

30 ліпеня гэтага года для ліквідацыі банды і арганізацыі была выслана ў Хойніцкі раён аператыўная група з работнікаў Асобага адзьдзелу Паўнамоцнага Прадстаўніцтва ОГПУ БССР і Гомельскага апер[атыўнага] сэктару, і 2 жніўня быў выкінуты ў раён атрад чырвонаармейцаў Гомельскага дывізіёну войскаў ОГПУ ў колькасьці 30 чалавек з камандзірам дывізіёну на чале. Чырвонаармейцы былі ўзброеныя вінтоўкамі, ручным кулямётам

Дзегцярова і двума аўтаматычнымі пісталетамі Томпсана. Па прыбыцьці на месца аператыўнай групай было ўстаноўлена, што Жураўскі Аляксандар ўзначальвае толькі пазначаную вышэй банду, вярбоўку ж у арганізацыю і ідэйнае кіраўніцтва бандай ажыцьцяўляе пяцёрка, якая складаецца з пяці мясцовых кулакоў і заможных сераднякоў. На чале пяцёркі стаіць былы стражнік царскай паліцыі, кулак вёскі Высокае Паселіцкага сельскага савету Хойніцкага раёну Жэбет Ціхан Іванавіч, 55 гадоў. Чальцамі пяцёркі зьяўляюцца: Максімовіч Антон, Новік Іван, Гарбар Іван і Ціхан — усё заможныя серадняки Паселіцкага сельсавету. Пяцёрка ставіць сабе задачай — стварыць паўстанцкую арганізацыю, зьвязацца з бандамі, якія аперуюць на тэрыторыі Украіны на стыку з Беларусьсю, і з кулакамі-уцекачамі Мазыршчыны, падняць адначасова паўстаньне ў некалькіх пунктах. Для сувязі з украінскімі бандамі пяцёрка ўпаўнаважыла кулака вёскі Масакова Менскага раёну былой Канатопскай акругі** Грэнчэнку Мікіту Пятровіча, які апошнім часам жыў у вёсцы Малышава, побач з мястэчкам Хойнікі, і які працаваў чорнарабочым па пабудове шашы, які, па яго словах, мае ўжо сувязь зь нейкай паўстанцкай арганізацыяй і бандай на Чарнігаўшчыне.

У ноч з 2 на 3 жніўня гэтага году наш крыніца "Буревой", паводле атрыманага заданьня, запрасіла бандытаў да сябе дахаты для таго, каб раніцай 3 жніўня зрабіць налёт на служачых Хойніцкага РВКа, якія павінны былі ў гэты дзень правесьці продаж з таргоў кулацкай маёмасьці за нявыплату падаткаў, у тым ліку і дом "Буревого". Бандыты на гэта пагадзіліся, пакінулі ў сябе двух нашых агентаў, зь якімі да іх прыбыў "Буревой", і абяцалі прыйсьці да апошняга ў колькасьці васьмі чалавек (уключна з нашымі двума агентамі) у 24 гадзіны 2 жніўня. Атрымаўшы гэтыя зьвесткі, намі каля дома "Буревого" была выстаўленая засада з пераапранутых чатырох супрацоўнікаў Гомельскага апер[атыўнага] сэктару і васьмі работнікаў міліцыі ды крымінальнага вышуку. У тую ж ноч была зроблена аперацыя па ўсіх сувязях банды — узята 20 чалавек. Грэнчанка ж, які выехаў 2 жніўня на Чарнігаўшчыну для сувязі з бандай, быў па нашым заданьні А[дзьдзяленьне] Д[арожна]-Т[ранспартнага] А[дзьдзелу] ОГПУ Гомель арыштаваны ў Сноўску і дастаўлены пад вартай у Гомель. Адначасова з аперацыяй былі накіраваны з праваднíком-калгасьнікам, які добра ведаў месца разьмяшчэньня банды, усе 30 чырвонаармейцаў з камандзірам дывізіёну. У 9 гадзін раніцы 3 жніўня чырвонаармейцамі была выяўленая стаянка банды ў

*Пісталет-кулямёт Томпсана.*

Рафанскім бары, разьмешчаным за два кіламетры на поўдзень ад вёскі Карнявая Паселіцкага сельскага савету, прычым, бандыты былі засьпетыя зьнянацку, з-за чаго яны не маглі аказаць збройнага супраціву. Пры спробе да супраціўленьня былі забітыя бандыты — Півавар Міхаіл і Біран Трыфан, цяжка паранены ў хрыбетнік памочнік кіраўніка банды Біран Рыгор, захопленыя жывымі бандыты — Біран Васіль, Шумскі-Жураўскі Васіль, тры жонкі бандытаў, якія знаходзіліся зь імі ў бандзе, і бацька верхавода банды. Пры канваіраваньні арыштаваных, забітых і параненых бандытаў на адлегласьці 200-300 метраў ад месца выяўленьня банды канваіры на чале з памочнікам камандзіра ўзвода натыкнуліся на яшчэ адну групу бандытаў у колькасьці пяці чалавек, якія сумесна з заможным серадняком вёскі Пудакова Паселіцкага сельскага савету Камеш Іванам, які легальна жыў дома, але быў завербаваны ў арганізацыю, натыкнуўшыся на нашу засаду каля дома “Буревого”, зьбеглі, адстрэльваючыся, кінуўшы адну сваю вінтоўку. Калі бандытамі былі заўважаныя нашы чырвонаармейцы, то яны залеглі і адкрылі па канваірах стральбу; тут жа да канваіраў падасьпеў камандзір дывізіёну з астатнімі чырвонаармейцамі, і між бандытамі і чырвонаармейцамі завязалася перастрэлка, у выніку якой апынуліся забітымі: Жураўскі Аляксандар — верхавод банды (памёр праз 30 хвілінаў пасьля яго раненьня, будучы паранены трыма кулямі ў правую нагу навылет, чатырма кулямі ў плячо, адной у шыю і адной у горла — да апошняга моманту адстрэльваўся), брат яго — Жураўскі Канстанцін, Зеляноўскі Фёдар і Найдзёнаў Цімафей; захоплены жывым бандыт Біран Аляксей, паранены ў правую нагу вышэй калена. З боку чырвонаармейцаў забітых і параненых няма.

Такім чынам, за час правядзеньня аперацыі было забіта шэсьць бандытаў, параненыя два, ўзята жывымі шэсьць, у тым ліку тры жонкі бандытаў і бацька верхавода банды, якія былі зь імі ў бандзе;

арыштавана чальцоў арганізацыі, укрывацеляў і памагатых банды — 21 чалавек, захоплена зброі: вінтовак рускага ўзору — шэсьць, адна вінтоўка сістэмы Рэмінгтан, два абрэзы, адзін рэвальвер сістэмы “наган”, вінтовачных патронаў — 201 і наганаўскіх — 15. З наяўных агентурных матэрыялаў і з папярэдняга сьледзтва відаць, што да банды, акрамя названых у дакладной запісцы, яшчэ прымыкалі: згаданы вышэй Камеш Іван, Мажэйка Ціхан — абодва заможныя сераднякі, і цьвёрдазаданьнік Зелянкоўскі Рыгор — усе трое жылі ў Паселіцкім сельсавеце, прычым, Камеш і Мажэйка знаходзіліся на легальным становішчы, жылі ў сябе дома, а Зелянкоўскі Рыгор часткова жыў дома, а часткова знаходзіўся ў бандзе. Для злову трох названых бандытаў пакінутыя ў Хойніках два работнікі А[собага] А[дзьдзелу] Гомельскага Апер[атыўнага] сэктару. Сьледзтва па справе працягваецца. Аб выніках інфармуем. № 6861.

Нам[есьнік] ПП *ОГПУ* па БССР **Гродзіс**

Начальнік А[собага]А[дзьдзелу] ПП *ОГПУ* па БССР **Наўякайціс**

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле наступнага выданьня: ”Совершенно секретно”: Лубянка — Сталину о положении в стране (1922 — 1934 гг.). Т. 9. — Масква, 2013, б. 396-399.

**Сялян-адзінаасобнікаў, якія працавалі па строга вызначаным дзяржаўным пляне-заданьні. — “БР”.*
***У цяперашняй Чарнігаўскай вобласьці Украіны. — “БР”.*

*bchd.info*

# НОВЫЯ ДАДЗЕНЫЯ ПРА БЕЛАРУСКАГА ПАЎСТАНЦА ІВАНА ЛЮЦКО

“БР” неаднаразова зьвяртаўся да асобы беларускага вайскоўца і паўстанца Івана Люцко (1902 — 1931).* У 1931 годзе ён рыхтаваў антысавецкае паўстаньне на Случчыне, што было выкрыта. Адыходзячы да мяжы з Польшчай, Люцко загінуў у баю. У 2012-м мы друкавалі дакумэнт ОГПУ пра тыя падзеі. Цяпер жа зьмяшчаем яшчэ два дакумэнты, якія зьявіліся раней за цыркуляр асобага аддзела ОГПУ ад 21 чэрвеня 1931-га. Зь іх вынікае, што інфармацыя пра бой каля мяжы, у якім Іван Люцко і Аляксандар Дзёмін адстрэльваліся з кулямётаў, не пацьвярджаецца. Стралялі яны верагодна з вінтовак, рэвальвераў. А вынесеныя з вайсковай часткі кулямёты былі схаваныя ва ўдзельніка арганізацыі. Некалькі тыдняў Люцко і Дзёмін былі на нелегальным становішчы, сустракаліся са сваімі аднадумцамі. А іх было вельмі шмат. Толькі арыштаваных на 8 чэрвеня 1931-га налічвалася 60 чалавек.

Дакумэнты, якія публікуем, даюць новую інфармацыю па

справе, далёка не вычарпальную, магчыма, скажоную. А значыць будзем спадзявацца на новыя знаходкі.

**Дзеравенскі П. Аддзел атамана Трухана і паўстаўшая вайсковая арганізацыя Люцька // Беларусі Рэзыстанс, 2005, № 1(2), б. 94-97; Шыбіцкі М. Зноў пра атамана Якава (Якуба) Трухана і яго аднавяскоўцаў // Беларускі Рэзыстанс, 2012, № 2(13), б. 49-51; Справа начальніка штабу батальёну Чырвонай Арміі Івана Люцко. Зноў пра спробу ўзьняць узброенае паўстаньне на Случчыне ў 1931 годзе // Беларускі Рэзыстанс, 2012, № 2(13), б. 52-57.*

## Спэцданясеньне асобага аддзелу ОГПУ пра дэзэртырства дваіх вайскоўцаў 12-га стралковага палка 4-й стралковай дывізіі Беларускай вайсковай акругі. 6 чэрвеня 1931 году.

№ 496148

Зусім сакрэтна

Памочнік начальніка А[собага] А[ддзелу] ОГПУ Мікалаеў

У ноч з 21 на 22 траўня гэтага года начальнік штаба 1-га батальёна 12-га стралковага палка 4-й стралковай дывізіі, ён жа ч[асова] в[ыконваючы] п[асаду] камроты 3-й Люцко Іван Філімонавіч і старшына 3-ці роты Дзёмін Аляксандр Іванавіч дэзертыравалі з часткі, якая знаходзіцца ў лягерах (раён Урэчча, БССР). Люцко І. Ф. нарадзіўся ў 1902 г., былы партызан, у 1921 г. паступіў добраахвотнікам у Чырвоную армію; скончыў Іванава-Вазьнясенскую пяхотную школу і выпушчаны малодшым камандзірам у 12-ы стралковы полк 4-й стралковай дывізіі; былы чалец ВКП(б), выключаны ў сакавіку месяцы гэтага году. Па атэстацыйных дадзеных камандаваньня за перыяд з 1925 да 1930 гг. [ён] характарызуецца як добры камандзір, які мае імкненьне да папаўненьня сваіх, як ваенных, так і палітычных ведаў; па высновах атэстацыі падлягаў пазачарговаму вылучэньню ў 1926 г. на пасаду камроты, а ў 1930 годзе памочнік камандзіра батальёна.

Аднак Люцко з лютага месяца 1929 г. атрымаў 6 вымоваў за заціск самакрытыкі ў роце, адарванасьць ад масаў і г. д. Акрамя таго, за некалькі дзён да яго ўцёкаў з часткі камдзівам 4-й [дывізіі] на Люцко было накладзена дысцыплінарнае спагнаньне (пяць сутак арышту) за п'янства з адкліканьнем з лягеру. Старшына 3-ці роты Дзёмін А. І. па атэстацыйных [дадзеных] характарызуецца як прыкладны малодшы камандзір.

Пазначаныя асобы пры ўцёках захапілі з сабой: два кулямёты сыстэмы "Дзегцярова"; пяць заражаных дыскаў; тры запасныя ствалы; шэсьць баявых спружын; чатырохлінейныя вінтоўкі з 2000 набояў. Зброя скрадзена Люцко і Дзёміным пры наступных абставінах. Уначы з 21 на 22 траўня гэтага году Люцко зьявіўся да днявальнага роты чырвонаармейца Тарлецкага А. І. (ён ахоўваў маёмасьць і зброю роты) і загадаў высьветліць наяўнасьць чырвонаармейцаў у намётах. На пярэчаньне Тарлецкага, што зброя застанецца без аховы, Люцко свой загад паўтарыў, заявіўшы, што "зброю ніхто не кране". Атрымаўшы "запатрабаваныя зьвесткі", Люцко пакінуў намёт, але ў хуткім часе прыйшоў старшына роты Дзёмін і прапанаваў чырвонаармейцу Тарлецкаму "схадзіць па ваду", што апошнім таксама было выканана. Тарлецкі, як у першым, так і ў другім выпадку, пасьля вяртаньня ў намёт (па выкананьні пералічаных загадаў) зьнікненьня зброі не заўважыў. Прынятымі мерамі агентурнага характару было высьветлена:
1. Дзёмін і Люцко ў ноч з 19 на 20 траўня гэтага году п'янствавалі ў доме селяніна-серадняка Жук Д. А., які жыве на хутары Крупенікі, што знаходзіцца ў недалёкай адлегласьці ад разьмяшчэньня лягеру 4-га стралковага палка.
2. Увечары 20 траўня Дзёмін і Люцко зноў вярнуліся на хутар Крупенікі ў дом таго ж селяніна Жук Д. А. і прабылі ў апошняга да раніцы 21 траўня.
3. 22 траўня Люцко і Дзёмін праходзілі ў шынялях, узброеныя вінтоўкамі, каля Замочкаўскага лесу, што паблізу хутара Крупенікі.
На падставе наяўных дадзеных арыштаваныя Жук Д. А. і яго сыны Іван і Канстанцін.

Сьледзтва выявіла наяўнасьць арганізаванай контррэвалюцыйнай працы Люцко, якая праводзілася ў прылеглых да лягеру селішчах (як да, так і пасьля ўцёкаў), па стварэньні контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі. Так, Жук К. Д. сьведчыць: "Пасьля гэтага Люцко запрасіў мяне ў гэтую арганізацыю. Я сьпярша не згаджаўся, а потым даў згоду. Тады Люцко абяцаў

мне даць наган. Асноўная мая праца ў арганізацыі — сабраць 10-15 чалавек для вядзеньня барацьбы супраць савецкай улады. У дачыненьні да таго, як узброіць арганізацыю, Люцко сказаў, што ён гэта сам зробіць. Для сустрэчы са мной абяцаў даслаць жанчыну. Дакладнага тэрміну не сказаў, а для пароля даў свой подпіс на шматку паперы (Люцко). Пасля гэтага яны сталі вербаваць майго брата, але ён адмовіўся. Гэта было 20-га траўня гэтага году ў 15 гадзін”. Арыштаваны Жук І. Д. сьведчыць: ”Брат сказаў мне, што яны, гэтыя вайскоўцы, падрыхтоўваюць налёт на ДОПР (Дом прымусовых працаў — “БР”); што ў 4-м стралковым палку значная колькасць кам[андуючага] складу (90%) варожа настроена супраць гэтай улады і парадкаў. У размове з братам Люцко казаў, што ў гэтую арганізацыю ўваходзіць з Урэчча Папко, які служыць у штабе пісарам”. Разам з гэтым, высьветлена, што арыштаваны Жук прымаў актыўны ўдзел у перавозцы скрадзенай зброі. Устаноўленая сувязь Люцко і Дзёміна з контррэвалюцыйным кулацтвам. ”Уначы мой брат Жук Канстанцін з тоўстым ваенным татарынам паехалі ўдваіх і забралі кулямёты, якім затым адвезьлі на хутар Поўстынь і схавалі ў раскулачанага кулака Пятра Калядкі. Па рэчы і кулямёты ў хмызьняк брат езьдзіў на бацькавым кані” (паказаньні Жук І. Д.).

З паказаньняў арыштаваных вайскоўцаў заслугоўваюць асаблівай увагі паказаньні камузвода таго ж палка Папко С. І., зь якіх відаць, што:
1. Уцёкі Люцко і Дзёміна былі ажыцьцёўлены па загадзя распрацаваным пляне.
2. Што Люцко ставіў задачу стварыць контррэвалюцыйную арганізацыю з мэтай ўзьняцьця збройнага паўстаньня з захопам гор[ада] Слуцка; у выпадку няўдачы плянаваўся пераход мяжы ў Польшчу.
3. Вярбоўка у арганізацыю вайскоўцаў праводзілася асабліва інтэнсіўна на працягу апошніх трох-чатырох тыдняў да ўцёкаў. Пры вярбоўцы ўжывалася спойваньне. Усяго па справе арыштаваныя 13 чалавек, завербаваных Люцко ў контррэвалюцыйную арганізацыю. Зь іх: вайскоўцаў 9 чалавек, прыватных асобаў чатыры чалавекі. Па тэлеграфным паведамленьні ПП ОГПУ БССР у выніку ажыцьцёўленых мерапрыемстваў 5 чэрвеня нарадам 13-й заставы 17-га памежатрада ў пяці кіламетрах ад польскай мяжы Люцко і Дзёмін былі выяўленыя. Дзёмін затрыманы, Люцко, які адстрэльваўся і ўцякаў, забіты. З паказаньняў Дзёміна высьвятляецца месцазнаходжаньне кулямётаў.

Упаўнаважаны 2 аддзяленьня А[собага] А[ддзелу] *ОГПУ* **Ключароў**

Рассылаецца: 1) Мянжынскаму; 2) Ягодзе; 3) Месінгу; 4) Еўдакімаву; 5) Варанцову; 6) Ольскаму; 7) Заліну; 8) Агранаву.

*Друкуецца ў перакладзе з рускай мовы паводле наступнай публікацыі: "Совершенно секретно": Лубянка — Сталину о положении в стране (1922 — 1934 гг.). Т. 9. — Масква, 2013, б. 527-529.*

## Спэцданясеньне А[собага] А[ддзелу] ОГПУ аб інцыдэнце з начальнікам штабу батальёна 12-га стралковага палка 4-й стралковай дывізіі БВА. 8 чэрвеня 1931 г.

№ 496232

Зусім сакрэтна

Па тэлефонным паведамленьні нам[есніка] ПП ОГПУ БССР тав. Гродзіс, Люцко быў знойдзены і забіты апер[атыўнай] групай А[собага] А[ддзелу], якой актыўна дапамагалі мясцовыя калгасьнікі.

Канфіскаваныя і вернутыя камандаваньню 12-га стралковага палка:

1. Два лёгкія кулямёты сыстэмы “Дзегцярова”.

2. Чатыры трохлінейныя вінтоўкі.

3. Дзьве гранаты.

4. Два рэвальверы сыстэмы “Наган”.

5. 1500 штук вінтовачных набояў.

Зброя была закапаная на хутары ў саўдзельніка Люцко, нейкага Качугі (арыштаваны). Арыштавана па справе 60 чалавек, зь іх 40 чалавек завербаваных Люцко і яго памагатых. Люцко пры аперацыі адстрэльваўся і кінуў гранату, якая не разарвалася. Пры забітым знойдзены ліст да жонкі.

Памочнік начальніка 2 аддзяленьня А[собага] А[ддзелу] *ОГПУ*
**Алёхін**

Рассылаецца:

1) Мянжынскаму; 2) Ягодзе; 3) Месінгу; 4) Еўдакімаву; 5) Варанцову; 6) Ольскаму; 7) Заліну.

Друкуецца ў перакладзе з рускай мовы паводле наступнай публікацыі: “Совершенно секретно”: Лубянка — Сталину о положении в стране (1922 — 1934 гг.). Т. 9. — Масква, 2013, б. 530.

# ПЕРАДРУК ПЕРШЫХ ДВУХ НУМАРОЎ ЧАСОПІСА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЦЭНТРУ “РУХ”. 1946 Г.

У першыя пасьляваенныя гады сярод беларускай палітычнай эміграцыі арганізацыйнай дзейнасьцю займаўся нелегальны “Беларускі Нацыянальны Цэнтар”. Ён быў заснаваны ў жніўні 1945-га ў Рэгенсбургу ў амэрыканскай акупацыйнай зоне Нямеччыны. БНЦ меў на мэце “мабілізаваньне і арганізаваньне ўсіх беларускіх нацыянальных сілаў для няўтомнага і бескампраміснага змаганьня супраць бальшавізму і ўсякіх іншых формаў паняволеньня беларускага народу”.*

Афіцыйна заяўлялася пра “надпартыйнасьць” гэтай структуры, але насамрэч яна знаходзілася пад уплывам нелегальнай Рады БНР. Калі апошняя ў канцы 1947 году легалізавалася, значэньне БНЦ зьменшылася. Але да таго часу Цэнтар адыгрываў значную ролю, спрабаваў стварыць імідж структуры, якая мела кантакты з Супрацівам на Бацькаўшчыне. Вядома, што прынамсі спробы іх падтрымліваць рабіліся.**

З вясны 1946 году БНЦ выдаваў нелегальны часопіс “Рух” (першы нумар быў надрукаваны Станіславам Станкевічам у амэрыканскай зоне акупацыі Нямеччыны, але ў мэтах кансьпірацыі было пазначана “Італія”***). Гэта выданьне на той час было адным з найлепшых сярод эміграцыйных перыёдыкаў. “Рух” зьмяшчаў прапагандысцка-ідэалагічныя тэксты, публіцыстыку, гістарычныя артыкулы, пісаў пра міжнародныя падзеі, пра сітуацыю на Бацькаўшчыне. Зьмешчаная ў першым нумары “Інструкцыя аб пашыраньні і карыстаньні часапісам” нагадвае падобны тэкст, які друкаваў падчас Другой сусьветнай вайны “Бюлетэнь Беларускай незалежніцкай партыі”. Можна меркаваць, што рабілася гэта адмыслова, быў пасыл для сяброў БНП: “Рух” працягвае традыцыі незалежнікаў, у тым ліку і іх друкаванага воргану.

У гэтым нумары “БР” робім передрук № 1 і № 2-3 часопіса “Рух” за 1946 год. Пазьней выйшлі яшчэ два нумары выданьня, № 4 ад студзеня 1947-га і № 5 ад чэрвеня 1948-га, пасьля чаго “Рух” спыніў сваё існаваньне.

**Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944 — 1956. Даведнік. — Мінск, 1999, б. 124-125.*

***Клявец Р. Украінскія кур’еры для сувязі з беларускай кансьпірацыяй у Баранавічах, 1947 год // Беларускі Рэзыстанс, 2009, № 2(7), б. 119-120.*

****Галяк Л. Успаміны. Кн. II. — ЗША, 1983, б. 57.*

RUCH
ORHAN CENTRALI PASIAREDNICTVA
BIEŁARUSKAHA VYZVOLNAHA RUCHU
№ 1. ITALIJA Kresavik 1946
ŠLACH DA VYZVALEŃNIA – TOLKI
CIERAZ PRACU I BARAĆBU!

<u>Instrukcyja ab pašyrańni i karystańni časapisam.</u>

Časapis pavinien być u pieršuju čarhu pašyrany siarod biełaruskaha hramadzkaha aktyvu – ludziej, jakija aktyŭna siańnia pracujuć siarod biełaruskaj emihracyi i zasłuhoŭvajuć na poŭny davier. Dalej časapis moža być pašyrany siarod i tych biełarusaŭ, jakija źjaŭlajucca siańnia pasyŭnymi ŭ hramadzkim žyćci, ale jość peŭnymi i česnymi ludźmi. Ad hetych apošnich časapis pośle pračytańnia pavinien być uziaty nazad. Treba mocna vyścierahacca, kab časapis nia trapiŭ u nieadpaviednyja ruki roznaha rodu svaich ci čužych pravakataraŭ. Kažny, chto raspaŭsiudžvaje časapis, pavinien u pamiaci viesci ŭlik atrymaŭšych jaho asob, kab viedać, na kolki achopleny im naš hramadzki aktyŭ. Pry hetym treba trymacca nastupnych pravilaŭ:

1. Pieradajučy časapis inšamu, nikoli nie havary, ad kaho jon atrymany. U vypadku kaniečnaj patreby padavaj zusim inšyja, ale nie praŭdzivyja krynicy, z jakich časapis pachodzić.
2. Pieradavaj časapis inšym tolki "u čatyry vočy" biaz śviedkaŭ.
3. Materjał z časapisu šyroka vykarystoŭvaj u hutarkach z inšymi biełarusami.

<u>UVAHA</u>: Z pryčynaŭ techničnaha charaktaru pieršy numar hetaha časapisu vychodzić łacinkaj. U dalejšym budziem staracca adnak vydavać časapis kirylicaj.

- 1 -

Aleś Kryha

NA NOVYM ETAPIE BARAĆBY.

Biełaruski narod na šlachu svajej niaŭpynnaj baraćby za volnaje i niezaležnaje isnavańnie i prava žyć čałaviečym žyćciom bies čužackaje ziciski pieražyvaje siańnia najbolš ciažki momant, paraŭnańnia jakomu nia znojdzieš u dasiulešniaj našaj historyi. Apošniaja kryvavaja vajna pryniesła nam biezlič novych kryvavych achviaraŭ i kałasalnaje źniščeńnie našaha kraju. Jana, paśla karotkaha, ale niazvyčajna ciažkaha ździeku niamieckaha fašyzmu, u svaim kančatkovym vyniku nia tolki zamacavała toj žudasny stan niavolnictva, fizyčnaha i maralnaha teroru, jaki jašče pierad hetym narod naš pieražyvaŭ "pad soncam" adzinaj u śviecie "samaj demakratyčnaj" stalinskaj kanstytucyi, ale jašče bolš zacisnuła akovy niavoli na šyi našaha narodu, poŭna i biesšaboronna kinuła našuju Baćkaŭščynu na nialudzki ździek balšavickaha čyrvonaha fašyzmu.

U vyniku hetych padziejaŭ na šyrokich prastorach našaje Baćkaŭščyny źnoŭ lutuje razbojnicki balšavicka-maskoŭski najeźnik, a cełyja miljony našaha narodu razahnany siańnia pa nieabsiažnych prastorach Sibiru i paŭnočnych tundraŭ, ad Kamčatki až da Atlantyčnaha akijanu. Balšavicka-maskoŭski imperjalizm, rychtujučysia da ŭdaru suproć zachodnich demakracyjaŭ z metaju rasšyreńnia daŭno abiacanaj suśvietnaj praletarskaj revalucyi, pryhatoŭlaje na prastorach našaje Baćkaŭščyny tajavoje zapleča svajej ahresyi, niščačy i raśstrelivajučy zaŭziatyja niepakornyja zachopnickim planam Maskvy biełaruskija nacyjanalnyja siły i nasadžvajučy na ich miesca cełyja hordy zaŭralskich manhołaŭ, členaŭ paslušnych kryvavym despatam čyrvonaha Kramla.

Lubiačy volu biełaruski narod nikoli nie pahadžaŭsia z siłkom nakinutaj jamu niavolaj niezaležna ad taho, z jakoha boku jana nia išła. Usia historyja našaha nacyjanalna-palityčnaha adradžeńnia źjaŭlajecca adnačasna historyjaj niaŭpynnaj i samaachviarnaj baraćby za prava "ludźmi zvacca", za prava žyć i haspadaryć na svojskaj, zroščanaj kryvioj i potam našych dziadoŭ i pradziedaŭ, biełaruskaj ziamli. Narod naš nikoli nie škadavaŭ darahich achviaraŭ, pasyłaŭ najlepšych synoŭ svaich na muki i śmierć, kali tolki heta było patrebnym dla vialikaj spravy vyzvaleńnia. Biełaruskaja ziamla, a tak-ža i dalokija sibirskija tajhi i zapalarnyja [illegible] husta ŭsiejany mahiłami najlepšych baračbitoŭ za volu biełaruskaha narodu. Jany svaimi mukami i achviarnaj śmierciu dakazali pierad usim śvietam, što biełaruski narod nikoli nie pahodzicca z nakinutymi jamu łancuhami niavoli, što jon budzie biespierapynna zmahacca za svajo ščaście, za vyzvaleńnie ad niaprošanych čužackich najeźnikaŭ, za svaju dziaržaŭnuju niezaležnaść. I hetaje zmahańnie tady tolki moža spynicca, kali hetyja vialikija ideały našaha narodu buduć im zździejśnieny.

Taksama i siańnia biełaruski narod, choć zmučany i prybity vajnoju, što ŭsim svaim ciažaram prakaciłasia praz Biełaruś i pakryła jaje husta ruinami i papiališčami haradoŭ i sioł dy brackimi mahiłami pamardavanych jejnych synoŭ, nie zahnuŭ u biessili i pakory chrybta svajho pad udaram novaje, jašče horšaje niavoli. Na ŭsiej terytoryi Biełarusi razharajecca siańnia ŭpartaje zmahańnie suproć niaprošanych stalinskich

"vyzvaleńnia", suprać tych biazdziešnych kryŭdaŭ i niačuvanaha ździeku, jakija "adčuvaŭ" jany bielaruski narod: Kali-b pahadzicca z tymi ŭmovami žyćcia, jakija zapanavali siońnia na Biełarusi, heta značyła-b pahadzicca z likvidacyjaj usiaho narodu i jaho pavolnym kanańniem u ściełym značeńni hetaha słova. Vod čamu zbrojnaje zmahańnie biełaruskaha narodu suproć balševizmu, jakoje ŭściaž pavialičvajecca z niabačnaj siłaj, źjaŭlajecca najvialikšym i nieabchodnym aktam samaabarony, jość zmahańniem najbolš bieskampramisnym, adstupleńnia ad jakoha niama i być nia moža.

U hetym vialikim zmahańni za svajo vyzvaleńnie narod naš nie źjaŭlajecca adzinokim. Uva ŭsich tych krainach, dzie lutuje siońnia kryvavy teror čyrvonaha fašyzmu, nadymajecca ahulnanarodnaja chvala baraćby. U nieprachodnych lasoch Biełarusi, na šyrokich stepach Ukrainy, na raŭninach Polščy, u horach Juhasłavii, pa ŭsioj Prybałtycy i ŭsiudy tam, dzie tolki stupiła naha Čynhis-Chana XX vieku, razharajecca pažar nacyjanalnych revalucyjaŭ suproć azijackaha despatyzmu. Supolny los i adnolkavyja imknieńni złučyli siońnia šmatlikija narody uschodniaje i siaredniaje Eŭropy ŭ adzin mahutny front baraćby suproć balševizmu za poŭnaje vyzvaleńnie kožnaha z ich. Hetaja kaardynacyja dziejnaści i zmahańnia i vypłyvajučaja adsiul nieabchodnaja patrebnaść padparadkavańnia ahulnym metam vyzvaleńnia ŭsich tych spornych prablemaŭ i intaresaŭ, jakija mohuć raźnić paasobnyja narody, u svaim vyniku tolki ŭzmocniać supolny nastup suproć voraha i pryśpiešać pieramohu nad im. Dziela hetaha i my mocna stajim na hruncie ŭsiakaha ščyraha, abapiortaha na šyrokaj pašanie suverennych pravoŭ kožnaha narodu i jaho nacyjanalnaj hodnaści, zbližeńnia i supracoŭnictva z usimi našymi susiedziami i inšymi narodami, što zmahajucca suproć balševizmu za svajo vyzvaleńnie.

Balševickaja Maskva što raz vyraźniej zdradžvaje svaje imperyjalistyčnyja plany i pakazvaje pierad narodami śvietu svoj sapraŭdny tvar. Balševizm, jaki apirajecca na idealahičnym pryncypie suśvietnaj praletarskaj revalucyi i poŭnaj dyktatury balševickaj partyi, jaki, choć dla prapahandnych metaŭ vychvalaje saviecki lad, jak "samy demakratyčny" u śviecie, a ŭ sapraŭdnaści źjaŭlajecca najbolš zaciatym voraham usiakaha demakratyzmu, jaki aficyjalna vyznaje i z zialeznaj kansekvencyjaj pravodzić u žyćcio systemu strašnaha teroru i fizyčnaha vyniščeńnia ŭsich tych, što inakš dumajuć, čym sami voždy balševickaja partyja, nikoli nia moža znajści na praŭdzivaje, abapiortaje na supolnym daviery supracoŭnictva z demakracyjami, pamimo navat dobraje voli i staraŭniaŭ hetych apošnich.

Balševizm lubić rabić časta navat supiarečnyja ŭ svajoj asnovie praktyčnyja chody, jon robić nia tolki nastupleńni, ale i adstupleńni, kali jamu heta patrebna na dadzienym etapie, ale nikoli nie vyrakaŭsia i nia moža vyračysia svaich asnaŭnych pryncypaŭ, na jakich jon bazujecca. Hetak kali padčas apošniaj vajny byŭ mocna zahrožany Saviecki Sajuz i kali za ŭsiakuju canu patrebnaje było vajennaje supracoŭnictva z zachodnimi demakracyjami i pomač hetych apošnich, to balševiki z čysta taktyčnych mierkavańniaŭ lohka zhadzilisia na daloka iduččyja ŭstupki, byccam adrakalisia ad svaich planaŭ suśvietnaje revalucyi i navat raspuścili jaje mižnarodny bajavy štab – Kominterń. Ale jak tolki vorah byŭ kančalna razbity i hetaja pahroza dla Savieckaha Sajuzu minuła, to adrazu balševiki paviarnuli svaju liniju na cełych 180 hradusaŭ u advarotnym kirunku. I choć Kominterna i siońnia aficyjalna nia isnuje,

- 3 -

choć balšaviki byccam i supracoŭničajuć na mižnarodnym hrunćie z demakracyjami, to ničak z poŭnaj kanssekvencyjaj pravodziać na ŭsim śviecie svaju padziemnuju padryŭnuju rabotu. Balšavickaja hidra ŭsimi sposabami staraješca prałazić uva ŭsie krainy śvietu, chitra vykarystoŭvajučy roznyja nacyjanalnyja, sacyjalnyja, navat relihijnyja i ŭsiakija inšyja supiarečnaści, vystupajučy ŭ fałšyvaj roli abaronnika zbiadnie-łych i pakryŭdžanych, kab usiudy, dzie tolki možna, siejać niezadavaleńnie z isnujučaha pałažeńnia i zavajoŭvać sabie takim sposabam sympatyi i ŭpłyvy. Balšavizm nie pierabiraje u nijakich srodkach, spraŭdžvaje dasłoŭna ŭsiakija sposaby, choćby najbolš abidnyja i supiarečnyja z elementarnymi asnovami ludzkoje maralnaści i etyki, jakija tolki viaduć da ździejśnieńnia jahonych złačynnych metaŭ. A hetymi metami jość – cieraz suśvietnuju pralietarskuju revalucyju nanieści apošni ŭdar usiamu demakratyčnamu śvietu, kab na jaho razvalinach ustanavić dyktaturu čyrvonaha balšavickaha fašyzmu.

Dzieła hetaha pavoli nastupaje apamiatańnie i zrazumieńnie siarod usich tych, što paviery li sałodkim słovam balšavickaje prapahandy, jak i siarod tych, što vieryli ŭ mahčymaść raźviazańnia dyplamatyčnym šlacham usich supiarečnaściaŭ z balšavickaju Maskvoju. Takim čynam što raz bolš pavialičvajucca siły ŭ łahiery vajujučym suproć balšavickaj tyranii i što raz bolš pamianšajecca lik jaje sapraŭdnych ci taktyčnych sajuźnikaŭ. Jašče tak niadaŭna zamoŭkli apošnija vystrały kryvavaj šaścilietniaj vajny, raźdźmuchanaj imperyjalistyčnym i varožym demakratyčnamu śvietu niamieckim fašyzmam. A ŭžo siańnia z šalonaj chutkaściu paŭstajuć i zavastrajucca što raz novyja nieparazumieńni i kanflikty, jakija nijakim čynam nia ŭdasca źlikvidavać, pakul pobač iz sapraŭdnymi demakracyjami budzie isnavać nia mienš ahresyŭny i varožy im čyrvony stalinski fašyzm. Usio pramaŭlaje za tym, što baraćba suproć balšavizmu paniavolenych im narodaŭ budzie ŭściaž razhortvacca i achoplivać svaim połymiem što raz novyja krainy, jakija apynulisia ci jašče apynucca pad vaładańniem ci zabojčymi ŭpłyvami zachopnickaj Maskvy. I hetaja baraćba moža zakončycca tolki i vyklučna poŭnaj pieramohaj voli nad tyranijaj, praŭdy nad fałšam i niespraviadlivaściu.

Ale kožnaja pieramoha tolki tady moža być realnym faktam, kali baraćba za jaje achopić usie žyvyja siły naroda. I tolki toj narod moža spadziavacca ad jaje ździejśnieńnia svaich metaŭ, katory sam voźmie aktyŭny ŭdzieł u baraćbie, nie ahladajučysia na druhich. Kožny narod tolki sam sabie moža zavajavać vyzvaleńnie, bo pry jaho pasyŭnaści ahulnaja chvala baraćby projdzie mima jaho abo kinie jaho ŭ novuju niavolu.

Novaja balšavickaja "turma narodaŭ", hetaja najvialikšaja hańba dvaccataha vieku, razvalicca pad mahutnym i zhodnym udaram usich narodaŭ, jakim balšavizm siłkom nakinuŭ ci imkniecca nakinuć svaje zabojčyja akovy. Dyk nie pavinna być nivodnaha z pasiarod nas, chto-by ŭ hety ciažki, ale tak adkazny i mnoha abiacajučy mament staraŭsia stać u baku, bajučysia narażać na niebiaśpieku svaje sobskaje isnavańnie. Usie žyvyja siły naroda, usie hordyja patomki hordych Kryvičoŭ pavinny siańnia zadzinočycca dla pracy i zmahańnia za volnaść i niezaležnaść našaj Baćkaŭščyny!

- 4 -

Lavon Hleb

*Nie spačemsia, a pieramožam*

Siońniašniaja palityčnaja sapraŭdnaść, u jakoj apynuŭsia kryvicki (biełaruski) narod, zmušaje nas zrabić acenku našaha pałažeńnia, rashladziecca ŭ sučasnych padziejach, kab vyraźniej bačyć perspektyvy budučyni. Toj fakt, što i paśla druhoj vajny my nie zdabyli niezaležnaści Kryvii (Biełarusi), nie pavinien aceńvacca, jak pasłablieńnie kryvickaha ruchu, ci jak jahony spad. Siahońnia vytvaryłasia takaja mižnarodnaja abstanoŭka, pry jakoj navat tyja narody, jakija mieli pierad hetaj vajnoj svaju dziaržaŭnuju niezaležnaść, ciapier jaje stracili. Nie pavinna taksama deprymujuča dziejać na nas i siońniašniaje raźbićcio i rasciarušańnie kryvickich siłaŭ. Heta niezaležnaje ad nas źjavišča, jakoje pieražyvajem nia tolki my, ale i mnohija inšyja narody.. Siły našyja iznoŭ źbirajucca i rastuć. Naadvarot, my nie pamylimsia, kali skažam, što siahońnia jakraz bolš, jak kali pierad hetym, naš narod zjadnany adnaj dumkaj i imknieńniem – skinuć jarmo maskoŭska- balšavickaha fašyzmu i stacca haspadarom na svajoj ziamli. Siahońnia, bolš jak kali pierad hetym, ideał niezaležnaści Kryvii jaśnieje pierad kryvickim narodam, bo siahońnia jakraz hety ideał znachodzicca ŭ vobmiršy zmahańnia dvuch idejaŭ – – idei svabody čałavieka i narodaŭ i idei tatalizmu. Źniščeńnie hitleraŭskaha režymu – heta tolki pačatak hetaha zmahańnia. Jano niaŭchilna paciahnie za saboj dalejšyja kalizii, jakija ŭžo siańnia na našych vačoch marjavajuć. Mir, jaki siańnia my majem, źjaŭlajecca tolki časovaj pieradyškaj, časovym pierapynkam hetych dvuch idejaŭ. Niełha ŭjavić sabie pahadnieńnia hetych idejaŭ, jak niełha pahadzić śviatła i ciemry. Niełha ŭjavić sabie, kab balšavizm moh vytrvacca ŭ kancercie demakracyi, paskolki jahonaja palityčna-ideałahičnaja tendencyja dyjametralna supiarečnaja apošniaj. Tamu pytańnie dziaržaŭnaj niezaležnaści Kryvii znachodzicca siahońnia ŭ planie mižnarodnaje prablemy niezaležnaści paniavolenych narodaŭ. Heta vonkavyja premisii siońniašniaha našaha pałažeńnia. Niezaležna ad ich my musim jasna zdavać sabie spravu i z unutranych premisijaŭ našaha vyzvolna-nacyjanalnaha ruchu, my musim uśviedamić jahony histaryčny napramak i mahčymaści dalejšaje histaryčnaje dynamiki jaho na siońniašnim etapie. My nie pavinny zabyvacca ab permanentnaj nacyjanalnaj revalucyi na abšarach byłoje Rasiei, zavieršeńnie jakoj u 1917 hodzie spynili časova balšaviki. U hetym histaryčnym maštabie my pavinny rashladać kryvicki vyzvolna-nacyjanalny ruch. Jon nie źjaŭlajecca adzinočnym źjaviščam. Takim čynam, i ŭ mižnarodnym planie sučasnaha ŭkładu palityčnych siłaŭ i ŭ planie histaryčnym jon źviazany z hłybiejšymi ideina-filazafičnymi formułami. Rashledzić linii našaha ruchu ŭ ramkach hetych ahulnych formułaŭ, kab pabačyć jaśniej jahonyja perspektyvy, i ŭvachodzić u zadańnie hetaha artykułu.

II.

Kryvicki nacyjanalna-vyzvolny ruch raźvivaŭsia ŭ umovach taje histaryčnaje sapraŭdnaści, jakuju stvaryŭ rasiejski imperyjalizm na šmatnacyjanalnym prastory, padpaŭšym pad jahonuju ekspansyju. Zachoplenaja Rasiejaj, paśla padziełu Rečypaspalitaj, Kryvija apynułasia ŭ ciskoch hetaha imperyjalizmu. Razam z inšymi narodami kryvicki narod pačaŭ pieražyvać ciažkuju sacyjalna-nacyjanalnuju i palityčnuju niavolu, jakuju nakinuli jamu maskoŭskija rabaŭ-

niki. "Sobiratielnica russkich ziemiel", vykarystoŭvajučy relihijnyja i inšyja momenty našaha žyćcia, imknułasia źnivelavać nacyjanalna naš kraj, pravodziačy rusyfikacyju praz carkvu, škołu, administracyju i h.d. Ale hetyja imknieńni uzmacnieŭšaha imperyjalistyčnaha kolosa na Uschodzie Eŭropy nie ŭdalisia. Namahańni rasiejskaha ŭradu nie mahli padarvać mocnych historyčnych karańnioŭ Kryvii, jakija ciahnuli žyćcia-soki z zusim inšaj hleby. I choć u hetuju novuju pałosu svajoj historyi ŭvajšła Kryvija z adžyvaŭšymi svoj viek "vianuŭšymi" hramadzkimi viarchami, hetyja mocnyja karańni staroj Kryvii puścili maładyja parastki, jakija praroščyli bujny rost. Chutka na źmienu hetym "viarcham" vyjšła kryvickaje sialanstva, i kinutyja ŭ jaho stychiju epihonami staroj Kryvii iskry rasharelisia chutka ŭ vialikaje połymia: Vychodziŭšaja ŭ mahiłu adna sacyjalna-hramadzkaja farmacyja pieradała spadčynu staroj Kryvii ŭ ruki tajе sacyjalna-hramadzkaje farmacyi, jakaja ciapier zajmała jaje miesca – u ruki sialanstva. Kryvicki embryjon, pierakinuŭšysia z adnaje sacyjalna-hramadzkaje chvali na druhuju, chutka raście, znachodzić śviežuju hlebu dla svajho rostu. Ale treba było peŭnaha času, kab sialanstva, skavanaje jašče pa rukach i nahach akovami sacyjalna-palityčnaha ŭcisku, pierarasło z hramadzkaha padnajožka ŭ mocnuju arnovu kryvickaje nacyi. Ŭ momantu revalucyi 1905 hodu ŭ b. carskaj Rasiei jano ŭžo prychodzić ŭdaśpiełym sacyjalna i nacyjanalna. Kryvicki ruch pieratvarajecca ŭ masavy narodny ruch, niasučy na svaich chvalach užo jasnyja palityčna-nacyjanalnyja łozunhi. Ale jak kožny masavy narodny ruch, jon prachodzić pieršapačatkovuju stadyju idealahičnaj fermentacyi, kali jašče ciažka znajści jasnyja palityčnyja ŭstanoŭki. Na haračych chvalach narastajučaha narodnaha pryłivu pačynaje daśpiavać i krystalizavacca Kryvickaja palityčnaja dumka. Pavoli z niajasnych imknieńniaŭ zarysoŭvajucca kontury palityčnych farmulirovak. Jany chutka znachodziać svajo zaviaršeńnie, kali ŭ pažary paślavajennaje razruchi i revalucyi kryvicki narod praciahvaje svaju ruku pa palityčnuju ŭładu.

U akcie 25-ha sakavika 1918 hodu kryvicki nacyjanalna-vyzvolny ruch znajšoŭ svoj kančatkovy punkt palityčnaha daśpiavańnia. Kryvicki narod skinuŭ z siabie jarmo rasiejskaha imperyjalizmu, nakinutaje jamu ŭ kancy 18 stalećcia. U "Treciaj Ŭstaŭnoj Hramacie Biełaruskaj Narodnaj Respubliki" 25-ha sakavika 1918 hodu była histaryčna zadakumentavana vola kryvickaha narodu žyć samastojnym i niezaležnym dziaržaŭnym žyćciom. "Hod tamu nazad, havaryłasia ŭ hetaj Hramacie, narody Biełarusi, razam z narodami Rasiei, skinuli jarmo rasiejskaha caryzmu, jakoje najciažej z usich prydušyła Biełaruś, nia pytajučysia narodu, jon kinuŭ naš kraj u pažar vajny jakaja dašczentu zrujnavała harady i vioski biełaruskija. Ciapier my, Rada B.N.R., skidajem z rodnaha kraju apošniaje jarmo dziaržaŭnaj zaležnaści, jakaja była nakinuta rasiejskim caryzmam na naš volny i niezaležny kraj!" Hetym samym załažaja Kryvija praciahvała praz vieki ruku ŭ naŭjuju słaŭnuju minuŭščynu, šukajučy tam mocnaj apory dla svajej adrodžanaj dziaržaŭnaści. Novaja ruń vyrastała na staroj nacyjanalnaj hlebie. Novyja śviežyja siły narodu vyjšli na histaryčnuju scenu z usim svaim revalucyjnym impetam u toj mament, kali ŭ b. Rasiei zaśpieŭ čas sacyjalnaje i nacyjanalnaje revalucyi. Na praciahu niekalkich miesiacaŭ maładaja Kryvickaja Narodnaja Respublika ŭvachodzić u stroj in-

šych dziaržavaŭ, prajaŭlaje aktyŭnaść na mižnarodnaj arenie; a adnačasova pačynaje pieršyja bai za svajo isnavańnie. U hetych pieršych bajoch kryvicki narod vystupaje ŭžo, jak nacyjanalna i palityčna sfarmavanaja calaść, z jakoj musiać ličycca našyja vorahi. Adradžeńnie kryvickaj dziaržaŭnaści stanovicca nia tolki idealam, ale dakazanym faktam. Mimo jaho nia mohuć prajści ŭžo i balšaviki. Jany ŭžo zmušany iści pierad im na ŭstupki.

III.

Razhladajučy pryčyny ŭpadku Kryvickaj Narodnaj Respubliki, my pavinny źviarnuć halоŭnuju ŭvahu pieradusim na tuju historyčna skłaŭšujusia palityčnuju i duchovuju atmasferu, jakaja vyvieła da zachopu ŭ b. Rasiei ŭlady balšavikami. Hetuju ŭladu balšaviki zmahli zachapić u toj haračy čas nadta lohka. Chutka narod pabačyŭ tuju trahedyju, da jakoj jon dakaciŭsia ŭ mamant revalucyjnaha ŭzdymu. Pasla karotkaha peryjadu revalucyjnaha šału, balšavickaja partyja pačała pravodzić u žyćcio svaje teoryi pabudovy kamunistyčnaha hramadztva. I tut vyjavilasia jaje antynarodnaje abličča, jakoje maje kožnaja dyktatura. Pasla NEP'u prychodzić žudasnaja para totalistyčnaha balšavickaha režymu, pry jakim užo kančatkova byli pachavany ŭsie zavajovy narodnaje revalucyi. Balšavizm usio bolš i bolš adychodziŭ ad svaich pieršapačatkavych idealahičnych ustanovak, zdavaŭ u archiŭ revalucyi ŭsie pryhožyja lozunhi i pieratvaryŭsia ŭ novuju formu rasiejskaha imperjalizmu, zachavanaha ad svajoj niaminučaj śmierci systemaj uviedzienaha dziaržaŭnaha kapitalizmu i kryvavaha teroru. Balšaviki dla svajoj systemy znajšli poŭnaje apiryšča ŭ ahranych i psychičnych asablivaściach rasiejskaha narodu, elementy dla svajho prarastańnia bo jakraz rasiejski narod nieražyvaŭ adviečnuju trahedyju carskaje tyranii i jana adbiłasia na jaho psychicy. Prystasoŭvajučysia da zusim čužoj hleby ahrarnaje krainy, balšavizm nia tolki adyjšoŭ ad svajho pieršapačatkavaha vučeńnia, ale i ŭvabraŭ usie duchovyja asablivaści rasiejskaje hleby, vyradžajučysia ŭ čysta rasiejskaje źjavišča. Prykryvajučysia roznaj arhumentacyjaj, balšaviki pačali vostry kurs centralistyčnaj palityki, tvoračy na miescy carskaj Rasiei Saviecki Sajuz i padtasoŭvajučy pad jaho stary maskoŭski imperyjalizm, pierafarbavany tolki na čyrvony kolar. Chutka balšaviki zdymajuć z svajho tvaru i hety velum, bo pierakonvajucca, što roznaści "savieckaha narodu" siarod daśpieŭšych nacyjanalna i palityčna narodaŭ źjaŭlajecca ničym inšym, jak pustym hukam. Ciapier jany adkryta pryznajuć siabie spadkajemcami rasiejskaha imperyjalizmu. Zalatyja pahony, rasiejskaja cyhanščyna pa radyjo, "vossojedinienije" vunijataŭ z pravaslaŭjem, adkryćcio manastyroŭ /1/, i inšyja mierapryjemstvy partyi majuć padahravać hety histaryčny trup. Partyja Lenina-Stalina padbiraje z nadzvyčajnaj klapatlivaściu ŭsie akrušyny pamieščycka-carskaj i buržuaznaj kultury, kab stvaryć vid jednaści "ruskoho" narodu. Ale hetyja namahańni iduć u razrez z nacyjanalnymi siłami paniavolenych balšavickaj Maskvoj narodaŭ. Jany zastajucca biez realnaha efektu. I tamu balšavizm chapajecca kryvavych metadaŭ u adnosinach da hetych narodaŭ. Stalin pieraścihnuŭ užo svajho duchovaha praddziednika Ivana Hroznaha. Jon pierajšoŭ da madernych metadaŭ z amerykanskim razmacham, metadaŭ, jakija mohuć zraŭnacca chiba z stasavanymi adna-

 

– 7 –

krocnym duchowa Stalinu druhim "zbavicielem" narodaŭ – Hitleram. Ciapier na abšarach savieckaje turmy narodaŭ pravodzicca niebačanaja dasiul jašče ŭ historyi pieramaleńnie narodaŭ. Robicca heta z metaj zdušyć nacyjalna-nacyjanalnuju revalucyju, jakaja padmyvaje asnovu balšavickaha panavańnia. Hetkim čynam, balšavizm pieraniaŭ rolu vajaŭničaha abaroncy rasiejskaha imperyjalizmu. Jak tatalitarnaja systema, jon musić chapicca za hetuju ŭlaścivuju ŭžo formu tyranii, biez jakoj jon nia ŭtrymaŭsia-b nia tolki na terytoryi Savieckaha Sajuzu, ale i ŭ samoj Rasiei. Balšavizm strymaŭ naturalny praces nacyjanalnaha hnićcia Rasiejskaj Imperyi, jaki pačaŭsia ŭ 19 stalećci. U momant revalucyi, kali pačalosia dziaržaŭnaje budaŭnictva paniavolenych carskaj Rasiejaj narodaŭ, jon adrazu zdefarmavaŭ jahonyja ruski, nakiroŭvajučy chvali nacyjanalnaje revalucyi ŭ apartunistyčnym napramku h.zv. nacyjanalnych kulturaŭ. Ale impet i histaryčny razmach hetych nacyjanalnych silaŭ balšavickaja partyja nie mahla ŭžo nijakim čynam strymać. Biasupynnaje zmahańnie z decentralistyčnaj hravitacyjaj hetych silaŭ čyrvonaj nitkaj praniźvaje ŭsiu balšavickuju praktyku na praciahu ŭsiaho isnavańnia balšavizmu. Apošnija nieprapryjemstvy balšavikoŭ u dačynieńni da paniavolenych imi narodaŭ śviedčać, što sila nacyjanalnych ruchaŭ macniej ich terytoryjaŭ. Nia strymać im naturalnaha histaryčnaha pracesu. Bolš čverci vieku balšavicki čyrvony fašyzm zmahajecca z vyzvolna-nacyjanalnymi ruchami paniavolenych im narodaŭ, a sila ich nia mienšaje, a, naadvarot, pavialičvajecca.

Nam ciapier nia budzie dziŭnym, čamu jakraz balšaviki, jakija ŭ pieršyja dni revalucyi mieli vypisanyja na svaich ściahoch lozunhi svabody i samavyznačeńnia narodaŭ, pieršyja-ž stali na pieraškodzie ŭ ich ažyćciaŭleńni. Balšaviki razahnali silaj Usiebiełaruski Kanhres, kab zdušyć inicyjatyvu i volu kryvickaha narodu da samastojnaha, niezaležnaha žyćcia. Imknučysia śviarnuć kryvicki ruch u svoj bok, jany prabavali padtasavać ideał niezaležnaj kryvickaj dziaržavy hvałtam nakinutaj formaj Savieckaj Kryvii, jakaja nikoli nia jość – i nia była dziaržavaj kryvickaha narodu, a tolki formaj, pry dapamozie jakoj jany imknulisia śviarnuć kryvickija nacyjanalnyja siły ŭ balšavicka-maskoŭskaje ruslo. Pieradyška NEP'u skončyłasia chutka dla kryvickaha narodu, tak jak i dla inšych paniavolenych narodaŭ. Usio, što było im stvorana ŭ halinie kulturnaha i narodnaha budaŭnictva, maskoŭski balšavizm vyryvaŭ z karenniem. Epocha stalinskich piacihodak supadaje z raspačaćciem šorstkaj raspravy z h.zv. nacyjanalnymi kulturami. Balšaviki zamiest sapraŭdy nacyjanalnych pa źmiestu kulturaŭ dajuć narodam formułu kultury "nacyjanalnaj pa formie i sacyjalistyčnaj pa źmiestu", inakš kažučy rasiejščyny.

IV.

Źlikvidavaŭšy hvałtam Biełaruskuju Narodnuju Respubliku, balšaviki sprabavali ašukać kryvicki narod, padsoŭvajučy jamu na jaje miesca novy tvor – BSSR (Biełaruskuju Savieckuju Sacyjalistyčnuju Respubliku). Jak vyhladała i vyhladaje hetaja Biełaruskaja Respublika ŭ sapraŭdnaści, my dobra viedajem. BSSR nia mieła i nia maje nijakaha samastojnaha hołasu, jak dziaržava, choć joj, pavodle stalinskaj kanstytucyi, davałasia niby prava ažyćciaŭlać ułada "samastojna, zachoŭvajučy poŭnaściu svaje suverennyja pravy" /art. 13/, a navat "prava svabodnaha vychadu z SSSR"/art. 15/. Usie zapaŭnyja pastano-

– 5 –

vy byli i jość z kampetancyi Maskvy. Usie najvažniejšyja narkamaty (ziemlarobstva, finansaŭ, unutranych spraŭ, dziaržaŭnaje apieki, lohkaje pramysłovaści i inš.) źjaŭlajucca sajuzna-respublikanskimi. Inakš kažučy, jany tolki vykonvajuć toje, što zahadvaje Maskva. Narkamat abarony, zamiežnych spraŭ, zamiežnaha handlu, šlachoŭ znosin, suviazi, avijacyi, uzbrajeńnia nia było i niama zusim! Uvieś dziaržaŭny biudžet davajecca BSSR zhary z Maskvy. "Ab niesamastojnaści finansavaj palityki ŭradu BSSR i jahonaha narkamfinu śviedčyć užo chacia-b toj śmiechu varty fakt, što ŭrad BSSR nia maje prava navat pavysić zarabotnuju płatu jakoj-niebudź hrupie rabotnikaŭ ci intelihencyi". Usia administracyja BSSR musić vykonvać tolki zahady partyi, jakaja pravodziła ŭkazańni Maskvy. Na čale kožnaj ustanovy abo pradpryjemstva stajić u Savieckaj Kryvii, jak pravila, siabra balšavickaj partyi, jaki pravodzić liniju partyi. Uvieś dziaržaŭna-administracyjny aparat BSSR absadžany balšavikami, jakija musiać uzhadniać svaju dziejnaść z pastanovami partyjnych arhanizacyjaŭ. U ažyćciaŭleńni pastanovaŭ partyi dapamahaje ŭsiemahutnaja NKVD, jakoje maje ŭsiudy svaje ščupalcy. Jany pravodziać kantrolu ŭsich ustanoŭ i pradpryjemstvaŭ. "Pierad vorhanami NKVD dryžać i staršynia Viarchoŭnaha Savieta BSSR, i staršynia h.zv. Kryvickaha Ŭradu, i narodnyja kamisary, nia kažučy ŭžo ab kiraŭnikoch trestaŭ i bolš drobnych ustanovaŭ. Nie Kryvicki narod kiruje hetaj respublikaj, a balšavickaja partyja, jakaja vykonvaje zahady Maskvy.

Savieckuju Kryviju abviaścili balšaviki 1-ha studzienia 1919 hodu. I ad hetaha času pačynajecca biescerymonny torh balšavikoŭ kryvickimi ziemlami. U BSSR spačatku mieli ŭvachodzić usie kryvickija etnahrafičnyja ziemli. Ale ŭžo praz dva miesiacy paśla stvareńnia Savieckaj Kryvii balšaviki paličyli vyhodnym stvaryć mianavanuju Kryvicka-Litoŭskuju Savieckuju Respubliku, bo Maskva vyrašyła dalej pasoŭvacca na zachad. U hetuju respubliku ŭžo ŭvachodziła tolki častka kryvickich ziemlaŭ. 29 žniŭnia 1920 hodu Maskva ŭtvaryła novuju Kryvickuju Respubliku tolki z 6-ci paviataŭ byłoje Mienskaje hubernii z nasielnictvam u 1 200 000. 18-ha sakavika 1921 hodu ŭ Ryzie Maskva samavolna padzialiła Kryviju, addajučy zachodniuju častku jaje Polščy. I tolki kali Stalinu za dapamohu ŭ vajnie suproć Anhlii Hitler daŭ kavałak Polščy, balšaviki pačali razyhryvać kamedyju "vyzvaleńnia adzinakroŭnych bratoŭ". Jany zabrali tady navat i polskija etnahrafičnyja ziemli (Łomžynski paviet). Kali-ž paśla razhromu hitleraŭskaje Niamieččyny dajšło da ŭstanaŭleńnia polska-kryvickaj miažy, Maskva, nia pytajučysia navat "uradu" BSSR, praviała svajoj kryvavaj łapaj prostuju liniju, u vyniku čaho žadny kavałak kryvickaj ziamli adyjšoŭ da Polščy. A ciapier hetaja-ž Maskva pabuje "pierasiać" kryvičoŭ z Polščy. Usia ŭschodniaja Kryvija pałasoj u 100 km. šyrki była addadziena Rasiei. Tolki na ŭpornyja damahańni kavałački Viciebščyny, Mahiloŭščyny, Homielščyny byli dałučany da BSSR.

Ad 1928 h. balšaviki vypałaskivajuć kryvicki narod ad jaho lepšych pradstaŭnikoŭ. Z usich adkaznych stanoviščaŭ zvalniajucca kryvičy, a na ich miesca nasadžvajucca prysłanyja Maskvoj balšavickija čynoŭniki. Zvyš 1 500 000 kryvickich sialan całymi siemjami – z starymi, žančynami i dziećmi byli aryštavany, adarvany ad rodnych chataŭ i viosak i vyviezieny na haładnuju śmierć u tajhu i tundry chałodnaha Sibiru, dy haračyja pustyni Kazachstanu". Usia sapraŭdy kryvickija piśmieńniki, paety, vučonyja, nastaŭniki, mastaki, hramadzkija dziejačy byli zlikvidovany abo sasłany na pavolnuju śmierć. Prezydent Kryvickaj Aka-

- 9 -

demii Navuk praf. Ihnatoŭski, kab nie pieražyvać ździekaŭ balšavikoŭ, nakončyŭ žyćcio samahubstvam. Hetak-ža chacieŭ skončyć svajo žyćcio i paet J. Kupała. Chvala za chvalaj iduć aryšty pa kryvii.

Balšaviki razburyli ŭsio, što było stvorana kryvickim narodam, apahanili i źniščyli ŭsie jahonyja nacyjanalnyja śviatyni. Zamiest dziaržaŭnaje niezaležnaści, ab jakoj jany kryčać, dali jany kryvickamu narodu najhoršuju niavolu, jakaja tolki moža być na śviecie. Jany dali jamu kalhasnuju panščynu, pakuty na ssylcy i koncłahierach. Jany niasuć jamu poŭnaje źniščeńnie i nacyjanalnuju śmierć.

V.

Paniavoleńnie, u jakim apynuŭsia ciapier kryvicki narod, źjaŭlajecca najbolš ciažkim, u jakim jon kali-kolečy znachodziŭsia dasiul. Najbolš ciažkija ŭdary nanosić balšavizm u samyja padvaliny jahonaha bytu. Masavaja pierasialeńnie kryvičoŭ u hłyb Savieckaha Sajuzu i ŭ Polšču asłablaje jahonyja nacyjanalnyja siły. Adnak, z druhoha boku, ciapier składajecca takaja mižnarodnaja kanjunktura, pry jakoj my možam spadziavacca chutkaje pieramohi našych nacyjanalnych imknieńniaŭ. Ciapier kryvicki narod ukliučyŭsia ŭžo ŭ ahulnaje antybalšavickaje zmahańnie. Metaj hetaha zmahańnia narodaŭ źjaŭlajecca stvareńnie suverennych dziaržavaŭ na ruinach Savieckaha Sajuzu. Zmahańnie viadziecca za niezaležnaść i svabodu narodaŭ, za sapraŭdnuju demakracyju. Narody, jakija žyli pad balšavickaj dyktaturaj abo bližej stykajucca z joju, pabačyli, što tatalizm, u jakoj-by formie jon nia vystupaŭ, źjaŭlajecca śmiarotnym voraham ich svabody. Sam balšavizm, jak tatalistyčnaja systema, nosić u svaim nutry zarodki śmierci. Pakul Maskva adharodžvała ad śvietu ścianoj kitajskim muram, jana mahła jašče niejak chavać svaje złačynstvy za hetaj ahardžaj. Ciapier, choć hety mur i dalej isnuje, Maskva ŭsio ž mima svajej voli ŭciahnuta ŭ kruhavarot mižnarodnych dačynieńniaŭ. I tut, nia hledziačy na ŭsie namahańni, unikajuć supiarečnaści. Jašče tolki niadaŭna sciichli harmaty, a ŭžo ŭ śviecie panuje stolki niazhody, što možna ŭžo havaryć ab nastupnaj vajnie. U vajnie, jakaja viałasia byccam za svabodu narodaŭ, pieramoh pakul što balšavizm. Hitleraŭski fašyzm źniščany, ale čyrvony fašyzm nia tolki zachavaŭ svajo dasiulešniaje stanovišča, ale i pašyryŭ svaju ekspansiju. Siaredniaja Eŭropa znachodzicca ŭ arbicie jahonych palityčnych upłyvaŭ. Nie ciapier-zaŭtra balšavicki imperyjalizm padymie mieč suproć svaich ciapierašnich sajuźnikaŭ. Usio bolš i bolš vočy zachodnich demakracyjaŭ raščyniajucca na ciapierašniuju palityčnuju sapraŭdnaść. Jany na kožnym kroku pierakonvajucca ŭ ašukanstvie balšavikoŭ. Jany ŭsio bolš i bolš pierakonvajucca ŭ niemahčymaści pahadnieńnia dvuch dyjametralna supiarečnych pačatkaŭ. Supiarečnaści ŭściaž narastajuć i buduć narastać dalej. Da idejnych supiarečnaściaŭ dałučajucca haspadarčyja supiarečnaści, jakija, urešcie, pryviaduć śviet da niejkaje alternatyvy. Jak vyraščacca hetyja supiarečnaści, my nia budziem ciapier razvažać. Jany mohuć vyraščycca zusim inakš, jak heta my ciapier pradbačym. Adno jasna nam ciapier: jak-by nia pajšli dalej padziei, my budziem arjentavacca na svaje ŭłasnyja siły, viedajučy dobra, što naš vyzvolna-nacyjanalny ruch apirajecca na mocnych histaryčnych padstavach. Jak-by nia pajšli dalej pa-

dziei, my budziem ćvierda i niepachisna stajać na varcie svaich narodna-nacyjanalnych idealaŭ. Zmahańnie, jakoje viadzie siahońnia kryvicki narod, nie adasoblenaje. Jano ŭłučajecca ŭ ahulny front antybalšavickaha zmahańnia ŭsich narodaŭ Savieckaha Sajuzu. Partyzanskija armii hetych narodaŭ nanosiać siahońnia ŭdary pa supolnym voruhu. Nacyjanalnaja revalucyja naśpiavaje ciapier u nadzvyčaj chutkim tempie, kali źniščanaja pahroza hitleraŭskaje niavoli. Front zmahańnia z balšavizmam ciapier značna pašyryŭsia. U jaho ŭvachodziać i tyja narody, katoryja znachodziacca pad niepasrednaj pahrozaj z boku balšavickaje Maskvy. Hitleraŭskaja Niamieččyna taksama zmahałasia z balšavizmam. Ale metaj jaje zmahańnia była novaja niavola narodaŭ. Mety siańniašnaj baraćby jasnyja, heta baraćba paniavolenych narodaŭ za svaju svabodu i niezaležnaść. Čyrvona-maskoŭski fašyzm budzie źniščany tolki pry supolnym napružańni ŭsich narodnych siłaŭ. Tolki pry napružańni ŭsich siłaŭ kryvickaha narodu budzie zdabyta iznoŭ niezaležnaja Kryvija, u jakoj sam kryvicki narod budzie haspadarom svajho žyćcia. Tolki ŭ niezaležnaj i volnaj Kryvii narod naš zbuduje sabie ščaslivaje i volnaje žyćcio.

Tamu nikoli, pakul budzie žyć naš narod, nie zračemsia svaich narodnych idealaŭ niezaležnaści.

Nie zračemsia, a pieramožam!

ooooooooooooooooo

 

- 11 -

Jasep Karanieŭski

PAD HNIOTAM NIAMIECKAHA FAŠYZMU

Pałažeńnie biełaruskaha narodu pad kryvavym hniotam balšavikoŭ było na stolki ciažkim i biazvychodnym, što narod naš vitaŭ z radaściu i zadavaleńniem usiakija źmieny, idučyja z vonku, nie ŭhłyblajučysia ŭ toje, ci jany niasuć jamu vyzvaleńnie, ci źmianiajuć palonki, ci adnu niavolu zamianiajuć druhoj. Važnaj užo była sama źmiena, bo pry najhoršym novym pałažeńni absalutna ničoha nia było tracić, a zdabyć niešta choć u nievialikaj miery byli padstavy spadziavacca.

Dziela hetaha pačatak vajny ŭ 1939 h., a pieradusim pachod niemcaŭ na Ŭschod u červieni 1941 h. spatkaŭ naš narod z hłybokaj radaściu i nadziejaj. Biełaruskija palityčnyja dziejniki nia mieli nijakich iluzijaŭ što da planaŭ Niamieččyny na Uschodzie Eŭropy. Jany razumieli, što Hitleraŭskaja Niamieččyna pieradusim šukaje sabie "Lebensraum"u", abjektam jakoha josć i naša Baćkaŭščyna. Adnak pry źmienie sytuacyi i zaabsarbavańni niemcaŭ vajnoju, jany mieli nadzieju ŭratavać i zachavać usie tyja nacyjanalnyja siły, jakich nie paśpieli jašče źniščyć balšaviki, dy zachapiŭšy ŭ svaje ruki hramadzkaje žyćcio krainy, umacnicca i zarhanizavacca nacyjanalna. Byli padstavy dumać, što niemcy, zaniatyja niałohkaju dla ich vajnoju i zmahańniem z balšavizmam, nia buduć prynamsi ŭ vajenny peryjad pieraškadžać arhanizavańniu biełaruskaha hramadzkaha žyćcia, pahłybleńniu nacyjanalnaj śviadomaści, uzhadoŭvańniu nacyjanalnych kadraŭ, raźvićciu aśviety i nacyjanalnaje kultury. Hetyja plany mieli dla nas pieršaradnaje značeńnie, bo paśla doŭhaletniaha panavańnia balšavikoŭ, paśla šmatlikich čystak i likvidacyi biełaruskaj inteligencyi pad vidam "nacdemaŭščyny", "kułactva", "trackistych", roznaha rodu "fašystych", dy napaśledak razam "vorahaŭ narodu" biełaruski nacyjanalny aktyŭ byŭ u vialikaj miery źniščany i razahnany, a ŭzmocnienaja rusyfikacyja, kansekventna pravodžanaja balšavikami ci to pad pretekstam zmahańnia z nacyjanalnym biełaruskim separatyzmam, ci to likvidavańnia "štučnych barjer", jakimi biełaruskija "nacdemy" i "ahienty zamiežnaj intervencyi" staralisia addzialicca ad "vialikaha i samaha prahresyŭnaha ruskaha narodu", hłyboka zapuściła svaje karańni. Nacyjanalnaje ŭzmacnieńnie ŭ nutry było tady vialikim nakazam chviliny. Pry hetym siarod biełaruskich palityčnych kruhoŭ pieravažaŭ užo tady pahlad, što Niamieččyna ŭ kančalnym vyniku vajny budzie razbitaj, ale što razam z hetym ci niepasredna padla hetaha razvalicca i Saviecki Sajuz, što pavinna lažać u intaresach taksama jaho vypadkovych sajuźnikaŭ – Anhielščyny i Ameryki. Takim čynam treba było ličycca z vialikimi źmienami na Uschodzie Eŭropy, da jakich biełaruski narod pavinien być adpaviedna pryhatavany, kab ździejśnić svaje śviatyja ideały volnaj i niezaležnaj Biełarusi. Dziela hetaha ćviarozy palityčny rozum dyktavaŭ, što momant niamieckaj akupacyi treba naležna vykarystać dla ŭzmacnieńnia i zmabilizavańnia nacyjanalnych siłaŭ dla budučych padziejaŭ.

Pačatkovy pahlad, što niemcy, zaniatyja vajnoju, nia buduć u peryjad vajny pieraškadžać hramadzka-nacyjanalnamu nutranomu žyćciu narodaŭ zaniatych imi terytoryjaŭ,

- 12 -

nie spraŭdžałasia. Niemcy, nia hledziačy na vialikija vajennyja ciažkasci, adrazu pačali kansekventna padhatoŭlać Biełaruś pad svaju budučuju kaloniju. Dziela hetaha jany nia tolki nie dali mahčymaściaŭ tvaryć pavažniejšych i tryvałych nacyjanalnych zdabytkaŭ, ale navat pačali asłablać i pastupova niščyć usie tyja nacyjanalnyja siły, jakija mahli-b stać na pieraškodzie realizacyi ich planaŭ.

Z metaj asłablennia nacyjanalnych ruchaŭ paasobnych narodaŭ i raspaleńnia siarod ich niahasnučych sporaŭ i nieparazumieńniaŭ, niemcy šyroka i biezahladna pavieli palityku drableńnia i raździełaŭ etnahrafičnych terytoryjaŭ i nackoŭvańnia adnoj nacyjanalnaści suproć druhoj. Hetaja palityka "Devide et impera" najbolš jarka adbiłasia na Biełarusi. Aficyjalna vyznavanaj Biełaruśsiu była tolki terytoryja Hienieralnaha Kamisaryjatu Biełarusi iz stalicaju ŭ Miensku, jakaja abyjmała prybližna adnu treciuju častku ranniejšaha i taksama nia abyjmajučaha ŭsiaho našaha etnahrafičnaha prastoru BSSR. Tolki na hetaj nievialičkaj terytoryi aficyjalna dazvalałasia ŭ publičnym žyćci biełaruskaja mova, nižejšaja administracyja i školnictva; presa dy mahčymaj była minimalnaja kulturnaja praca, padparadkavana niamieckamu kantrolu. Časć Zachodniaje Biełarusi – Biełastoččyna, Horadzienščyna i Vaŭkavyščyna – była pryłučana niepasred-da niamieckaha Rajchu, dzie niemcy, zhodna svajho pryncypu, usciaž vykarystoŭvali polskuju mienšasć suproć biełaruskaje bolšasci. Miascovaja nižejšaja administracyja była absadžana palakami, pačatkovaje školnictva było pieravažna polskim, adnym słovam vyrazna paddzieržyvałasia palanizacyja biełaruskich ziemlaŭ, jakaja dla niemcaŭ nia była strašnaj z pryčyny małoha pracentu tut palakaŭ. Treba adznačyć, što i na terytoryi Hienieralnaha Kamisaryjatu Biełarusi niemcy ŭsciaž padbuchtorvali palakoŭ suproć biełarusaŭ, što im, treba z sumam pryznać, častkova ŭdavałasia, jak naprykład u Lidčynie. Tym bolš byli heta sumnyja źjaviščy, bo biełarusy nijakich padstavaŭ da hetaha nie davali, uvažajučy, što adnolkavaje pałažeńnie, jakoje spatkała tak nas, jak i palakaŭ, pavinna pabudzić abodva narody ŭ supolnaj baraćbie za vyzvaleńnie. Časć terytoryi Zachodniaj Biełarusi była dałučana da Hienieralnaha Kamisaryjatu Litvy. Siudy adyjšła nia tolki časć vilenskaje ziamli z horadam Vilniaju, jakuju ŭ 1939 h. balšaviki pieradali Lićvie, kab potym hetyja ziemli razam z usiaju Litvoju pryłučyć "dabravolna" da Savieckaha Sajuzu, ale jašče niekalki dalej lažačych na ŭschod paviataŭ (Ašmianski, Smarhonski, Astraviecki, Śvirski i inš.). Try paŭdzionnyja akruhi Zachodniaje Biełarusi (Bieraściejščyna, Kobrynščyna i Pinščyna) niemcy dałučyli da Hienieralnaha Kamisaryjatu Ukrainy, a z Uschodniaj Biełarusi, jakaja ŭvieś čas naležała da h. zv. vajennaje zony, zaprajektavanaje było pryłučeńnie da Ukrainy ŭsiaje Homielščyny i Mazyrščyny. Praŭda, kali viasnoju 1944 h. amal ŭsia Ukraina była iznoŭ zaniata balšavikami, za vykliučeńniem pryłučanych da jaje biełaruskich ziemlaŭ, niemcy tady aŭtamatyčna ich viarnuli Hienieralnamu Kamisaryjatu Biełarusi.

Bolšynia etnahrafičnaje terytoryi Biełarusi naležała ŭvieś čas da vajennaje zony (Militärgebiet), jakoj kirava-vajennaja administracyja. Ad pačatku da kanca niemcy tut pravodzili kansekventna rusyfikacyjnuju palityku. Usia pre-da była vyklučna amal rasiejskaj, pieravažała rasiejskaje školnictva, u bolšyni była rasiejskaja administracyja, aficyjalna vyznavałasia tolki rasiejskaja mova. Biełaruski

hramadski aktyŭ nasutykaŭsia na vialikija trudnaści i pieraśledavańnie, kali imknuŭsia supraćstavicca rusyfikacyjnaj akcyi. Rasiejski element, zasadžany tut raniej balšavikami ŭ jakaści roznych čynoŭnikaŭ, dy prybyŭšy siudy z paŭtoraj zaniatych balšavikami rasiejskich terytoryjaŭ, u pieršuju čarhu praleź u administracyju i paliciju i śviedama pamahaŭ niemcam u niščeńni bielarusaŭ, pryšyvajučy im kamunistyčny abo polski jarłyk. Rasiejcy, prajaŭlajučy poŭnuju lajalnaść da niemcaŭ i achvotna vykonvajučy ich zahady, skiravanyja suproć narodu, čaho zrazumieła nie mahli rabić bielarusy, ciešylisia poŭnym davieram z boku niamieckich kirujučych kolaŭ i rasčyščali takim sposabam hrunt dla budučaj "jedinoj i niedielimoj".

Užo hety šyroka stasavany metad niamieckaj palityki drableńnia i dzialeńnia etnahrafičnaje terytoryi i pravakacyjnaje raździmuchvańnie mižnacyjanalnych sporaŭ jasna pakazvaŭ, što Bielaruś, jak i inšyja krainy na Uschodzie Eŭropy, pavinna była stacca pośle hetych eksperymentaŭ tolki i vykliučna niamieckim "Lebensraŭmam".

Nia mienš vyrazna zarysavalisia hetyja plany niamieckich fašystych i ŭ palitycy na terytoryi Hieneralnaha Kamisaryjatu Bielarusi. Ab jakoj-niebudź aficyjalna dazvolenaj palityčnaj bielaruskaj pracy nia tolki nie mahło być movy, ale navat u haliňie kulturnaha i hramadzka-nacyjanalnaha žyćcia niemcy stasavali dalokaidučyja ahraničeńni, niepaniarna zvužajučy hramadzkaje i kulturnaje žyćcio kraju, i ustanavili ścisły kantrol usiaho taho, što było imi dazvolena. Heta prykładam było dazvolena tolki častkova škalnictva, siaredniaha škalnictva nia było zusim, kali nia brać pad uvahu niekalkich vučycielskich seminaryjaŭ, praktyčna nieabchodnych dla prybaŭleńnia nastaŭnickich kadraŭ dla čaz vajennych pačatkovych škoł, dy niekalkich ramieśnicka-prafesyjalnych škoł, jakija niemcy navat achvotna dazvalali, majučy na mecie prybaŭleńnie kvalifikavanych ramieśnikaŭ i rabotnikaŭ. Damahańni adčynieńnia bielaruskaha universytetu spatykalisia z nadniešlivymi admovami. Aficyjalnyja niamieckija dziejniki niadvuznačna zajaŭlali, što ŭzhadoŭvać bielaruskaj intelihencyi niama nijakaj patreby, bo pośle pieramožnaj vajny jaje zamieniać niamieckija invalidy. Ab vialikich ahraničeńniach kulturnaha žyćcia moža śviedčyć fakt, što kab vydać jakuju-niebudź knižku z biaźvinnym litaraturnym źmiestam ci školny padručnik, to rukapis pavinien byŭ prajści cely rad instancyjaŭ u niamieckich ustanovach, i kali i ŭdavałasia atrymać na jaje dazvoł na vydańnie, što było naahuł redkim źjaviščam, to nie raniej jak za paŭhoda. Usio niemcami śviedama tarmazilasia i adciahvałasia ŭ nadziei, što a nuž čakany "Sieg" staniecca realnym faktam, a tady i hetak choć-by, jak ciapier, ličycca z bielarusami nia budzie patreby.

Abrabavanaje balšavikami iz sobskaje ziamli bielaruskaje sialanstva i zahnanaje pad teroram NKVD ŭ źnienavidžanyja kalhasy, mocna vieryla, što kalhasnaja systema budzie biezpavarotna skanfiskavanaj i što ŭsia ziamla ŭ jaho sobskaje karystańnie. Niemcy adnak i nia dumali likvidavać kalhasaŭ, bo takaja forma sielskaje haspadarki im, jak i raniej balšavikom, była najbolš vyhadnaj dla ściahivańnia sielskahaspadarčych praduktaŭ. Kali adnak stali pavialičacca sialanskija bunty i samavolnyja raździeły kalhasaŭ, niemcy paśla paŭtary hod byli zmušany praviesci likvidacyju kalhasaŭ, ale tolki teoretyčna. Bo vość na miescy kalhasaŭ paŭstali h.zv. sielska-haspadarčyja "abščyny", ziamla ŭ jakich davałasia tym sialanam tolki ŭ časovaje karystańnie z tym, što byccam paśla vajny

- 14 -

jana stanieśca sobstvaśćiu tolki tych sialan, jakija svajej staronnaj pracaj, umieńniem haspadaravańnia i sumlennym vykonvańniem vajennych pastavak na heta zasłužać.

Pobač z hetymi sialanka-haspadarčymi "abščynami" pačali, jak hryby paśla daždžu, raści h.zv. "dziaržaŭnyja majontki", a pastaŭlenyja na čale ich niamieckija administratary pačali ŭvažać siabie za budučych sobśnikaŭ hetych najbolš uradžajnych, bujnych nadzielaŭ ziamli, ziamli nia tolki tej, jakaja pierad revalucyjaj naležała da panskich ci pamieščyckich dvaroŭ, ale jakaja tak-ža była spradviečnaj sobstvaśćiu sialanina. Kab mieć zaŭsiody rabočuju siłu ŭ hetych majontkach, vialikaja kolkaść sialan z najbližejšych viosak zusim nie nadzialałasia ziamloj navat u časovaje karystańnie byccam za toje, što jany pakazali siabie niaŭmiełymi i niadbajnymi haspadarami. Takim čynam najbolš balučaj kryŭdy, jakuju zrabili balševiki biełaruskamu sialanstvu, zahaniajučy jaho prymusova ŭ kałhasy, niemcy nia tolki nie papravili, ale navat zamacavali jaje na dalej.

Nia mienš baluča adčuvałasia niamieckaja akupacyja z pryčyny prymusovaha abaviazku niepasilnaj pracy i hałodnaha charčavańnia. Isnavali aficyjnyja normy charčavańnia dla miascovaha nasielnictva. Choć jany byli nižejšymi za ŭsiakija inšyja hałodnyja normy dla niamieckaha nasielnictva, adnak na Biełarusi jany nidzie nie pravodzilisia ŭ žyćcio, starannа pierachoŭvalisia ŭ aktach i nidzie nie padavalisia da ahulnaha viedama. A na praktycy nie vydavałasia amal ničoha, za vyklučeńniem 250 hramaŭ chleba ŭ dzień dla pracujučych, 150 hramaŭ dla darosłych siemjaninaŭ i 100 hramaŭ dla dziaciej, a chleb hety často byŭ piečany z nieprasiejanaj aŭsianaj muki razam z miakinaj. Ab hoładzie može śviedčyć fakt, što haradzkoje nasielnictva Uschodniaj (kałhasnaj) Biełarusi viasnoj 1942 h. nočču ŭkradkam išło na pole sumiežnich viosak i voččupam vyhrabała z ziamli śvieža pasadžanuju, parezanuju na častki bulbu, a na darohach vidnielisia zaŭsiody całyja šnury kabiet-piešachodaŭ z kłumkami za plačyma, jakija išli za dziesiatki i sotni kilametraŭ u Zachodniuju (niekałhasnuju) Biełaruś, kab tam vyžabravać ci pramianiać što-niebudź na kusok chleba. A nia hledziačy na heta kožny pracazdolny čałaviek padlahaŭ prymusovamu abaviazku pracy, jakaja asabliva davałasia ŭ znaki viaskovamu nasielnictvu. Nia braŭsia pad uvahu patrebny dla sialanina čas na abrableńnie jaho ziamli ani faktyčnaja kolkaść najaŭnaj rabočaj siły, a išli ad roznych vajskovych častak i pradpryjemstvaŭ narady za naradami na rabočuju siłu, jakuju ŭ žadanaj kolkaści treba było pasyłać na rabotu. Najciažejšaja i sapraŭdy kataržnaja była praca na vyrubcy i vyvazcy lesu, jakoj kiravała h.zv. "Forstschutzkommando". Hetyja katy ŭ zialonych mundzirach niamieckich leśnikoŭ, jakija karali za niavyrabku normy i zaachvočvali da vydajnaj pracy tolki kijam i aplavuchaj, adyhrali vielmi hadkuju rolu na Biełarusi. Nia mienš davaŭsia ŭ znaki prymusovy vyvaz rabočaj siły na katoržnyja raboty ŭ Niamieččynu, kudy było vyviezieną kala adnaho milijonu biełarusaŭ. Tak jak nasielnictva roznymi sposabami chavałasia ad vyvazu, dyk rabilisia častyja abłavy, chvatali ludziej z rynkaŭ, z cerkvaŭ, a navat byli vypadki akružeńnia školaŭ padčas zaniatkaŭ (Baranavičy), kali siłkom chvatali vučniaŭ i vyvozili ŭ Niamieččynu. U Niamieččynie ŭsie biełarusy byli zaličanyja da ludziej najnižejšaje spasiarod usich čužyncaŭ katehoryi "Ostaŭ", jakija byli zusim biaspraŭnymi i najbolš abmiažavanymi ŭ asabistaj svabodzie i charčavańni.

Takoje ŭdasnaje pałažeńnie zapanavała z samaha pačatku niamieckaj akupacyi na Biełarusi, jakoje tut było biez paraŭ-

- 15 -

našnia horšym, čymsia ŭ niekatorych susiednich krainach, što mieli raniej svaju dziaržaŭnuju niezaležnaść. Zusim zrazumieła, što biełaruskaje hramadzianstva musiła paviadci akcyju supraćdziejańnia i sabatažu. Biełaruskaja nacyjanalnaja praca pavinna była raźvivacca i raźvivałasia dvuma šlachami: adzin šlach byŭ padpolnaj raboty z metaju padryvańnia jak niamieckaj, tak i supraćbiełaruskaj balševickaj akcyi, viadzieńnie uzbrojenaha partyzanskaha zmahańnia ź niemcami i balševickimi bandami, druhim byŭ šlach lehalnaje raboty, kab, uvaleziŭšy ŭ administracyju i inšyja dzialanki lehalnaje pracy, prykryvać padpolle, ratavać narod ad fizyčnaha vynišćeńnia i ŭ luboj formie mabilizavać i vyrašćvać nacyjanalnyja siły dla budučych padziejaŭ. Hetaje razdvajeńnie nacyjanalnaje dziejnaści było tolki na vonki, bo faktyčna pamiž lehalnaj i padpolnaj rabotaj isnavała poŭnaje uzhadnieńnie, a častka asoby, što zajmali aficyjalnyja stanoviščy, byli adnačasna aktyŭnymi ŭdzielnikami i kiraŭnikami padpolnaj raboty. Hetak prykładam Ks. V. Hadleŭski, Hieneralny Školny Inspektar Biełarusi, potym rasstralany niamieckim Gestapo, byŭ zakładčykam i pravadyrom "Biełaruskaha Narodnaha Frontu" – vialmi pašyranaj supraćniamieckaj nielehalnaj arhanizacyi. Hetaja arhanizacyja abjadnyvała vialiki kruh biełaruskaj inteligencyi i šlacham vusnaje prapahandy vyjaśniała ŭsiu škodnaść niamieckaje palityki. Jana inspiravała ŭsie vystupleńni biełaruskich lehalnych dziejačoŭ u abaronie biełaruskaha narodu. Hetak naprykład ź jaje inicyjatyvy na źjeździe kiraŭnikoŭ Biełaruskaj Narodnaj Samapomačy ŭ Miensku 21.8.1943 niespadziavana dla niemcaŭ i pastaŭlenaha imi šefa hetaje arhanizacyi było złažana damahańnie złučeńnia ŭsich biełaruskich etnahrafičnych ziemlaŭ i pryznańnia dziaržaŭnaj niezaležnaści Biełarusi.

Nielehalna pracuje pieravažna śpamiž moładzi i biełaruskich partyzanaŭ Biełaruskaja Niezaležnickaja Partyja, jakaja vydaje i raspaŭsiudžvaje antyniamieckija listoŭki, a ad 1943 hodu svoj nielehalny orhan – "Siuletni", [redacted] Akiedźvie arhanizacyi imknucca abiasškodzić i paraližavać antybiełaruskuju dziejnaść roznych čužych i svaich pravakataraŭ, jakija, vysłužyvajučysia niemcam, pamahali im pravodzić škodnuju biełaruskuju palityku. Hetak kali zaktyvizavałasia dziejnaść nievialičkaj hrupy biełaruskich kalabarantaŭ na čale ź viadomym jašče z časoŭ "Hramady" palityčnym spekulantam Fabijanam Akinčycam, to CK Biełaruskaj Niezaležnickaj Partyi vydaje jamu śmiarotny prysud, jaki chutka paśla hetaha byŭ vykanany. Praniamieckaj hrupie Akinčyca ŭdajecca častkova zachapić u svaje ruki kiraŭnictva Sajuzu Biełaruskaje Moładzi, jakaja imkniecca ŭzhadoŭvać našuju moładź u duchu niamieckaha Hitler-Jugend. Adnak Sajuz Biełaruskaj Moładzi ŭnutry byŭ apanavany biełaruskimi patryjotami i dziakujučy hetamu staŭsia jon sapraŭdnaj kuźniaj nacyjanalnaha ŭzhadavańnia.

Chutka pašyrajecca biełaruski nacyjanalny partyzanski ruch, da jakoha prycykaje nia tolki inteligencyja, ale i ŭciakajučyja ŭ lasy ad prasledavańnia i prymusovaha vyvazu na pracu ŭ Niamieččynu sialanie. Zadańnie biełaruskich partyzanaŭ było nialohkaje. Jany byli prymušany zmahacca na dva fronty – suproć niemcaŭ i suproć balševickich partyzan, usia złość jakich była skiravana nia tolki suproć niemcaŭ, skolki suproć biełarusaŭ, u pieršuju čarhu suproć biełaruskaha hramadzkaha aktyvu. Hetyja apošnija, padtrymlivanyja avijacyjnym šlacham balševickaj rehularnaj armijaj, ad jakoj atrymlivali

zbroju i amunicyju, pieravažali jašče i kolkasna, bo zsiudy ŭlilisia ahramadnyja ludzkija rezervy z razbitych niemcami cełych balšavickich armijaŭ, pasobnyja addzieły jakoj skryvalisia dahetul u nieprachodnych lasoch Biełarusi.

U adkaz na ŭzmocnieny partyzanski ruch niemcy zastasavali najbolš dziki i žudasny sposab terroru i zapałochivańnia - masavaje paleńnie biełaruskich viosak razam ź ich žycharami i vystralivańnie cełych dziesiatkaŭ tysiačaŭ biełaruskaha nasielnictva. Jość biassprečnyja dokazy, što niemcy časta štučna pamahali stvareńniu partyzanskaha ruchu, kab mieć pryčynu da fizyčnaha vyniščeńnia ludziej i padhataŭleńnia takim sposabam niezasielenych prastoraŭ dla budučaha kalanizavańnia. Redkimi byli tyja paviety, u jakich nie adbyvalisia masavyja ekzekucyi a ŭ takich miascovaściach Biełarusi, jak Hłyboččyna, Nalibockaja pušča, paŭnočnaja Barysaŭščyna i Lepielščyna, Babrujščyna[2], zachodniaja Mahiloŭščyna, paŭdzionnaja Mienščyna dy ŭsio Paleśsie, byli spalenyja razam z ludźmi cełyja volaści, nieredka cełyja paviety. Dzie prakaciłasia hienieralnaja čystka ad partyzanščyny, pravodžanaja addziełami SS., Jachkommando, ci pravakatarami Kaminskim i Radziwonavym, tam zastavalisia adny papiališčy dy niepachavanyja trupy biaźvinna zastrelenych ci žyŭcom spalenych ludziej. Ad hetaha adnak partyzanščyna nie pryciichała, ale ŭściaž pavialičvałasia.

Biełaruskaje hramadzianstva starałasia nieraz pierakanać niemcaŭ, što taki sposab baraćby z partyzanami raźminajecca z svaimi metami i što spakojnaje biełaruskaje nasielnictva nia moža źnieści až takoj adkaznaści za dziejnaść nia mienš varožaj i jamu balšavickaj partyzanščyny. Nijakich adnak rezultataŭ heta nie davała. Tady na źjezd Akruhovych Kamisaraŭ u Hienieralnaha Kamisara Biełarusi ŭ Miensku 15.8.1943. prybyła delehacyja biełaruskaha hramadzianstva na čale iz staršynioju horadu Miensku prafesaram V. Ivanoŭskim i złažyła ad imia biełaruskaha narodu vostry pratest suproć paleńnia biełaruskich viosak i masavaha mordu nasielnictva. Adzinym rezultatam hetaha śmiełaha kroku było toje, što nieŭzabavie paśla hetaha praf. Ivanoŭski byŭ pry davoli tajamničych abstavinach zabity...

Naahuł da štodziennych źjaviščaŭ naležyli rasstreły biełaruskaha hramadzkaha aktyvu, pracaŭnikoŭ biełaruskaj administracyi, škołnictva, i inšych, vykonvanyja rukami niamieckaha S.D. na padstavie najmienšaha padazreńnia ź ich boku ci niepravieranych danosaŭ roznaha rodu vypadkovych ci prafesyjanalnych pravakataraŭ. Tak jak biełarusaŭ uvažali niemcy zhodna svajej rasavaj teoryi za najnižejšy narod siarod "Untermänsch'aŭ", adnosiačy ich da h.zv. katehoryi "Ostaŭ", dyk naahuł redka karystalisia jany z takoha "pryvileju", jak vysyłka ŭ kancłahiery. Ź imi pieravažna nie rabili sabie i hetkaha kłopatu: bies nijakaha sudu i dokazaŭ viny rasstrelivali ich chutka paśle aryštu i takim sposabam navat i śled pa ich hinuŭ.

Kali-ž treba było źlikvidavać kaho-niebudź z biełarusaŭ, chto ciešyŭsia ahulnym aŭtarytetam i viny jakoha niemahčyma było dakazać, dyk ich zabivali vypracavanym sposabam z-za vuhła, zvalvajučy vinu na balšavickich ahientaŭ. Ale hetuju inscenirоŭku pravodzili tak niaŭmieła ci zumyśla niadbajna, što nie zastavałasia nijakaha sumlivu ŭ tym, chto byŭ faktyčnym zabojcam. Miž mnohimi inšymi hetak zahinuli viedamy biełaruski piśmieńnik-dramaturh Francišak Alachnovič, małady biełaruski dziejač Julijan Sakovič, brat vysłanaha balšavikami viedamaha biełaruskaha paety Marakova i inšyja.

Vajennaje pałažeńnie niemcaŭ rabiłasia što raz trudniejšym. Užo ŭ kancy 1943 i na pačatku 1944 h. trašččeŭ i łamaŭsia

ŭschodni front, a ŭ tyłach niamieckaje armii intensyŭna raźvivałasia partyzanščyna, jakaja ŭtrudniała zabiaśpiečvańnie frontu i viazała ŭ tyłoch vialikija siły i armij. U suviazi z hetym niamieckija ŭłady byli zmušanyja pajści na niekatoryja ŭstupki dla biełarusaŭ. Vynikam hetaha było arhanizavańnie ŭ śniežni 1943 h. Biełaruskaj Centralnaj Rady, jakoj, zhodna zaćvierdžanaha statutu, mieli być pieradany dla jaje samastojnaha kiravańnia niekatoryja haliny krajovaha samaŭradu, najmienna školnictva, kulturnaje žyćcio i hramadzkaja apieka. Paśla dasiulešniaha abmiežavańnia kulturna-hramadzkaha žyćcia i ciesnaj niamieckaj kantroli, užo navat heta zdavałasia być vialikim dasiahnieńniem, jakoje treba było ŭmieła vykarystać dla svaich sapraŭdnych metaŭ. Biełaruskaja Centralnaja Rada staralasia vykarystać vajennyja niaŭdačy niemcaŭ, jakija ŭściaž pavialičalisia, i ich niesamiernyja ciažkaści na zaniatych terytoryjach, i dabiłasia pad vidam nieabchodnaści baraćby z balšavickaj partyzanščynaj, dziejnaść katoraj była skiravanaj taksama suproć biełaruskaha nasielnictva, dazvołu na zarhanizavańnie Biełaruskaj Krajevaj Abarony. Jana miała stacca pačatkovym zarodkam biełaruskaj armii i, vyškaliŭšysia i ŭzbroiŭšysia, pavinna była ŭ niedalokaj budučyni, kali na Ŭschodzie Eŭropy paśla abiaśsileńnia niemcaŭ i balšavikoŭ pačnuć razyhryvacca novyja padziei i raźvivacca narodnyja revalucyi za volnaść i niezaležnaść paniavolenych dasiul narodaŭ, stacca ŭ hetaj revalucyi biełaruskim pieradavym avanhardam. Treba było ciapier skarystoŭvać usiakija mahčymaści, kab uziać u svaje ruki zbroju, kab być pryhatavanym na ŭsiakija pradbačanyja i niepradbačanyja źmieny. Biełaruskija narodnyja masy pravidłova zrazumieli hetyja plany. Choć dazvolena było paklikać u rady krajovaje abarony tolki davoli abmiežavanuju kolkaść ludziej, to ŭsie mužčyny, abniatyja pryzyŭnym viekam, hramadna źjavilisia na mabilizacyjnyja punkty, žadajučy być pryniatymi ŭ vajskovyja rady.

Niemcy adnak chutka zrazumieli sapraŭdnyja mety hetaje akcyi i pačali ŭsiakimi sposabami jaje tarmazić, a navat vyrazna pravakavać. Nia hledziačy na toje, što try departamentyja haliny hramadzkaha žyćcia kraju (aśvieta, kultura i sacyjalnaja apieka) byli tearetyčna pieradadzieny Biełaruskaj Centralnaj Radzie dla jaje samastojnaha kiravańnia, to adnak u akruhach i pavietach niamieckija dziejniki navat i nia dumali vypuskać z svaich ruk hetych tak važnych halinaŭ hramadzkaha žyćcia. Takžama krajovaja abarona, pamimo raniejšych zapeŭnieńniaŭ, nie atrymała abmundziravańnia i zbroi. Tady biełaruskija vajskovyja addziely roznym sposabam pačali ŭzbrojvacca sami. I kali ŭ červieni i lipieni 1944 h. balšaviki ŭznoŭ chutka zaniali Biełaruś, to vielmi nievialikaja kolkaść krajovaje abarony evakuavałasia na Zachad. Bolšaść zastałasia na miescy, kab u nieprachodnych biełaruskich lasoch razam z biełaruskimi nacyjanalnymi partyzanami viaści ŭpartaje aružnaje zmahańnie suproć najhoršaha i najstrašniejšaha voraha biełaruskaha narodu – balševizmu.

Pierad novym zaniaćciom Biełarusi balšavikami 27 červienia 1944 h. adbyŭsia ŭ Miensku biełaruski kanhres, sklikany Biełaruskaj Centralnaj Radaj. Voś-ža hety kanhres niespadziavana dla niemcaŭ i suproć ich žadańniaŭ adnahałosna vynies pastanovu ab paćvierdžańni i pryznańni adzina pravidłovym Aktu 25-ha sakavika 1918 hodu, na mocy jakoha była abviešćana Biełaruś Volnaj i Niezaležnaj Dziaržavaj, i ab unieważnieńni ŭsich dziaržaŭnych umovaŭ i pastanovaŭ čuža-

ckich uradaŭ adnosna Biełarusi. Praviadzieńnie takoj pastanovy kanhresu było mahčymym tolki tamu, što ŭžo niedaloka pad Mienskam hrymieli harmaty i niemcy na złom hałavy ŭciakali z Biełarusi.

Hetak na praciahu troch hod "haspadaryli" na našaj Baćkaŭščynie niamieckija fašysty, jakija "ahniom i miečam" niščyli naš pryhožy bielaruski kraj, kryvava źziekvalisia nad pracavitym i lubiačym volu bielaruskim narodam, nia znali miery ŭ ašukanstvie i abidnych pravakacyjach, što lichaja pamiać ab ich zachavajecca ŭ narodzie na doŭhija stalećci...

Jak ciažkaja zmora praminuła adnak biespavarotna niamieckaje panavańnie na Biełarusi, ale narod naš, zmorany i pryhniečany niamieckaj niavolaj, papaŭ u nia mienš horšuju balšavickuju niavolu. Kali pad udaram balšavickaha nastupu ŭ biespamiaci ŭciakali praredžanyja addziely hitleraŭskaj armii paśle svaich kryvavych "hastrolaŭ" na prastorach našaje Baćkaŭščyny, to nia ciešyłasia duša Biełarusa, nia bačyŭ u hetym jon svajho vyzvaleńnia. Biaźmiežnuju radaść z pryčyny adychodu niemcaŭ zabivaŭ u im paničny žach pierad dobra jamu viedamym stalinskim "vyzvolnikam". Adnak jak niavola niamieckaha fašyzmu, abapiortaja na hvałtach i niespraviadlivaści, praminuła biaśśledna, praminie taksama nia lahčejšaja ani čuć i niavola čyrvonaha balšavickaha fašyzmu.

=============================

A. Machanievič.

## Biełarusy ŭ niamieckich kancentracyjnych lahieroch.

Užo amal ad samaha pačatku niamieckaj akupacyi Biełarusi vialikaja kolkaść biełarusaŭ trapiła ŭ niamieckija kancentracyjnyja lahiery. Dziakujučy nadzvyčaj ciažkim žyćciovym abstavinam lahiernym mała kamu ŭdałosia vyjści žyvym z hetych "fabryk śmierci". Dziela taho voś chacieŭby hetaj infarmacyjnaj zaciemkaj addać moža apošniuju ŭsłuhu tym maim tavaryšam - viaźniam, jakija narodžanyja ŭ niavoli svajo žyćcio zakončyli taksama ŭ najstrašniejšych niavolnickich dasoch, jakimi źjaŭlalisia niamieckija kancentracyjnyja lahiery. Zamardavanyja niamieckimi katami i ich prysłužnikami-viaźniami, jany ŭžo nikoli nia pabačać rodnych biełaruskich ziamiel, svaich žonak, dziaciej, matak i baćkoŭ. Viecier razahnaŭ ich popieł na paloch Aŭšvica, Gross-Rosen, Veimar-Buchenwaldu, Oranienburg'u, Sachsenhausen'u, Nordhausen'u, Mauthausen'u, Gusen, Dachaŭ. Ich buduć čakać doma doŭhija miesiacy, a moź hady - ale darėmna.

Miensk-polackim transpartam pravieziena ŭ Aŭšvic 1500 čałaviek - pieravažna biełarusaŭ. Transpart tryvaŭ cely tydzień. Tydzień u tavarnych vahonach biez vady, ježy - pa 80 - 90 čałaviek u kožnym. Na stancyi Aŭšvic-kala sto trupaŭ. Paśla troch miesiacaŭ karantynu zastałosia nas žyvymi čałaviek 250-300. Užo padčas karantynu abo na tyfus pamierli z hoładu Paŭłaŭ z Lidčyny, baćka biełaruskaha paety, Makarevič z Lidčyny, Kałodka z Vialejki, amal usie biełarusy z liku 140 čałaviek vyviezienych z vialejskaj turmy, Łazaraŭ z Hłybokaha, dr. Vasileŭski z Brasłaŭščyny, śmiarotna chvory Levanovič z pad Prevy mieŭ spuchšyja nohi i ledź moh chadzić. Ciažka chvareŭ Milnk Paval z Baranavič. Jaho paśla pieraviezli ŭ KZ Dora-Nordhausen i jašče ŭ krasaviku 1945 hodu jon byŭ žyvy.

Ks. dr. Hlakoŭski Stanisłaŭ niejki čas znachodziŭsia ŭ Aŭšvic (I lahier), paśla pieranieśieny ŭ KZ Weimar-Buchenwald, dzie pracavaŭ na fabrycy amunicyi. Našal nie pryšłosia mnie z im bačycca. Ale jak apaviadali mnie maje siabry-viaźni - maralna trymaŭsia dobra, byŭ viasioły i poŭny viery ŭ lepšuju budučyniu. Ale ŭ žniŭni 1944 hodu fabryka amunicyi ŭ Weimar-Buchenwald'zie była zbambardavanaja amerykanskimi samalotami. Zhinuła 400 viaźniaŭ i kala 1000 esesaŭcaŭ - vachmanaŭ. Ci astaŭsia žyvym ks. dr. Hlakoŭski - niaviedama. Z im byŭ taksama viedamy biełarus ks. Malec.

Asabliva mnoha było ŭ kancentracyjnych lahieroch biełaruskaj intelihencyi z uschodniaj častki Bieła rusi. Na vialiki žal, nie mahu ŭžo siańnia ŭspomnić usie ichnija proźviščy. Faktyčna ŭsie my byli aznačanyja tolki numarami i proźvišča nikoli nie ŭspaminałasia. Viedaju, što zahinuŭ čatyry biełarusy ŭžo ŭ starejšych hadoch - suddzia Starabina, byŭšy pracaŭnik biełaruskich vydaviectvaŭ u Miensku Chviedaraŭ - byŭ mnoha ciažka chvory i ma' być pamior, pamierła taksama bahataja častka biełaruskaj miestačkovaj i vioskovaj intelihencyi rajonaŭ Słuckaha i Brestskaha. Pieravažna heta byli ludzi, jakija pamiatavali jašče hety viali biełaruski nacyjanalny ŭzdym Słuččyny ŭ 1918 - 1919 hodzie. Biełaruskija demakraty-niezaležniki byli suproć usiakaj akupacyi na Biełarusi i dziakui celym padčas doŭhaha karantynu jany apa-

– 20 –

viadali ab Čarviakovu, jakoha jany asabista znali Pryščepavu, praf. Ihnatoŭskim, ab biełaruskim nacyjanalna-demakratyčnym ruchu ŭva ŭschodniaj čascy Biełarusi.

Na žal vialiki, paŭtaraju, amal usie hetyja viaźni, pracujučy ŭ nadta ciažkich abstavinach, cierpiačy hoład i chaład, pahinuli ŭ kancentracyjnych lahierach Aŭšvic i Dora-Nordhausen.

Arjentujučysia pavodle tych lahieroŭ u jakich ja znachodziŭsia – naahuł biaručy, lik biełarusaŭ u niamieckich kancentracyjnych lahierach byŭ davoli vialiki. Asabliva sialanskaja biełaruskaja moładź trapiała tudy za aby-jakija "praviny". Pryvykšaja da ciažkich materjalnych abstavinaŭ žyćcia, jana pieranosiła lahčej za inšych žudasnyja lahiernyja ŭmovy.

U červieni minułaha hodu vialikaja kolkaść biełaruskich viaźniaŭ vyjechała na Baćkaŭščynu razam z savieckimi hramadzianami, zabyŭšysia nat' ab tym, što saviety ničym nia roźniacca ad hitleraŭskaj Niamieččyny, a savieckija "ispravitielno-trudovyje" lahiery ad niamieckich kancentracyjnych.

–/–/–/–/–/–/–/–/–/

- 21 -

Vasil Kaleśnik.

NA ZIEMLACH BIEŁARUSI.

Letam 1944 h. balšavicki patop paŭtorna zaliŭ usie biełaruskija ziemli. Šorski fašyzm hitleraŭski źmianiŭsia nia mienš žudasnym čyrvonym fašyzmam Maskoŭskim. Ad hetaj pary bycam žaleznaja zasłonka zapała nad Biełarusiaj. Biełaruś ad Zachodniaj Eŭropy adciataja siańnia systemaju patrojnych balšavickich linijaŭ – linii Curzona, linii Odry, linii Elby. Tamu viestki z tul byvajuć redkija i skupyja. Ale z razkazaŭ paadzinočnych ščaślivych uciekačoŭ, jakim udałosia pierabracca cieraz usie pieraškody, z viedamaściaŭ saŭvietskaj presy, a častkova navat i z aficyjalnych savieckich kamunikataŭ možna sudzić, što žyćcio akupavanaj Biełarusi znachodzicca siańnia pad znakam troch važnych źjavičaŭ 1. umocnienaha palityčnaha teroru, 2. masavych pierasialeńniaŭ, 3. šyrokaj partyzanskaj baraćby.

1. Palityčny teror.

Palityčny teror, heta haloŭny "kit", na jakim trymajecca ŭsialaki tatalny režym, a asabliva režym balšavicki. Kali ŭ 1944 h. balšaviki nanava akupavali biełaruskija ziemli, – teror hety razpaleŭsia z asablivaju mocaj. NKVD bycam adbivała sabie "zmarnavanyja" hady, kali jano nia mieła biespasiarednaha dostupu da žycharoŭ Biełarusi, bo haspadaryła tady na našych ziemlach jaje kankurentka i małodšaja "siastryca" – niamieckaja Gestapo.

Z prychodam balšavikoŭ zrazu pačalisia masavyja aryšty, ekzekucyi, ssyłki. Vyniščeńniu padlahali nia tolki nialičnyja ŭ nas faktyčnyja niamieckija słužki i kalabaranty, ale ŭvieś nacyjanalny vioskovy i haradzki aktyŭ, badaj usia narodnaja intelihencyja, jak nastaŭniki,, jak drobnyja ŭradaŭcy, jak zvyčajnyja apalityčnyja sialanie. Teror hety, z niekatorymi chistańniami ŭ sile, z svaimi prylivami i adlivami, tryvaje i da siańnia. Balšavikom nia dvuznačna chodzić ab kančalnaje zniščeńnie "nacyjanalnaha chrybta" biełaruskaha narodu, ab likvidacyju fizyčnuju ŭsialakaha elementu apornaha na rusyfikacyjnuju nacyjanalna i kalanijalnuju ekanamičnu vialikadziaržaŭnickuju palityku čyrvonaje Maskvy.

Ab tym, što Maskva była mocna niezadavolenaja z palityčnaha stanovišča biełaruskaha narodu ŭ hetaj saŭvietnaj vajnie, skazaŭ nam "baćka" Stalin u svajoj pramovie da kamandziraŭ čyrvonaj armii, jakuju jon mieŭ 24 maja 1945 h. Jon skazaŭ, što ŭ ciažkoj vajnie, jakuju SSSR vioŭ z niemcami, adzinym narodam z pamiž 50-ci narodaŭ Savieckaha Sajuzu, jaki apraŭdaŭ davier savieckich uładaŭ, jaki nie pajšoŭ na supracoŭnictva z niemcami, byŭ narod rasiejski. Hetyja słovy Stalina, vyrazna skiravanyja suproć biełaruskaha i ukrainskaha narodaŭ, ale toje,-što, "hodnymi davieru" nie nazvanyja narody Kaŭkazu i Turkiestanu, pakazvaje, što adnosiny da savieckaha režymu i tych narodaŭ nia byli dla Maskvy zdavalniajučymi. Paniavolenyja narody maskoŭskaj imperyi nie chacieli baranić savieckaha režymu i savieckaha ładu navat pierad niamieckim hitleryzmam.

Z hetaha zrazumiejem, što ciapier Maskva, rychtujučysia da novaj imperyjalistyčnaj vajny procіŭ zachodnich demakracyjaŭ, choča ŭžo ŭ pačatku zabiaśpiečyć zapleča

dla svaich udarnych dyvizijaŭ na zachadzie źniščeńniem nacyjanalnaha aktyvu ŭsich nagava i nova padbitych narodaŭ Eŭropy. Balšaviki dobra viedajuć, što paniavolenyja narody SSSR nie prapuściać nivodnaj historyčnaj nahody, kab nie sprabavać vyzvalicca ad śmiarotnych abymkaŭ Maskvy.

Balšaviki niščyli i niščać nia tolki toj nacyjanalny viaskovy i haradzki aktyŭ, katory jany zastali na ziemlach Biełarusi, – jany pastaralisia i prymusili "abiaśškodzić" i ŭsich tych biełarusaŭ, što niamieckimi akupantami byli prymusova vyviezienyja ŭ Niamieččynu na ciažkuju niavolnickuju pracu, što byli tam na položeńni t.zv. "Ostaŭ". Niašmat ź ich, pabačyŭšy žyćcio na zachadzie Eŭropy nie chacieli i varočacca damoŭ, nia hledziačy na vielmi dla ich tut ciažkija ŭmovy pracy i žyćcia. Viedajučy heta zhary, Stalin jašče ŭ Jałcie vymah ad svaich zachodnich sajuźnikaŭ zabaviazańnie prymusovaj ich vydačy. Vialiki maralny cień kinuli na siabie zachodnija demakracyi, pradajučy za marnyja palityčnyja arybniki miljony ludziej, admaŭlajučy im śviatoha dahetul na ŭsim kulturnym śviecie prava azylu, prava prytułku biaspryiutnym.

Dyk voś, pavodle atrymanych viestak, amal nichto z vyviezienych tak zvanaj u Savietach biełarusaŭ nie papaŭ damoŭ u Biełaruś. Ich adrazu paviaźli niejdzie ŭ hłyb Sibiru na prymusovyja kataržnyja pracy, kali nie na miesta horšaje. U Biełaruś z ich pusłali tolki nievialikuju kolkaść dla ahitacyi. Hetych voziać pa ŭsioj Biełarusi i na adumysłovych mitynhach jany musiać raskazyvać, jak im było ciažka ŭ Niamieččynie.

Usie vyviezienyja prachodzili praz specyjalnyja "filtracyjnyja" łahiery, dzie musili adtyvać doŭhija dopyty, vypaŭniać apytalniki z 150 pytańniami i ŭ vyniku ŭsiorońna nie dačakalisia daŭno žadanaj chviliny pavarotu da svajej siam'i, svaich rodnych. U vosieni minułaha hodu cieraz saviackaje radyjo praraviałasia viestka, što adzin vialiki transpart repatryjantaŭ u "patryjatyčnym uzdymie" i "dobravolna" zhadziŭšysia, nie zajechaŭšy dačasia damoŭ, pajechać niepasredna na raboty pa ŭstanaŭleńni razburanaha vajnoju Danbasu. My ŭsie dobra viedajem, što značyć "dabravolna" u takoj " demakratyčnaj krainie", jakoj jość Saviecki Sajuz.

Najhorš, zrazumieła, było z čyrvonaarmiejcami, što trapili ŭ niamiecki pałon. I jany ŭsie tyki vydadzienyja savietam. Ci z ich siańnia chto-niebudź jašče žyvie – heta pytańnie.

## II. Masavyja pierasialeńni.

Adnym iz sposabaŭ žyrakha tyranavonaha ŭ Biełarusi balšavikami palityčnaha teroru, heta masavyja ssyłki, vysialeńni i pierasialeńni. *Ssyłki* – heta prymusovaje vyvoźańnie z Biełarusi paadzinočnych ludziej ci paadzinočnych siemjaŭ. Ale i hetyja paadzinočnyja ssyłki prymajuć časta kolkasna masavyja raźmiery. *Vysialeńni* charakternyja vyvoźańniem žycharstva adrazu całymi *specyjalnymi* hrupami, napr. całaj vioski ci całaha pasiołku. *Pierasialeńni* – pierakidańni vialikich hrup ludziej z adnaho miesca ŭ druhoje z zvyčajna idučym paźniej *zasialeńniem* na zvolnienaje miesca ludziej pryviezienych z inšaha miesca, zvyčajna nie biełarusaŭ, najčaściej ludziej pryjazdžanych z-za Uralu. Pakolki ssyłki i vysialeńni rabilisia balšavikami i da hetaj vajny, to masavyja pierasialeńni ludziej, pierasialeńni abyjmajučyja adrazu miljony narodu, pačatyja ŭ hetuju vajnu z lohkaj ruki Hitlera, balšaviki vielmi achvotna ich prymianili ŭ siabie

i ciažar žyraka tarnujuć ich na ŭsich zaniatych ziemlach.

Pierasialeńni adbyvajucca nia tolki na ŭschod, u hłyb Azii, ale i na zachad, u Polšču. Zhodna z umovaju Maskvy z Varšavaju, miažoju pamiž Polščaju i BSSR maje być t. zv. linija Curzona, jakaja adrazaje ad Biełarusi značnuju čaść Biełastoččyny z Biełastokam i z niekalkimi sotniami tysiač biełaruskaha žycharstva. Pavodle saviecka-polskaj umovy ŭsie biełarusy na zachad ad linii Curzona majuć być vysialenyja ŭ BSSR, a z druhoj starany Varšava maje zabrać da siabie ŭsich palakaŭ, pražyvajučych na ziemlach BSSR. Padobnaja-ž umova padpisanaja pamiž Litoŭskaj SSR i Polščaj ab pierasialeńni ŭsich palakaŭ z Vilni i Vilenščyny ŭ Polšču (Vilnia, jak viedama, z łaski Maskvy dałučana da Litoŭskaj SSR, a nia da Biełaruskaj SSR). Vyšej uspomnienyja pierasialeńni iduć užo ad vosieni 1945 h. Pakolki pierasialeńni biełarusaŭ Biełastoččyny ŭ saviety prychodzicca pravodzić prymusam pry pomačy karnych vajskovych addziełaŭ, patolki pierasialeńnie ŭ advarotnym kirunku maje całkom inšy charaktar – kandydataŭ da vyjezdu ŭ Polšču jość kudy bolš, čym palakoŭ u Biełarusi. Vyjechać starajucca ŭsie, kamu tolki ŭdasca. Ludzi vidać ličać, što ŭ miežach niby "niezaležnaj" Polščy zielezny abruč NKVD nia budzie tak bieznahladna mocny, jak na ziemlach Biełarusi. Pieradusim biełarusy-kataliki, karystajučy z prykryŭki svajej "polskaj" viery, starajucca ŭ jak najbolšaj kolkaści vybracca na zachad ad linii Curzona. Dachodziać viestki, što i mnohija pravasłaŭnyja, fałšujučy svaje metryki, prabujuć jak najchutčej rasstacca z "ščaslivaj savieckaj krainaj".

Siańnia jašče nia majem dakładnych dadzienych ab tym, kolki takich fałšyvych i faktyčnych palakoŭ budzie pierakinuta na zachad. Viedama tolki, što chodzić tut ab mnohija sotni tysiač narodu. Jak padavaŭ na pačatku hodu varšaŭski vice-ministar Volski, jaki z polskaj starany zajmajecca hetymi pierasialeńniami, z ziemlaŭ zachodniaje Biełarusi i Ukrainy razam maje być pieravieziena ŭ Polšču kala paŭtara miljona ludziej. Da pačatku 1946 h. było z hetaha ŭžo pieravieziena pałavina. Apošni termin rejestracyi ludziej da vyjezdu byŭ aznačany spačatku na 1-ha listapada 1945 h. Tamu, što achvotnikaŭ usio prybyvała, hety termin paźniej pryjšłosia pierasunuć da 1-ha studzienia 1946 h. Zhodna z nieaficyjalnymi dadzienymi z samaj Vilni maje być pierasielena bolš 100 000 ludziej, z Vilenščyny – bolš 300 000. Užo z hetych vialikich cyfraŭ vidać, što vyjaždžać starajucca nia tolki faktyčnyja palaki, nasłanyja za polskich časoŭ na našyja ziemli z Polščy, i nia tolki nievialikaja kolkaść spalačanych užo biełarusaŭ, ale jeduć i biełarusy-kataliki.

Pavodle toj-ža polska-savieckaj umovy pierasielenyja majuć być u Polšču nia tolki palaki Zachodniaj Biełarusi, ale i palaki Biełarusi Uschodniaj, jak i ŭsiaho SSSR. Pierasialeńnie hetaje ŭžo taksama začałosia. Tut taksama trapiła u "palaki" vialikaja kolkaść biełarusaŭ, bo viedajem, što balšaviki jašče raniej usich biełarusaŭ-katalikoŭ "ochryścili" palakami i z hetaj-ža pryčyny ŭ svoj čas uvieś Kojdanaŭski rajon Mienščyny, zasieleny ŭ bolšaści biełarusami-katalikami, byli abviaścili polskim nacyjanalnym rajonam. Palityčnyja matyvy, dzieła jakich balšaviki nastajavili vysialać palakoŭ z Zachodniaj Biełarusi i Biełarusi Uschodniaj roznyja. Pakolki vysialeńniem z našych zachodnich ziemlaŭ jany chočuć źmienšyć kolkaść varožaha tam sabie elementu i hetym abłahčyć savietyzacyju hetych abšaraŭ, patolki pierasialeńnie palakoŭ

 

- 24 -

z Uschodniaj Biełarusi ŭ Polšču, savieckich hramadzian ad 25 hadoŭ, heta prykmiety da jašče bolšaj balšavizacyi samoj Polščy z metaju paźniejšaha jaje ŭłučeńnia ŭ lik "ščaślivych" savieckich respublikaŭ.

Kali niechta jašče dumaje, što balšavickaja palityka pierasialeńniaŭ na našych ziemlach pravodzicca z hledzišča karyściaŭ biełaruskaha narodu, mocna mylajecca.

Mocna mylajecca i toje "obščeruskoje" pravasłaŭnaje duchavienstva, što koštam vysialeńnia milijonaŭ biełarusaŭ-katalikoŭ z Biełarusi spadziajecca pravasłaŭnaj carkvie, a praz jaje i sabie, manapolnaha bieskankurencyjnaha stanovišča i tamu bahasłavić siańnia Stalinskaje złačynstva pierasialeńniaŭ, staviačy jaho ŭ svajoj biezmiežnaj palityčnaj blizarukaści i naiŭnaści ŭ kaščunskaje pryraŭnańnie da zasłuhaŭ Carkvie Kanstancina Vialikaha. Hetyja čornasocienna-relihijnyja ślapni i dahetul nia choćuć jašče zrazumieć, što balšavizm nidzie j nikoli nie hatavaŭ i nia budzie hatavać miesca dla raźvićcia pravasłaŭnaj ci niejkaj inšaj viery. Jon hatavaŭ i hatuje tolki mahiłu kožnaj relihii, jak "opjumu narodu", jon pakidaje za saboj tolki ruiny cerkvaŭ, tolki śmierć śviataroŭ, tolki zatoptanyja pačatki viery i chryścijanskaj etyki ŭ ludzkoj dušy. Balšavizm znaje tolki adnu vieru - marksyzm, i słavić tolki svaich "śviatych" prarokaŭ - Marksa, Engelsa, Lenina Stalina.

Sumleńnie biełaruskaha pravasłaŭnaha patryjatyčnaha śviatarstva, zrazumieła, nikoli nie dazvolić słavić i achinać śviatymi kadzilnymi dymami palityku vyhnańnia z rodnaj biełaruskaj ziamli až 20 da 25% usiaho biełaruskaha narodu, chto-b hetaje histaryčnaje złačynstva nie rabiŭ - ci "baciuška" car, ci "baciuška" Stalin.

Kab dać sabie naležnuju histaryčnuju acenku faktaŭ masavych pierasialeńniaŭ na našych ziemlach, treba nam uśviedamić nastupnaje:

1. Vysialeńniu z Biełarusi ŭ Polšču padlahajuć nia tolki adnosna nialičnyja faktyčnyja palaki ci spolščanyja biełarusy, ale i sotni tysiač biełarusaŭ-katalikoŭ. Heta značyć, biełaruski nacyjanalny arhanizm tracić pry hetym značnuju časć svajej cennaj bijalahičnaj substancyi na karyść i ŭzmacnieńnie jaho-ž susiedniaha narodu polskaha.

2. Niby ŭ zapłatu za vysialeńnie svaich-ža biełarusaŭ Biełaruś tracić na karyść Polščy jašče adviečna biełaruskija ziemli Biełastoččynu i Padlašša.

3. U kancavym vyniku Biełaruś nie atrymlivaje i pamianšeńnia kolkaści prablemaŭ svaich nacyjanalnych mienšaściaŭ, bo na miesca vysielenych za liniju Curzona palakaŭ, balšaviki nam nasyłajuć "mancholskich" kalanistych" z-pad Urału. Zvolnienaja pa vysielenych ziamla takim paradkam taksama nie zastajecca dla biełaruskaha sialanina, jana pieradajecca pryviezienym čužyncam.

Treba razumieć, što pierasialeńni pravodziacca vykliučna z hledzišča stałych ci taktyčnych karyściaŭ imperyjalistyčnaj balšavickaj Maskvy i całkom nie ahladajučysia na vynikłyja adsiul škody biełaruskamu narodu, a zvyčajna akurat śviedama z uvahi na takija škody.

3. Partyzanskaja baraćba.

Kali ŭ 1944 h. pryjšła paŭtornaja akupacyja biełaruskich ziemlaŭ balšavickaj čyrvonaj armijaj, dyk lasy Biełarusi roili-sia tady ad partyzanskich addziełaŭ, što vieli ŭporystaje zma-

- 25 -

baŕnie z akupantam niamieckim. Partyzanka hetaja składałasia jak z biełaruskich patryjatyčnych addziełaŭ, tak i z addziełaŭ kiravanych vajennymi instruktarami, pierakinutymi z Maskvy. Lakalna spatykałasia i nievialikaja partyzanka polskaja.

Z prychodam balšavikoŭ partyzanka inšpiravanaja ci kiravanaja Maskvoju sama-saboju źlikvidavałasia. Ale rešta partyzanaŭ z lasoŭ nia vyjšla i balšaviki adrazu-ž stali pierad padobnaju prablemaju, pierad jakoj stajali i niemcy. Spačatku antybalšavickaja partyzanka nia miała takoha vialikaha razmachu, jak antyniamieckaja. Dy chutka saviedzienaja Maskvoju palityka žorstkaha masavaha palityčnaha teroru, palityka ssyłak i pierasialeńniaŭ pavialičyła značna partyzanskija rady.

Anhlijski tydniovik "Catholic Herald" z 21.12.45 drukuje infarmacyi adnaho ŭciekača z SSSR, jaki padaje, što biełaruskija ziemli, jak i ŭsie ziemli na zachadzie SSSR (Prybałtyka i Zachodniaja Ukraina) abniatyja siańnia pažaram hramadzianskaje vajny. Partyzany tam dobra zarhanizavanyja i ŭzbrojenyja, a ichni lik stała pavialičvajecca, jak iz starany varožaha balšavikom žycharstva, tak i z dezertyraŭ čyrvonaje armii. Kab adrezać dapłyŭ novych siłaŭ u partyzany, balšaviki abviaścili mabilizacyju ŭsich mužčyn ad 18-ci da 35-ci hadoŭ. Vynik hetaha byŭ całkam advarotny, bo vialikaja čaść mabilizavanych pajšła, zamiest na mabilizacyjnyja punkty, u les.

Z druhich iznoŭ šarołaŭ paviedamlajecca ab arhanizavanaści i kaardynacyi partyzanskaj akcyi pasobnych narodaŭ. Isnuje stały kantakt i adbyvajucca kanferencyi pradstaŭnikoŭ partyzanaŭ Prybałtyki, Biełarusi, Ukrainy i Polščy. Biełaruskaja partyzanka kancentrujecca hałoŭnym čynam u vialikich puščach i lasoch (Nalibaki, Biełavieža, Palessie, Barysaŭskija i Vilišskija lasy). Z Biełavieskaj partyzanskaj bazy akcyja viadziecca jak u kirunku na ŭschod, tak i na zachad linii Curzona. Polskaja varšaŭskaja presa časta žalicca na partyzanskija "bandy", što haspadarać na ŭsiej Biełastoččynie i vychodziać zvyčajna z Biełavieskich lasoŭ.

Niechto ŭ krai nia vieryć u doŭhi mir i nadzieja na chutkuju niaminučuju vajnu pamiž Amerykaj, Anhlijaj i Savietami padtrymlivaje partyzanaŭ na duchu i daje im vytryvałaść u zaciatym zmahańni.

Biełastoččyna zmahajecca.

Jak viedama, Maskva, jakaja vystupaje siańnia ŭ roli apiakunki Biełarusi, viadzie samavolny torh biełaruskaju ziamlioju, nie zvažajučy całkom na volu biełaruskaha žycharstva i na adviečnyja histaryčnyja miežy rassialeńnia biełaruskaha narodu. Zhodna z svaimi imperyjalistyčnymi metami, Maskva jašče raniej adrezała ad biełaruskaha prastoru i dałučyła da siabie Smalenščynu i značnyja prastory na poŭnačy. U ciapierašniaj vajnie Maskva adrezała ad biełaruskaj nacyjanalnaj terytoryi vialikuju častku Vilenščyny z Vilniaj da Litoŭskaj SSR i addała novaj "volnaj" Polščy značnyja abšary Padlašša i Biełastoččynu z Biełastokam. Charakterna, što adnačasna biełaruskija ziemli Łatvijskaj SSR z Dźvinskam da Biełarusi nia byli viernutyja. Jak bačym, na palityčnym rynku Maskva viała torh biełaruskaju ziamlioju nie škadujučy jaje i biez nijakoj terytarjalnaj zapłaty za vialikija straty.

Kali chodzić ab addadzienaj palakom "na viečnaje vałodańnie" Biełastoččyna z našym Padlaššem, dyk tut byŭ pryniaty jašče novy, saviedzieny Hitleram metad, prymusovaha vyhnańnia z adrezanych abšaraŭ usiaho adviečna tam žyvučaha biełaruskaha

- 26 -

žycharstva.

Zhodna z uhodaju Maskvy z varšaŭskim uradam, padziel hetaj biełaruskaj ziamli adbyŭsia ŭ taki sposab, što novaja miaža Polščy z BSSR prabiahaje: ad Litoŭskaj hranicy ŭzdoŭž staroj polska-litoŭskaj miažy da Kiomanu, na poŭnač ad Horadni, pakidajučy Suvałki i Aŭhustoŭ pa polskaj staranie, a Horadzień na staranie biełaruskaj. Dalej miaža heta idzie amal stoć na poŭdzień praz Biełavieskuju pušču, pakidajučy na polskaj staranie Biełastok. Dalej miaža dachodzić da Buhu na paŭnočny-zachad ad Bierašcia i idzie ŭzdoŭž hetaj raki da Uściłuha, pakidajučy Bieraście ŭ BSSR, a Biełuju Padlaskuju ŭ Polščy. Nia majecca jašče tut dakładniejšych danych ab prabiehu hetaj "linii Curzona", ale ahulam ŭžo možna skazać, što na adrezanaj časci biełaruskaha nacyjanalnaha prastoru pražyvaje kala poŭmiljona biełaruskaha žycharstva, jakoje, zhodna z umovaju, mieła być prymusova vysielenaja ŭ BSSR. Uzamien za heta, Polšča maje zabrać da siabie ŭsich palakoŭ pražyvajučych na prastory BSSR.

Jak bačym, z łaski Maskvy dla Polščy addadzieny značny kusok biełaruskaj ziamli, ad viakoŭ ščylna zasielenaj biełarusami, addadzieny na rachunak macniejšaha jašče zatoje prymacavańnia da pieramožnaj siańnia maskoŭskaj kalaśnicy novaj Polščy, na rachunak aśłablieńnia tak-ža niepakornaj viečna Maskvie Biełarusi praz dalejšaje abrezvańnie jaje i pamianšańnie, praz dalejšaje - havoračy słovami našaha Vialikaha hetmana Juraha Chadkieviča na Lublinskaj vunii 1569 h. - "padrazańnie kryłaŭ".

Dy, kali Maskva z Varšavaju dumała, što hety novy raspadziel biełaruskaj ziamli projdzie biez nijakich dla ich kłopataŭ - dyk jany mocna pamylilisia. Svajo słova ŭ hetym palityčnym targu vykazaŭ i niezaprošany na naradu sam haspadar hetaj ziamli i advečny jaje storaž - biełaruski sielanin.

Kali sprava dajšła da pierasialeńnia - biełarusy vykazali niečakany dla niazprošanych "apiakunoŭ" stanaŭki zbrojny adpor.

Jak padała polskaja presa, jašče ŭ vosieni, biełastocki vajavoda źviarnuŭsia ŭ Varšavu z pytańniem: ci možna ŭžyvać hvałtu i ŭ jakoj formie ŭ adnosinach da tych biełarusoŭ, jakija byli zarehistravanyja adumysłovaju savieckaju kamisijaj da pierajezdu ŭ BSSR? Bolš jak 62% zarehistravanych katehoryčna adkazalisia pierajechać za liniju Curzona!!! Tymčasam savieckija pradstaŭniki ŭ Biełastoku damahalisia nia tolki prymusovaj vydačy spornych, ale taksama strohaha pakarańnia niepasłušnych, jašče na polskaj staranie.

Biełastocki vajavoda atrymaŭ na heta dyrektyvy z Varšavy, kab ŭ adnosinach da niepakornych biełarusoŭ prytarnavać dekret... ab "złosnym nievykanańni pastavak", "dekret z 18.8.44, Dz.U.R.P. Nr.3p.91" Jak bačym, z niastačy adpaviednych zakonaŭ, padhaniajuć biełarusoŭ da vyjezdu vielmi strohim u sučasnaj Polščy zakonam... ab dziaržaŭnych pastaŭkach!

U hetaj-ža spravie ŭ Biełastok była paslanaja adumysłovaja kamisija z uradoŭcaŭ ministerstva biaśpieki (polskaja NKVD) i ministerstva publičnaj administracyi.

Jakija "demakratyčnyja" metady ŭžyvajucca hetaju kamisijaj dla "padachvočvańnia" biełarusaŭ da vyjezdu, siańnia nam jašče dakładna nieviedama, ab ich my možam tolki dahadvacca, ale ab ichnych vynikach padała pisać zahraničnaja, a navat i časam polskaja presa.

Zhodna z paviedamleńniami, u Biełastoččynie i Padlaśsi, jak i na polska-ukrainskim pryhraničču ŭ aposnich miesiacach raźvinułasia vielmi mocnaja partyzanka z ludziej, što nia chočuć pakidać svajoj ziamli. Jak padaje švedskaja "Stockholms Tidnin-

gen" dobra ŭzbrojenyja partyzanskija addziełý haspadarać pa ŭsioj Biełastoččynie i to nia tolki pa vioskach, ale i pa miastečkach. Jany časta ŭ tarhovyja dni pajaŭlajucca na kirmašoch uzbrojenyja karabinami i mašynovymi pistaletami biaruć sabie ad bahaciejšych usio patrebnaje i dzielacca hetym z biednymi. Pavodle viestak toj-ža hazety z Kuźnicy na poŭnač ad Biełastoku, partyzanskija addzieły byvajuć zvyčajna vialičynioju ad 20 da 100 čałaviek. Niekatoryja ź ich jeździać konna, inšyja znoŭ pryjaždžajuć u harady na małych chutkich samachodach.. Polskija ŭłady ŭ Kuźnicy sami pryznajucca, što jany nie panujuć nad paŭstałaj sytuacyjaj.

Druhoha rodu reakcyja biełaruskaha sialanstva na zahad vysialeńnia, była admova ad vykonvańnia dziaržaŭnych pastavak zbožža dla polskaha uradu. Zhodna z aficyjalnymi polskimi dadzienymi z minułaj vosieni, biełastockaje vajavodstva zdało ŭsiaho 6 ton zbožža i 4 tony bulby! kali za toj čas vajavodstva kieleckaje zdało 813 ton zbožža, varšaŭskaje – 4108, a paznanskaje – 6779 ton. Roźnica, jak bačym, ahramadnaja!

Jak padajuć polskija ŭradoŭcy z biełastoččyny, tam naahuł nijakija pastaŭki niemahčymyja biez adnačasnych mocnych addziełaŭ vojska i biez karnych ekspedycyjaŭ. Žycharstva ŭsiudy padtrymlivajecca partyzanami. U suviazi z hetym 8-ha studzienia Varšaŭski Urad vydaŭ strohi zakon skiravany proci tych, što zryvajuć spravu charčavych pastavak i vysłaŭ na biełaruska-ukrainskija ziemli dadatkova niekalki dyvizyjaŭ vojska.

Dy padła hetaha partyzanskaja baraćba nia tolki nia pryciechła, a jašče bolš zavastryłasia. Pamiž polskimi dyvizyjami dy partyzanskimi addziełami adbyvalisia rehularnyja bitvy.

Polskaj presie, zrazumieła, było zabaroniena pisać pra heta. Ale na niadaŭnaj adbytaj sesyi t.zv. Krajovaj Rady Narodovaj, jakaja ciapier ihraje rolu niejkaha polskaha parlamentu z naminacyi, premjer polski zmušany byŭ nakaniec padać da publičnaha viedama, što chacia i pa ŭsioj Polščy idzie apazycyjnaja partyzanka, ale najbolšy kłopat ciapier maje varšaŭski urad z partyzankaj, uzdoŭž savieckaj hranicy, jakaja paŭstała z pryčyny prymusovaha vyvazu ŭ SSSR niapolskaha žycharstva hetych ziemlaŭ. Jak padaŭ na toj-ža sesyi rady hałoŭnakamandujučy polskaha vojska Žymierski, vysłanyja dyvizyi rehularnaj armii mieli za zadaču zdušyć partyzanku i ŭmahčymić jašče da kastryčnika minułaha hodu praviadzieńnie pierasialeńnia. Ale, pryznajecca Žymierski, i da hetaj pary ŭsiož taki nie ŭdałosia apanavać sytuacyi. Pierasialeńnie apaźniajecca, partyzany niščać masty i čyhunačnyja linii, i ŭsialak paralizujuć transpart. Jon-ža padaŭ, što za apošnich 6 miesiacaŭ źlikvidavana 28 partyzanskich atradaŭ, zdabyta na ich 81 kulamiot, 179 aŭtamataŭ, 812 vintovak, 110 pistaletaŭ, 1786 hranataŭ, a taksama mnoha samachodaŭ, koniaŭ i karoŭ...

Svaju pramovu Žymierski zakončyŭ słovami: "urad maje namier zakončyć pierasialeńnie ŭ niedalokaj budučyni, prypomocy kansalidavanaj akcyi vojska i ŭładaŭ biaśpieki i praz biezahladnaje źniščeńnie partyzanaŭ".

- 28 -

Partyzanski ruch sierod biełarusaŭ Bielastoččyny ŭściaž raście i pryjmaje formu sapraŭdnaje narodnaje vajny. Jak paviedamlaje Pressavaja Ahienctva z Bielastoku, 21 lutaha 1946 h. polski urad kinuŭ na zmahańnie z partyzanami cełuju "polskuju" dyviziju ŭ składzie 60 000 čałaviek. Dyvizija maje za zadańnie ačyścić paŭnočna-uschodnija /pieravažna biełaruskija/ abšary sučasnaj Polščy ad "bandaŭ", jakija dziejničajuć pieravažna ŭ lasoch. Kamanduje dyvizijaj hienerał Paškievič, jaki niadaŭna viarnuŭsia z Londynu ŭ Polšču. Hety hienerał zajaviŭ pradstaŭniku "Assyciejted Press", što hetuju t.zv. "nacyjanalistyčnuju armiju" treba ličyć prosta, jak "nacyjanalistyčnyja bandy". Ab sile hetych "bandaŭ" śviedčać inšyja dadzienyja, pavodle jakich u partyzanach znachodzicca da 100 000 čałaviek.

Pavodle viestak uciekačoŭ, ciahniki z savieckimi transpartami ŭ akupavanuju balšavikami zonu Niamieččyny nia iduć cieraz Bielastok, a biaśpiačniejšymi paŭnočnymi šlachami ŭzdoŭž Bałtyjskaha mora.

U suviazi z usim hetym pierasialeńnie adbyvajecca vielmi pavolna i kanca jamu jašče siańnia nia vidać. Jak padaŭ polski ŭpaŭnamočany dla spraŭ pierasialeńnia viceministar Volski, da listapada minułaha hodu ŭ BSSR było vysłana tolki 30 000 biełarusaŭ. Pavodle zhodnych viestak presy, dzieła vialikaha niaładu na čyhunacy, transparty pierasialencaŭ byvajuć časta ŭ darozie, na adkrytych vahonach i pry vialikich marazoch miesiacami. Časta miesiacami jany stajać u vielmi ciažkich umovach charčavańnia na stancyjach, čakajučy svajej čarhi. Stol vialikaja kolkaść pierasialencaŭ, asabliva małych dziaciej, hinie pa darozie.

Hetyja ŭsie žudkija viestki, što dachodziać da nas siańnia z našaje Bielastoččyny, śviedčać ab tym, što z zakančeńniem vajny, jašče nie zakončyŭsia toj mučanicki šlach biełaruskaha narodu, pa jakim honiać jaho jahonyja dŭyja susiedzi i jašče daloka nie zakončyłasia zmahańnie biełaruskaha narodu za śviatyja prava volnaha žyćcia na svajoj volnaj ziamli.

---ooo-ššš-ooo---

– 29 –

S. Bukašonak.

Kašta pryhonnych duš

Pad kaniec minułaha hodu dva balšavickija tydniovìki što vychodziać u Paryžy, "Savietskij patriot" i "Russkija novosti", nadrukavali taki kamunikat konsularnaha addziełu savieckaj ambasady ŭ Paryžy.

"Hetym padajecca da viedama, što žychary zachodnich ziemlaŭ Savieckich Sacyjalistyčnych Respublikaŭ Biełaruskaj i Ukrainskaj, byŭšyja polskija hramadzianie, što žyvuć u Francyi, mohuć da 31-ha śniežnia 1945 h. zarehistravacca hramadzianami savieckimi. Asoby, što chočuć rehistravacca, pavinny źjavicca asabista ŭ konsulskim addziele savieckaj ambasady ŭ Francyi abo pierasłać paštaju paśpart, śviedčačy ichnaje byłoje hramadzianstva polskaje... Pry rehistracyi kožny spravač asabistych dadzienych pavinien pakinuć 6 svaich fatahrafijaŭ "en face"...

Z hetaha kamunikatu bačym, što balšaviki nie abmiažoŭvajucca ziemlami svaimi militarnymi zdabyčami i prystupajuć da dalejšych "zavajavańniaŭ" navat i za miežami SSSR. Jany nie zdavalniajucca ŭładańniem pad svajho čyrvonaha režymu samych ziamiel Zachodniaj Biełarusi, ale hetym chočuć aščaślivić i ŭsich biełarusaŭ tych abšaraŭ, što zmušany znachodzicca niejdzie za čužynie, pary shapanaŭ zmiacieć u kipciaŭ N K V D.

Praŭda, napierakor myšlenniam Maskvy, rehistracyju prychodzicca pravodzić na dabravolnym pryncypie, a nie pad "demakratyčnym" prymusam. Jak ciapier užo viedama, na byłoj asieńniaj ŭparnaj kanferencyi ŭ Londynie Mołataŭ usiŭ dabivacca ad Anhlii i ZŠA zhody na prymusovaje addzialeńnie savieckim hramadzianstvam žycharoŭ Zachodniaj Biełarusi i Ukrainy. Tyja admovili na adres, dyk chočki-nia-chočki pryjšłosia źviarnucca da daŭno ŭžo zabytych u siabie doma demakratyčnych "metadaŭ".

Adnak nia ŭsiudy spravy akłalisia tak, jak u Francyi. Jašče niekalki miesiacaŭ raniej savieckija pasolstvy ŭ krainach uschodniaj i centralnaj Eŭropy zaklikali da rehistracyi ŭsich asob pachodziačych z Zachodniaj Biełarusi i Ukrainy i z byłych prybałtyckich dziaržavaŭ. Urady-ž hetych krainaŭ adpaviedna (pad naciskam Maskvy) vydali zakazy ab prymusovym vyjeździe ŭsich hetych ludziej u SSSR. Tut demakratyčnymi pryncypami nia treba było ŭžo zmahacca. Tak było ŭ Čechasłavacyi, u Rumynii, Vuhoršč., Bałharyi, Juhasłavii.

Što datyčyć biełaruskaj emihracyi ŭ Francyi jaki prypisycca da Savietaŭ, dahadvacca lohka. Chto addaść ci zdaść stary svoj paśpart, maje ŭpeŭnieńnie-ž užo jaho nie pabačyć, a zamiest haraha raniej-paśniej abdzielać jaho paśpartam savieckim i jon z taj pary ustanicca na vykłučnaj savieckaj łasce. Ad balšavickich palpredaŭ budzie tady zaležyć, kolki času dazvolicca jamu jašče dychać svabodnym paviatram "kapitalistyčnych" dziaržavaŭ i kali za šlahad treba budzie vyježdžacca pad bieśpasiarednija ŭžo ŭdzieku N K V D. da pryhonnaj raboty ŭ SSSR.

Charakternaja pry hetym drabnica ab patrebie aŭ 6 fotohrafijaŭ. Na adzin paśpart, jak viedama, nichto ŭžo bolej fatahrafijaŭ nia lepić. Lohka dadumacca, što lišnija fatahrafii pavandrujuć u centralnyja spiski N K V D u Maskvie i ŭ spiski padobnych ustanovaŭ, i pieradusim da viedama lakalnych ułada NKVD miascoviaŭ, adkul dadzienaja asoba pachodzić

- 30 -

kab na vypadak, kali novaprydbany "hramadzianin SSSR" akazaŭsia-b z štyŭnym chrybtom i prabavaŭ-by ŭ imia "demakratyčnaści" narakacca, – kab takoha hramadzianina represyjami prociŭ jahonaj blizkaj radni doma adpaviedna źmiakčyć.

Ale najbolš jarkija dokazy svajho "majstarstva" prajavili savieckija pradstaŭniki padčas repatryjacyi svaich "hraždan", što znachodzilisia ŭ akupavanych francuzami i anhla-amerykancami zonach Niamieččyny.

Chto nia viedaje zaŭraŝnaha palažeńnia ludziej u SSSR, tamu ciažka zrazumieć, čamu heta celyja sotni tysiač ludziej, vyviezienych prymusova na kataržnuju pracu ŭ Niamieččynu i haładnaje charčavańnie, ciapier kateharyčna admaŭlajucca ad vyjezdu nazad u "ščaślivuju" sacyjalistyčnuju baćkaŭščynu. A treba viedać, što i tyja z biełarusaŭ, što raniej viarnulisia ŭ Biełaruś, zrabili heta ŭ bolšaści vypadkaŭ pad fizyčnym ci maralnym prymusam, jaki tarnavali jak pradstaŭniki savieckich misyjaŭ, tak i akupacyjnyja ŭłady na patrabavańnie savietaŭ. Dy nia mienš pakazalnym dla kožnaha čužynca byŭ fakt, z jakoj nasojlivaściu damahalisia savieckija ŭłady prymusovaj repatryjacyi svaich i nia svaich hramadzian, užyvajučy pry hetym usialakich viedamych tolki dla N K V D chitrykaŭ i podłaściaŭ i starajučysia na kožnym kroku ašukać nia tolki achviary repatryjacyi, ale navat pradstaŭnikoŭ akupacyjnych uładaŭ. Niarodkimi byli vypadki, kali savieckija "hicli" podstupam vykradali ludziej z ich pamieškańniaŭ, łavili na darohach i vulicach, kab siłkom pasadziŭšy ich u samachod vyviezci ŭ niaviedamym kirunku. Chiba-ž nia słavu, a tolki sorom i hańbu prynosić najbolš "demakratyčnaj u śviecie krainie pracoŭnych" fakt, što hetyja pracoŭnyja, vyrvaŭšysia z savieckaha "raju", vybirajuć biespryiutulnaje badziańnie na čužynie, čym zvarot pad kryllo "baćkaŭskaje" apieki "voždia usiech trudiaščychsia".

Na apošniaj sesyi Arhanizacyi Złučanych Nacyjaŭ pradstaŭnik biełaruskaje "dziaržavy" i "biełaruskaha" narodu tavaryš Uralava, samo proźvišča katoraj pakazvaje na jaje pryuralskaje ci zauralskaje pachodžańnie, damahałasia pazbaŭleńnia dziaskaje apieki vysielenych niemcami biełarusaŭ i prymusovaje ich repatryjacyi, ćvierdziačy, što byccam źjaŭlajucca jany niamieckimi supracoŭnikami i vajennymi prastupnikami. Komu, komu, ale nie tav. Uralavaj i jej padobnym, z lohkaj ruki katorych zahinuli ŭ Biełarusi i hinuć ciapier celyja miljony biazvinnych ludziej, zajmacca vydavańniem prysudaŭ na celyja dziesiatki tysiač biełaruskich sialan i intelihencyi, što nia chočuć viartacca ŭ savieccki "raj". Kali i byli siarod biełarusaŭ faktyčnyja supracoŭniki niamieckaha fašyzmu, to znojdzie dla ich naležnuju i pełnia-ž niepabłažlivuju acenu i vydaść svoj prysud sam biełaruski narod, a nie tavaryš Uralava i inšyja zauralskija ci pryuralskija "pradstaŭniki" biełaruskaha narodu.

Minułaja vajna prynieśla balšavikom niekalki dziesiatkaŭ miljonaŭ čałaviek strataŭ. Sam Stalin-ža i staršynia Savietaŭ Vozniesienski ŭ svaich pramovach zaklikali da novych zbolšanych vializarnych zbrajeńniaŭ SSSR. Dla hetaha-ž patrebnyja novyja miljony niavolnickich rabotnickich ruk, novyja tysiačy kataržnych kancłahieraŭ, novyja tysiačy rassiejanych ad białamorskich tundraŭ da Alma-Ata, da Kazachstanu "prynudiłovak".

Dy paminajučy kancłahiery i narmalnaja praca ŭ SSSR nia roźnicca ničym ad pryhonnaj. Tamu i abviaščanyja savieckimi konsulatami rehistracyi achvotnikaŭ na savieckich hramadzianstvaŭ, heta ništo inšaje jak proba naboru sabie zaniažoju budučaj pryhonnaj siły, heta łaŭba sabie novych miljonaŭ pryhonnych duš.

- 31 -

Druhoj i paŭnie-ž jašče važniejšaj pryčynaj savieckich damahańniaŭ repatryjacyi jość imknieńnie pazbycca zahranicaj za ŭsiakuju canu žyvych śviedkaŭ balšavickich złačynstvaŭ, jakich achviarami i niepasrednymi naziralnikami byli hetyja ludzi. Jany pradstaŭlajuć pavažny kłopat dla savieckaj prapahandy, jakaja ŭsiudy i zaŭsiody staracca pakazać Saviecki Sajuz, jak samuju "ščaslivuju", samuju "demakratyčnuju" j samuju "zamožnuju" krainu pracoŭnych. I tut my paŭnieście zmušany zhadzicca z tym, što hetyja ludzi samym svaim pobytam zahranicaju źjaŭlajucca ŭsapraŭdy niebiaśpiečnymi dla parfidnaj i nieŭmoŭnaj łžy, jakuju balšaviki z vialikim nachabstvam ekspartujuć na cely śviet.

------§§§§§§------


No 23 ВЕРАСЕНЬ 1946

ЗЬМЕСТ ЧАСАПІСУ:



.....xxxxx000xxxxx.....

---

Цана асобнага экземпляра № 2-3 "Руху":

| | |
|---|---|
| у Італіі | 400 ліраў, |
| у Нямеччыне | 10 марак, |
| у Францыі | 100 франкаў. |

# РУХ

ОРГАН ЦЭНТРАЛІ ПАСРЭДНІЦТВА БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ

№ 2-3 1946 г. № 2-3

[illegible]

## ЗА НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ НАРОДУ.

Тыя народы, нацыянальнае развіцьцё якіх адбывалася ўвесь час нармальна і іх нацыянальнае існаваньне было нічым незагрожана, зусім не маюць патрэбы [illegible] на культываваньне й развіцьцё іх нацыянальных асаблівасьцяў. Ім няма патрэбы рабіць гэтага, бо іх нацыянальны развой быў адным з натуральных і арганічных зьяваў у працэсе іх дзяржаўна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу. [illegible] народу [illegible] і [illegible] гэтага народу, як асобнае нацыі, [illegible] правы і [illegible] за іх [illegible] перад іх [illegible] было-б [illegible] барацьбой зь [illegible].

Калі-б сёньня прыкладам у Швэцыі або ў Англіі пачалі пашыраць нацыяналістычныя ідэі, [illegible] іх нацыянальных асаблівасьцяў [illegible] іх натуральны ўзровень і [illegible] іх перад [illegible] пагрозай, дык гэта было-б ужо [illegible] зьявішча, прыкладам чаго была [illegible] Нямеччына або фашыстоўская Італія. Тымчасам у народаў, так ці іначай [illegible] затрыманых і загрожаных у іх нацыянальным развіцьці, у тым ліку і ў нас беларусаў, нацыяналізм быў зьявішчам заўсёды творчым, прагрэсіўным і [illegible]. Гэтую канечнасьць прызнаваў нават Ленін і паўтараў за ім у свой час Сталін, цьвердзячы, што народы нацыянальна паняволеныя толькі тады могуць увайсьці ў інтэрнацыянальную сям'ю камуністычнага грамадзтва, калі перад гэтым [illegible] нацыянальнага развіцьця і гэтым самым затруць сьляды ранейшага нацыянальнага паняволеньня. Ну, але ці тое-ж бы і Сталін, каб потым забыцца аб гэтай, паўторанай і ім, [illegible] праўдзе.

Нацыянальнае паняволеньне [illegible] ідзе да нас з двух бакоў: з Усходу і Захаду. І палякі і расейцы ў роўнай меры [illegible] асыміляваць наш народ і гэтым самым [illegible] свой [illegible] прастор і ўмацаваць не толькі свае дзяржавы, але і нацыянальныя арганізмы.

Як русыфікацыя, так і паланізацыя праводзіліся ў асноўным двума метадамі: шляхам культурнага ўплыву і прапаганды і шляхам дзяржаўна-адміністрацыйнага прымусу і палітычнага тэрору. Трэба адзначыць, што перш перыяд нашага нацыянальнага заняпаду ў XVII-XVIII в. быў вынікам культурнага ўплыву Польшчы на інтэлігенцыю вярхі нашага грамадзянства -арыстакратыю і шляхту. Затое ў эпоху новага нацыянальнага адраджэньня ад да апошніх часоў значэньне культурнага ўплыву зьяўляецца ўжо выключна другарадным і мала эфэктыўным. Нацыянальныя свядомыя масы, якія ставілі ідэалы да самастойнага культурна-нацыянальнага жыцця, хоць з поўным посьпехам перад ім бараніцца. У гэты апошні перыяд нашай гісторыі асноўную ролю адыгрываў шлях дзяржаўнага прымусу, нацыянальнага нявольніцтва ў сацыяльны значэньні гэтага слова, якое ў шырэйшай меры змагло затрымаць наш нармальны нацыянальны рост.

Да заканчэньня першае сусьветнае вайны і рыскага падзелу Беларусі русыфікацыйныя і паланізацыйныя акцыі адбываліся паралельна між сабой з расейскай перавагай на ўсходзе Беларусі і сярод праваслаўнага насельніцтва, і з перавагай польскай на заходніх частках нашае тэрыторыі, а перадусім сярод беларусаў каталіцкага веравызнаньня. Пасьле паўстаньня незалежнае Польшчы і рыскага падзелу Беларусі ў 1921 г. Заходняя Беларусь апынулася выключна пад націскам паланізацыі, а ўся цэнтральная і Усходняя Беларусь - русыфікацыі. Як палякі, так і расейцы ў дачыненьні да беларусаў імкнуліся да аднолькавых мэтаў - поўнай нацыянальнай асыміляцыі беларускага народу.

Метагоднасьць нацыянальнае асыміляцыі адных народаў другімі, вышэйшых культурна або палітычна сільнейшых у адносінах да слабейшых, часамі апраўдвалася і лічыла магчымым у старыну, калі сярод народаў не было яшчэ развінутага нацыянальнага пачуцьця ў сапраўдным разуменьні гэтага слова. Гісторыя ведае шмат фактаў поўнага зьнікненьня некаторых народаў і іх растварэньня ў іншых народах, што сяньня ад іх не засталося сьлядоў і сьледу. Калі-ж з пачаткам XIX в. пад уплывам рамантызму і ідэяў вольнасьці праблема нацыянальнасьці набыла новы зьмест, а пачуцьцё патрыятызму і нацыянальнага вызваленьня было ўзведзена да вышыні найвялікшых ідэалаў, то ад гэтага часу розьніцца палітыкаў, новыя ідэі і адметных народаў пайшлі ў кірунку нацыянальнага адраджэньня і дзяржаўнага самаазначэньня, а не ў кірунку іх асыміляцыі. І ад гэтага часу мы не знойдзем у гісторыі такога факту, каб нейкі народ удалося асыміляваць, хоць выняткі ў гэтым кірунку не здараліся, а ў многіх выпадках памыліліся. Таму чыны асыміляцыйных імкненьняў народаў пануючых у адносінах да паняволеных ім звычайна свае мэты не дасягаюць, а значыць і не прыносяць ніякіх рэальных карысьцяў для асыміляцыйных за выключэньнем хіба толькі задавальненьня іх шавіністычных інстынктаў. Затое прыносяць яны непапраўныя шкоды для тых народаў, каторыя зьяўляюцца аб'ектам асыміляцыйнае палітыкі. Яскравым гэтага прыкладам можа быць паланізацыйная палітыка Польшчы на землях Заходняе Беларусі.

- 3 -

Палякі праводзілі паланізацыйную палітыку шляхам безаглядлівага жорсткага адміністрацыйнага прымусу, культурнай прапаганды і паліцэйскага тэрору. І гэтакім мэтадам дайшлі да таго, што калі спачатку арганізаваньня польскае рэспублікі беларускі народ, налічваючы ў яе граніцах да чатырох мільёнаў чалавек, жыў поўным культурна-нацыянальным і грамадзка-палітычным жыцьцём, то перад пачаткам апошняе вайны ня было ўжо ніводнае беларускае школы, ніводнай беларускай газэты, ніводнай легальнай беларускай партыі ці арганізацыі, адным словам заходнія беларусы не маглі праяўляць ніякага нацыянальна-грамадзкага жыцьця і прадстаўлялі ў вачох палякаў аморфную этнаграфічную масу, якую асталося спалянізаваць і прывучыць да "вышэйшую" польскую культуру. Нават афіцыяльная польская статыстыка апошніх гадоў паказвала ўсяго звыш мільёна беларусаў у Польшчы, адносячы астатнія тры мільёны ў рубрыкі палякаў і выдуманых для палякаў хаценьнем беларусаў фіктыўных "нацыянальнасьцяў", як "палешукоў" і "тутэйшых". Як бачым, сыстэма палітычна-адміністрацыйнага прымусу была даведзена да кульмінацыйнага пункту, далей якога ўжо ня было куды ісьці. А ці-ж асягнулі яны хоць частковае спадзяваньня мэты? Абсалютна не.

Беларускі народ выявіў столькі нацыянальнай жывучасьці і апорнасьці, што калі ў 1939 г. развалілася Польшча, то ад усёй гэткай жорсткай паланізацыйнай акцыі не асталося амаль і сьледу. Ніякай рэальнай карысьці для палякаў яна не прынесла, як і ня магла-б прынесьці ніякіх карысьцяў падобная акцыя ў любой іншай дзяржаве, калі-б, так як у перадваеннай Польшчы, дзе-колечы яна праводзілася. Затое шкоды гэтае акцыі былі надзвычайна цяжкія і балючыя для беларускага народу, бо яна затрымала на гэты час яго натуральны нацыянальны рост і разьвіцьцё ягонай культуры ў найшырэйшым значэньні гэтага слова.

Можа хто-небудзь запярэчыць гэтым нашым развагам, цьвердзячы, што калі паланізацыйныя намаганьні палякаў асталіся безрэзультатнымі, то затое русыфікацыйная палітыка бальшавікоў, праводжаная імі на тэрыторыі Савецкае Беларусі, мела некаторыя нават эфэктыўныя рэзультаты. З гэтым нельга не згадзіцца. Але бальшавікі наогул належаць да тэтай катэгорыі людзей, якія маюць магчымасьць зрабіць поўнасьцю ўсё тое, што яны маюць у пляну. Таму гэтага моманту нацыянальнага паняволеньня Беларусі бальшавікамі разгледзім асобна.

У БССР афіцыяльна дазвалялася і нават абвяшчалася законамі поўнае разьвіцьцё "нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу" беларускай культуры. Была створаная, праўда фіктыўная, Беларуская Сацыялістычная Рэспубліка з нават фіктыўным правам выхаду із Савецкага Саюзу. Ніхто нікога не прымушаў запісвацца расейцам, існавала беларуская прэса, масавае беларускае школьніцтва, тэатр, мастацтва і наогул было нібыта ўсё тое, што толькі патрэбнае народу для развіцьця яго нацыянальнага жыцьця. І толькі пачынаючы з 1929/30 г. адбываецца бесперапынна жорсткі паход бальшавікоў супроць усякіх праяваў беларускага нацыянальнага руху і масавае нішчэньне інтэлігенцыі і перадавой часткі народу.

Цэлыя тысячы дзеячоў нацыі, культуры й мастацтва, а сотні-ж дзесяткі тысячаў сялянства й інтэлігенцыі былі абвінавачаны ў "нацыянал-дэмакратызьме", "нацыянал-ухілізьме", "трацкізьме", "ўхілізьме" і ў іншых фіктыўных "ізмах" і, як такія, былі арыштаваны, растраляны або высланы, адным словам так ці іначай фізычна "зьліквідаваны".

Праўда, і пасьля гэтага заставаліся ўсе тыя законы, што гарантавалі розвіцьцё беларускай культуры. Беларуская мова афіцыяльна [illegible], але [illegible] ў гэтым бальшавікі сыстэматычна праводзілі [illegible] мову, як "спрэс пераходную і рэвалюцыйную", у якой выдаваліся творы Леніна, Сталіна і іншых тэарэтыкаў бальшавізму. Расейскія [illegible] уважаліся ня інакш як найбольш "рэвалюцыйнага і перадавога" сярод усіх народаў Савецкага Саюзу, [illegible] да таго, што калі-б прыехалі [illegible] і [illegible] на Беларусі ў беларускіх установах і на людзях [illegible] нацыянальнасьці толькі і выключна гаварыў па-беларуску, то людзі на гэтай толькі падставе маглі быць западозраныя ў таго ці іншага гатунку "нацыяналізьме" і, як такія, "зьліквідаваныя". [illegible] да такіх абсурдаў, што прыезджыя беларусы [illegible] беларускую мову і ў беларускай школе, якія на працы ў [illegible] гаварыць па-беларуску, то ў [illegible] мусілі [illegible] гаварыць па-расейску. [illegible] беларускіх школ рабілася ў [illegible] беларуска-расейскімі, [illegible] у [illegible] і ў розных установах [illegible] беларускія [illegible] на [illegible] і [illegible], а беларуская мова [illegible] фактычна ўжывалася, [illegible] у прэсе, пасьля [illegible] з 1963 г. [illegible] за ўсё [illegible] беларускай мовы. Адным словам [illegible] ў БССР [illegible] толькі беларускі [illegible], за якім [illegible] ня толькі [illegible] расейскі [illegible], але ў рэфлімі [illegible] і форма.

Адным на словам, такога [illegible] прычыну [illegible] часткова [illegible] сярод [illegible] Беларусі, бо за яе [illegible] ня толькі [illegible], але на [illegible] яго і [illegible]. У [illegible], як і [illegible] Савецкага [illegible], [illegible] толькі ў Савецкім Саюзе [illegible] да поўнага [illegible], [illegible] і маральнага [illegible], [illegible], [illegible], [illegible] і [illegible], [illegible] найбольш [illegible] чалавека і [illegible] яго ў голадзе і [illegible], [illegible], [illegible] на рубы [illegible], [illegible] і [illegible] бальшавіцкай [illegible] чалавека [illegible], [illegible] яго [illegible], [illegible] чалавечай [illegible], адным словам [illegible] чалавека, які быў бы [illegible] у руках бальшавіцкай клікі, і [illegible] ў [illegible] бальшавікі ўдалося. Дзеля [illegible] ў Савецкім Саюзе, а асаблівa ў нацыянальных рэспубліках, дзе бальшавіцкі тэрор быў [illegible] рэфінаваным [illegible], [illegible] жорсткім людзей, незразумелых для чалавека, які не адчуў на сабе ў [illegible] сіле бальшавіцкага паняволеньня. І вось сярод такой часткі беларусаў, гэтых трагічных

- 5 -

сістэмаў бальшавіцкага нявольніцтва, у якім праблема русіфікацыі [illegible] [illegible] [illegible] бальшавіцкага [illegible]. Справа нацыянальнай прыналежнасьці зьяўляецца для гэтай катэгорыі людзей абставінай біялягічнага парадку, [illegible] сацыялягічнага і культурна-гістарычнага стану, якое не [illegible] ў іх ніякай пачуцьцёвай рэакцыі. Частка гэтых беларусаў, што наогул апынуліся на эміграцыі, [illegible], перажывалі-б гэтыя асобы якую-небудзь лучнасьць з [illegible] бальшавіцкім нявольніцтвам, якое і самыя гавораць толькі па-расейску, не прачуваюць ніякай нацыянальнай [illegible], [illegible] не могучы яшчэ [illegible] з пад ціскам бальшавіцкага [illegible].

Увесь цяжар нацыянальнага нявольніцтва, і польскага і расейскага, беларускі народ перацярпеў мужна. Яго моцная нацыянальная стыхія, [illegible] [illegible] і маральная сіла [illegible] той [illegible] цывілізацыяй, аб якую разьбіваліся ўсе варожыя намаганьні. Ён, захоўваючы ў сваёй [illegible] сабе народныя традыцыі, старанна перахоўваныя ў спадчыне ад дзядоў і прадзедаў, адгароджваўся ад чужога сьвету і, хоць гэтым адстаў ад яго культурных здабыткаў, але з поспехам абараніўся ад дэнацыяналізацыі. Ані польская, ані расейская культура, што старанна [illegible] яму, як [illegible] [illegible], [illegible] з захаду і ўсходу, не забілі яго сваёй "цывілізацыяй", а наадварот - [illegible] ён да ўсяго чужога і наноснага арганічную пагарду, [illegible] ў сваёй народнай творчасьці [illegible] чужынцаў культуртрэгераў, як і тых сваіх [illegible], што [illegible] на [illegible] [illegible] блескам.

[illegible] нацыянальнага адраджэньня праходзіў на Беларусі ў [illegible] цяжкіх абставінах, чымсьці сярод іншых паняволеных народаў Эўропы. Беларускі народ мусіў [illegible] перад двума магутнымі [illegible] сіламі, што [illegible] так з боку расейскага, як і польскага і [illegible] [illegible] на яго [illegible] [illegible] не толькі нацыянальна-палітычны, але ў роўнай меры і сацыяльна-эканамічны прыгнёт. Каб не мог ён [illegible] свайго трагічнага палажэньня і не [illegible] ўсё яго [illegible], абодва нашыя суседзі старанна трымалі яго ў стане культурнага прымітывізму й цемры. Аднак не гледзячы на гэта, хваля нацыянальнага адраджэньня, што ахапіла ўсе паняволеныя народы Эўропы ў пачатку XIX в., дакацілася і на Беларусь і знайшла сабе падатны грунт сярод беларускага народу. Пачалася цяжкая, але [illegible] барацьба за нацыянальнае адраджэньне і вызваленьне беларускага народу, якая [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] і [illegible] [illegible] [illegible] [illegible] [illegible]. Колькі больш [illegible] [illegible] усё народ [illegible] [illegible] для [illegible] [illegible] [illegible], [illegible] гэтым [illegible] народную волю і сваю незломную сілу Духа. [illegible] [illegible], як народ і [illegible] [illegible] новага нацыянальнага адраджэньня ў часе "Нашай Нівы", калі беларускі народ змог [illegible] са сваёй [illegible] магутных [illegible] беларускага слова, як Купала, Колас і Багдановіч, [illegible] пры такіх умовах [illegible] ў [illegible] [illegible]. Такой-жа [illegible] старонкай у гісторыі нашай нацыянальна-[illegible] барацьбы зьяўляецца [illegible] [illegible] [illegible] беларускай культуры, усіх галінаў мастацтва і навукі за часаў [illegible], калі, не маючы за сабой яшчэ багатай традыцыі, бела-

- 6 -

рускі народ змог прайсці у кароткім часе шырокую [illegible] свайго культурна-нацыянальнага шляху і годна ўвайсці на ўзровень сусьветна-еўрапейскі. Праўда, пачасьлівыя моманты такіх узьлётаў былі вельмі хутка падаўлены ў сваім зародку, пасьля чаго наступалі ўзноў цяжкія моманты заняпаду і прыгнечаньня.

Як ужо было зазначана, нацыянальнае паняволеньне галоўнай сваёй мэты – асыміляцыі народу звычайна не дасягае, бо паняволены народ заўсёды зможа перад ёю абараніцца. Затое яно ў большай або меншай меры затрымлівае нацыянальны рост паняволенага народу і развіцьцё ягонае культуры, наносячы яму гэтым незьлічоныя страты. Вось-жа гэтыя страты меў і мае беларускі народ, аб чым мы ніколі не павінны забывацца. У выніку доўгалетняга працэсу русыфікацыі і паланізацыі мы ў розных галінах культурна-нацыянальнага жыцьця значна адсталі ад узроўню тых шчасьлівейшых народаў, што гэтых перашкод на сваім шляху не мелі. Нацыянальнае нявольніцтва таксама не прайшло без шкодных уплываў на псыхалогію, мову і культурнае жыцьцё пэўнай часткі нашага грамадзянства і да пэўнае меры прычынілася [illegible] яго нацыянальнай годнасьці. Што аднак горш, яно пакінула па сабе невыцерты сьлед у псыхіцы пэўнай часткі беларусаў, якія прывыклі ў дачыненьні да сваіх або і ўсіх тых [illegible], што датычаць нашага народу, [illegible] як [illegible], але [illegible] катэгорыямі, прышчэпленымі ім чужацкім тэндэнцыйным выхаваньнем. Як-жа часта спатыкаемся з такім [illegible] зьявішчам сярод пэўнае часткі беларусаў, якія аб'ектыўнае асьвятленьне беларускай [illegible] нашай гісторыі, культуры, мовы [illegible] нацыяналізмам шавіністычным дзеля таго толькі, што яно [illegible] з [illegible] [illegible] нашае славутае мінуўшчыны беларускага народу і [illegible] іх. Або ці мала яшчэ сяньня сярод нас і такіх, якія да глыбіні душы абураюцца супроць узбагачэньня нашае мовы шляхам уводжаньня патрэбных слоў, узятых із старой беларускай літаратурнай мовы або з народных гаворак – гэтых натуральных крыніцаў развіцьця нашай літаратурнай мовы, у той час, калі засьмечаньне нашае мовы чужымі ці русыцызмамі або паланізмамі не выклікае сярод іх найменшае рэакцыі. Такіх фактаў можна прывесьці цэлае мноства, але і гэтага хопіць, каб зьвярнуць увагу на неабходную патрэбу ачышчэньня многіх нашых грамадзян ад іх псыхічнага нявольніцтва, [illegible] і абскурантызму, нанесеных ім чужым, тэндэнцыйным у дачыненьні да нас і шкодным нам выхаваньнем. Трэба больш крытыцызму і шчырае адвагі, а галоўнае шырокага асьвятленьня нашае слаўнае мінуўшчыны і [illegible] усіх нацыянальных патрэбаў сяньняшняга дня, каб вызваліцца ад гэтага нявольніцкага чаду.

З усіх гэтых разважаньняў даходзім да простага вываду, што ў барацьбе за наша поўнае вызваленьне нацыянальныя праблемы павінны займаць не толькі роўналежныя месцы сярод праблемаў дзяржаўна-палітычных і сацыяльна-эканамічных, але павінны ў гэтым вырашаючым комплексе праблемаў адыгрываць вядучую ролю. Без нацыянальнага вызваленьня не можа быць мовы і аб вызваленьні дзяржаўна-палітычным і сацыяльна-эканамічным нашага народу. І наадварот – усе нашы

- 7 -

гісторыі, а таксама і вялікая сучаснасьць выяўляюцца незапярэчнымі доказамі, што нацыянальныя ўпадкі і ўзлёты адводзілі ўвесь наш народ да найбольшага дзяржаўна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага. Высокі ўзровень нацыянальнага развіцця народу, яго нацыянальнай самасьвядомасьці і актыўнасьці ёсьць найбольшым гарантам і неабходнай базай у будаўніцтве яго дзяржаўна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага палепшаньня.

Усьведамленьне гэтага факту, як і патрэба канкрэтнай працы ў кірунку нашага нацыянальнага ўсьведамленьня, умацаваньня і развіцця нашай нацыянальнай спраўнасьці, праца ў галіне развіцця і папулярызацыі нашай нацыянальнай культуры і ачышчэньня яе ад чужога, наноснага і шкоднага элементу выступаюць адным з найважнейшых заданьняў нашага грамадзянства. Калі нашыя ворагі часамі ставяць нам закід шавінізму і варожага нацыяналізму, закід, які па сваёй бязгранічнай чужасьці паўтараюць і некаторыя беларусы з катэгорыі ўсьпланеных ужо людзей ці няпольскай псіхалёгіяй, то гэтым самым яны сьвядома стараюцца адвесьці, сьцісьнуць нас і затрымаць нашыя натуральныя імкненьні. Ні можа быць і мовы аб шавінізме і варожым нацыяналізме там, дзе ходзіць аб зусім натуральную абарону прыроднага развіцця і імкненьняў нашага народу перад яго абясьсіленьнем, а ніяк патрэбаю нацыянальнай сьмерці. Толькі-ж абаронаю перад гвалтам асыміляцыі і прыродным імкненьнем да поўніні нашага нацыянальнага жыцьця, а не наступам супроць правоў і справядлівых інтарэсаў іншых народаў, было і ёсьць усё нацыянальна-вызвольнае змаганьне беларускага народу. Ад часоў Багушэвіча, праз эпоху "Нашай Нівы", нацыянал-дэмакратызму і "Узвышша" аж да сяньняшняга дня асноўнай і вядучай праблемай нашага нацыянальнага адраджэньня і вызвольнае барацьбы была праблема н а ц ы я н а л ь н а я. Яна астанецца асноўнай і вядучай праблемай аж да таго часу, пакуль беларускі народ не дасягне адпаведнага ўзроўню свайго нацыянальнага развіцця і не забясьпечыцца гэтым самым перад асыміляцыйнымі імкненьнямі ягоных захопніцкіх суседзяў.

///////o///////

ІДЭА ЗЬВЫЗВАЛЕНЬНЯ.

"Сталін пагражаў бальшавізмам Эўропу, а Эўропа бальшавікоў"- маюць праўда і дасьціпны пераносіцца, калі ў апошняй фазе вайны мільёны маны чырвонаармейцаў асабіста пачалі пабачылі той небальшавіцкі сьвет, аб якім магі нічога дасюль зусім кепска ўяўляліся, што звалілася ў іх пад уплывам савецкае прапаганды. Гэтак сама і Эўропа, прайшоўшы людзей не чакаючы, магла магчымасьць пабачыць бальшавікоў такімі, якімі яны ёсьць у запраўднасьці, а не такімі, як іх старалася паказаць людзям Захаду той-ж бальшавіцкая прапаганда. Гэтае сустрэча Усходу з Захадам і часовае прыадчыненьне той жалезнай заслоны, што ўвесь час адзін сьвет старанна хавала перад другім, не магло абысьціся безь некаторых вельмі істотных уплываў на людзей пасьля гэтае заслоны. Яно паўплывала асабліва сярод шырокіх частак савецкіх грамадзянаў, пабачыўшы перамогаў у іншых краінах і прымусіла іх глянуць іншымі вачыма на акружаючы сьвет.

Калі глянуць на народы, каторыя, бязумоўна, гэтакаю сілаю цяперака дыспануюць — на маладую Нямеччыну і Італію, дык адказ знойдзем толькі адзін — у народзе. Толькі воля і дзейнасьць народу можа даць гэтую бязсупярэчную магутнасьць, але павінен народ адказываць шмат якім умовінам.

Культура, навука, багацьце народаў творыцца працай адзінак. Гэтаксама і сіла. Толькі на ўвеце трэба мець адно: каб кожная адзінка перад собскім дабром паставіла заўсёды ў найболей крытычным выпадку дабро сваяе нацыі і сваяе дзяржавы. Трэба, каб грамадзкая этыка адзінкі стаяла гэтак высака, каб гатовая была да найбольшых ахвяр дзеля дабра грамады — нацыі.

Але мала яшчэ самае ахвярнасьці адзінак. Каб яна дала вонкавы, відавочны эфэкт, мусіць быць злучаная з мільёнамі гэтакіх ахвярнасьцяў — мусіць тварыць ахвярную грамаду, ахвярны цэлы народ, мусіць быць выробляная ідэя працы і канцэнтрацыі яе і ўсех творчых сілаў для агульнага дабра.

І тутака ўжо ня можна сказаць, што я за добрае лічу гэтае, хоць ты лічыш тое зусім што іншае — тутака зразуменьне дабра мусіць быць ва ўсех аднолькавае; ня могуць тварыцца розныя групы і гурткі, каторыя сабе абапал супярэчылі б, бо гэта было бы нязьмерна шкоднае. Возьмям рэч чыста матэматычна: калі да сілы, скіраванай у адзін бок, далучым сілу з адваротным напрамкам, то іх ход альбо затармазуецца альбо зусем спыніцца. Гэта так, як да возу прыпрэгчы з кожнага боку аднаго каня і пагнаць разам — перацягне сільнейшы, але з якою натугаю сілаў.

Дык вось жа трэба сабе ясна сказаць, што ўсё тое добрае, што добрае для сілы і разьвіцьця маяго народу, усё тое благое, што гэтую сілу і разьвіцьцё аслабляе альбо ніштожыць.

Вось мы разгледзелі адную складавую сілы народу: цэлая нацыя творыць адну вялікую грамаду, каторае дабро ставіцца перад дабром адзінкі. Ня могуць існаваць ніякія партыі і староньніцтва, бо яны сваркамі паміж сабою аслабляюць сілу народу.

Далей, калі, прыкладам, у гаспадарцы знойдзецца такі сын, каторы не захоча ні сеяць, ні гараць, то частка поля ляжыць папарам, бо не хапае рук яе абрабіць, і тагды сям’я альбо прымусіць дармаеда працаваць, альбо яго вон з гаспадаркі выганіць, бо ён ня толькі выкарыстоўвае працу другіх, але і дэмаралізуе акружаньне. Гэтаксама і ў народзе — ніводзін чалавек ня можа жыць безкарысна для грамады, і ніхто ня можа карыстаць дарэмна са здабытых грамадою добраў.

Мернікам вартасьці для агулу кожнай адзінкі мусіць стацца яе праца, бо толькі той стаіць на высокім ураўні этычным і заслугоўвае на апеку цэлага народу, хто трудом свайго жыцьця здабудзе сабе супакойны быт і пашану сярод другіх. Гэдак ня можа быць у народзе групы людзей, каторыя карысталіся б працай другіх. Згінула Масква цароў, бо жыла з нялюдзкага прыгону сялян і работнікаў; завалілася Польшча, бо ўтрымлівала коштам загнобленых Беларусоў, Украінцаў, Немцаў свору ўрадавую і паліцыйную; прападзе з паверху зямлі бальшавіцкая, здэмаралізаваная Масква, бо крывавым потам і сьлязамі горкімі сучасных нявольнікаў, у нялюдзкі спосаб ніштожаных народаў — Беларусоў, Украінцаў, Фінаў і шмат, шмат іншых корміць сваіх новых цароў — камісараў, жыдоўскіх агітатараў і катаў.

Гэта другая складавая сілы — кожная адзінка мусіць бязумоўна сумленна працаваць, праца чалавека павінна сьведчыць аб яго вартасьці. Але ня толькі самая малынальная праца ставіцца як прынцып жыцьця і сілы народу, павінна паўстаць індывідуальная і грамадзкая воля працы, бо воля заўсёды родзіць чын, дзейнасьць, а дзейнасьць — гэта зарука існаваньня народу.

Трэцяю, творчаю сілу народу складавою ёсьць індывідуальная і грамадзкая сьведамасьць. Кожная адзінка мусіць быць сьведамая мэты сваіх імкненьняў і мэтад здабываньня дабра для нацыі і пакаленьняў. Мусіць знаць падрабязна сваю ролю ў агромістай машыне грамадзянскага жыцьця і мусіць ведаць, якую вартасьць прадстаўляе яна сабою, сваёю працаю для грамады, а гэдаксама, чаго ў якіх выпадках можа грамада ад яе патрабаваць.

Значыцца, адзінка мусіць мець поўную веду сваіх пачынаньняў грамадзкіх і веду каардынацыі, тарнаваньня іх да дзейнасьці ўсех. Зразумела, што ўсё гэта будзе грамада самая пры помачы адносных дзейнікаў накіроўваць, але тым ня меняй павінна існаваць і сьведамасьць адзінкі, каб ня было ніякіх зудыраў і незразуменьняў. Толькі сьведамая мэтай у працы адзінка можа карысна і рэзультатна працаваць.

А да гэтага заўсёды ў кожнай грамадзе мусіць побач сьведамасьці адзінкі існаваць сьведамасьць грамадзкая, каторая дапаўняе сьведамасьць індывідуальную і творыць з ёю суцэльнасьць. Гэдаксама і ў народзе.

Народная сьведамасьць — гэта пачуцьцё сілы; народ сьведамы чуецца сільным, і наадварот, народ запраўды сільны мае сьведамасьць свае вартасьці. Сьведамасьць народу вырабляецца і ўтрымоўваецца пры пазнаваньні свае мінуўшчыны, свае культуры, свае ролі сярод іншых народаў, сваіх маральных вартасьцяў і сваіх імкненьняў у будучыні пры разбудоўваньню свайго дабрабыту.

Народ, каторы мае гэдакую веду, можа крытычна зраўняць сваю вартасьць з вартасьцямі бліжэйшых і дальшых сусядоў і стойка стануць на адпаведнай сабе ступені, з каторае ўжо ніколі не адступіцца. Гэта будзе сіла — сіла гарла ў сваём гнязьдзе.

Але як мурашкі ў хвіліну небязьпекі ў першай чарзе рупяцца аб сваім патомстве і ратуюць наўперад яечка і куконы, ня думаючы аб сабе, гэдаксама і кожны разумны народ найболей рупіцца аб апецы і выхаваньні наступнага пакаленьня. Моладзь творыць заўсёды авангарду і перадоўжэньня ўсіх ідэяў, імкненьняў і прац, а гэдаксама перадоўжэньня сілы. Таму, што калі б кожнае пакаленьне не стаяла на вышэйшым ураўні чым за папярэдняе, то ня было бы зусім інтэлектуальнага і цывілізацыйнага поступу; дык заўсёды стараньня сільных народаў ідуць у кірунку пашырэньня і разбудовы сваіх ідэяў і сьветагляду ў душах моладзі. Гэдак творыцца разрост сілы.

Вось жа трэба старацца стварыць моладзі гэдакія ўмовіны фізычнага і культурнага разьвіцьця, а пры гэтым так добра зарганізаваць цэлую сыстэму асьветную народу, каб быць пэўным, што выхаваецца ў 100 процэнтах вартасных спадкаемцаў свае сілы. Зарганізаваная, здаровая і сьведамая сваіх заданьняў моладзь — гэта зарука сілы народу ў будучыні.

Разгледзілі мы чатыры галоўныя мамэнты, якія, злучаныя з сабою і ўведзяныя ў жыцьцё, створаць бязумоўна сільны і здаровы народ, народ будучыні. Перад гэтымі чатырма дзейнікамі заўсёды склоняцца і ўступяць шмат большыя народы, шмат большыя краі і шмат багацейшыя дзяржавы. А калі не ўступяць, то гэнымі дзейнікамі абаружаны народ заўсёды пакорыць сабе і змусіць скланіцца ўсе другія.

Найлепшым прыкладам могуць быць Нямеччына і Італія. Гэта народы, каторыя пасьля свайго заняпаду адрадзіліся, стварылі новы быт, абапёрты на вышсказаных прынцыпах, а пайменна:

адна адзіная партыя, зложаная з цэлага народу, стаўляючая дабро нацыі перад усім; грамадзкая ідэя і воля ахвярнае працы для дабра народу; народная сьведамасьць свае сілы і сваіх імкненьняў; сьведамая, у сваёй юнасьці ўжо магутная моладзь.

Маючы ў запасе гэдакія народныя ідэалы, гэныя народы з цьвёрдаю пэўнасьцю няўхільна ідуць да аканчальнае перамогі, каб стварыць жыцьцё будучыні на новых правах, а на першы плян стаўляюць дабро свайго народу.

І ня толькі яны, бо ўжо на гэных самых ідэалах творыцца сіла і ў другіх народаў: Гішпаніі, Фінляндыі, Грэцыі, апошнім часам ў Нарвэгіі, ну і ў народзе, каторы нам найбліжэйшы, бо мае супольныя імкненьні да барацьбы супроць супольнага ворага, — Украінцы.

Добра, як жа мы маем да гэных падзеяў аднесьціся, калі хочам выбіцца на перадавыя месцы ў цяку гісторыі?

Адказ ёсьць толькі адзін: тварыць сілу. Мусім на разгледжаных прынцыпах збудаваць належную нам магутнасьць. Трэба нам стварыць у нетрах свайго народу зразуменьне гэтых дзейнікаў і стварыць іх жа, каб магчы сваёю зарганізаванасьцю і воляй здабыць належны сабе пасад між іншымі народамі.

Трэба, каб кожны Беларус здабыўся на ахвярнасьць дзеля супольных мэтаў, каб свае думкі, свае імкненьні злучыў з думкамі і імкненьнямі другіх, каб нават уступіў у некаторых мамэнтах, калі другі не дасца пераканаць і ўступіць, а калі гэта для дабра справы будзе патрэбнае. Каб усе злучылі працу сваю ў адным — барацьбе за лепшую долю Беларускага Народу, а корам працы аддалі ў рукі пакліканых да гэтага людзей. Ня можа быць у нас разломаў. Адна, моцная, шчыльна зьвертая грамада — гэта зарука сілы.

Працы мы не баімося: мы вырасьлі ў гэткіх умовінах, дзе толькі цяжкая праца магла нам даць магчымасьць жыцьця. Выкарыстоўваныя з аднаго боку Польшчай, з другога царскаю ці бальшавіцкаю Масквою, прывыклі мы працаваць шмат, шмат болей, чым нам трэба было, прывыклі галадаць пасьля цяжкай працы, бо апошняе альбо на падаткі аддалі, бо трэба было Гдыню будаваць, альбо забралі ад нас таварышы камісары, каб іх дзеткі — Міткі ці Срулькі — мелі ў Маскве што есьці, а што нашыя з голаду пухнуць, дык гэта не бяда.

Але мусім мы гэную пасьвяціць толькі для сабе, толькі для сваіх мэтаў, аддаць свае сілы і свой труд толькі свайму народу; надыйшла хвіліна, калі ўсе супольна мусім будаваць сваю сілу І тутака ня можа быць адзінак, каторыя стануць сабе збоку і будуць

ўглядацца, як другія працуюць, не, усе мусяць працаваць хаця бы на найніжшых становішчах, бо пасьля ўсе будуць рэзультатамі гэнае працы карыстацца. Часта трэба нават зракціся сваіх собскіх амбіцыяў, бо толькі праца і змаганьне пакажуць бязсумніўна, якую вартасьць каторая адзінка мае, і яна адпаведна разьдзеліць усім месцы. А заўсёды той чалавек балей вартасны, каторы сваім дзеяньнем вартасьці сваёй дакажа.

І з працы ахвярнай усіх створыцца аграпатэнцыял сілы народу, з каторым пачнуць лічыцца ўсе.

Далей, мусім падыймаць сваю народную сьведамасьць, мусім пашыраць веданьне свае культуры і гэтым самым падымаць культуру адзінак і народу. Беларус павінен ведаць, якія мэты ставіць сабе цэлы народ, якія імкненьні ён мае і чаму гэдакія, а ня іншыя. Кожны Беларус, а гэтым самым і цэлы народ, мусіць умець адрожніваць добрае ад благога ў нацыянальным зразуменьні, ведаць, да чаго мусіць імкнуцца, а што павінен абмінаць. Ня можна пазволіць думкам блукацца ў цёмры няпэўнасьці, а паддаць ім зразу здэцыдаваны цёк. Зноў жа сваю культуру, гісторыю і адносіны да другіх народаў трэба знаць дзеля здабыцьця пэўнасьці палітычнай — сьведамасьці грамадзкіх і палітычных імкненьняў. Народ мусіць быць супольнікам у жыцьці палітычным дзяржавы, а каб да гэтага дасьпеў, мусіць быць адказна сьведамы.

І ўрэшце, агромістую ўвагу мусім зьвярнуць на выхаваньне моладзі. Мусім выхоўваць сваіх спадкаемцаў ад наймалодшых гадоў аж да апошніх дзён студыяў акадэмічных. Гэтае выхоўваньне мусіць быць зарганізаванае — павінна стварыцца адна агульная арганізацыя маладога руху, каторая накіроўвала бы думкі і пачуцьці моладзі ў найлепшых напрамках і ў першую чаргу дэфіньявала бы ёй патрэбы і мэтоды працы для дабра народу. Сьцягі адпаведна прыгатаванай і зарганізаванай моладзі прадаўжалі б нашыя ідэі і нашую працу ў вольнай, самастойнай дзяржаве і арганізавалі б жыцьцё вольнага народу. Яны луналі бы нашую сілу на вонкі. Моладзь — гэта сіла нашай будучыні.

Апрача гэтага, трэба асьвету ўжо ад сяньняшняга дня гэдак паставіць, каб узровень культуры будучых пакаленьняў быў заўсёды вышшы ад сяньняшняга.

Каб да ўсіх гэтых мэтаў дайсьці, трэба дыспанаваць сілаю. Гэтую сілу за ўсялякую цану мусім супольнымі сіламі здабыць, а да гэтага трэба мець наступныя дадзеныя:

1. кожная адзінка мусіць перад сваім собскім дабром паставіць дабро народу;

ЖЫВЕ
БЕЛАРУСЬ!

2. ахвярнасьць для народу мусіць быць дэвізаю кожнага Беларуса;

3. ніхто ня можа астацца за навесам працы для народу;

4. кожная адзінка мусіць быць сьведамая сваіх і агульных заданьняў;

5. пазнаць родную культуру і падняць культуру духовую і матэрыяльную адзінкі;

6. зарганізаваць, выхаваць і вывучыць моладзь;

7. злучыць сваю волю ў адзін магутны ідэал — ідэал барацьбы за будучыню цэлага народу;

8. бяз огляду на ўмовіны і насьледкі рэалізаваць этапы гэтае барацьбы аж да перамогі і здабыцьця найвышэйшага дабра — самастойнае дзяржаўнасьці.

*Перадрукоўваецца паводле публікацыі ў наступным выданьні: “Беларуская думка XX стагоддзя. Філасофія, рэлігія, культура (Анталогія)” (Варшава, 1998, б. 369-376).*

# ЯК ЭМІГРАНТЫ СПРАБАВАЛІ НАЛАДЗІЦЬ СУВЯЗЬ ПРАЗ “ЖАЛЕЗНУЮ ЗАСЛОНУ”

*Кантакты: сіла прыцягнення Бацькаўшчыны (Да 90-годдзя Янкі Запрудніка) / укл. Н. Гардзіенка, Л. Юрэвіч. — Мінск: Кнігазбор, 2016. — 280 с.*

Янка Запруднік (сапр. Сяргей Вільчыцкі) — асоба знакавая для беларускай палітычнай эміграцыі. Калі ў 1950-60-я гады старэйшыя дзеячы паступова пачалі адыходзіць ад актыўнай дзейнасьці, маладых сілаў, якія б іх замянілі, аказалася недастаткова (у БЦР сытуацыя нават была горшая, чым у Радзе БНР). Запруднік вылучаўся сваёй адукаванасьцю, інтэлігентнасьцю, працаздольнасьцю. Ён — гісторык, журналіст (працаваў на Радыё Свабода), грамадзка-палітычны дзеяч. Каб на эміграцыі былі некалькі дзясяткаў такіх актыўных дзеячоў, беларуская палітычная эміграцыя здолела б стварыць для Беларусі значна больш. Але такіх былі толькі адзінкі і ім было вельмі цяжка пасьпяваць з усімі справамі.

Кніга “Кантакты”, укладзеная вядомымі дасьледчыкамі гісторыі беларускай эміграцыі Натальляй Гардзіенка і Лявонам Юрэвічам, зьяўляецца зборнікам. У яе ўвайшлі лісты, артыкулы з прэсы, успаміны (апублікаваныя раней і напісаныя адмыслова для кнігі). У ёй багата матэрыялу пра сувязі, легальныя і нелегальныя, беларускай палітычнай эміграцыі з Бацькаўшчынай, пачынаючы ад першых пасьляваенных гадоў. Згадваюцца кур’еры і перабежчыкі з-за “жалезнай заслоны”, якімі цікавілася Рада БНР. Янка Запруднік распавядае, як перадаваў весткі для маці ў Беларусь праз Польшчу. Дарэчы, праз тую ж ПНР перасылала і атрымлівала лісты ад некаторых эмігрантаў Ларыса Геніюш. Гэтым шляхам ліставаліся і іншыя дзеячы. У “Кантактах” зьмешчаны цікавы ліст Франца Гінтаўта з Горадні да Антона Адамовіча, перасланы ў 1959-м праз Польшчу ў ЗША.

З кнігі можна даведацца пра гісторыю беларуса Васіля

Сасноўскага, які ў 1977 годзе прымусіў экіпаж самалёта з Рыгі ляцець у Швецыю. У СССР яго ня выдалі, але пакаралі турэмным зьняволеньнем. Што зь ім сталася далей, таямніца. У кнізе зьмешчаныя лісты Сасноўскага, у тым ліку і да Запрудніка.

Згадваюцца таксама выпадкі, калі эмігранты адчувалі цікавасьць да сябе з боку савецкіх спецслужбаў. З дапамогай сваёй агентуры, КГБ зьбіраў разнастайную інфармацыю, дадаваў выдумкі і ідэалягічныя штампы ды друкаваў пашквілі на беларускіх эмігрантаў у газэце “Голас Радзімы”. Працягвалася гэта на працягу дзесяцігодзьдзяў. У “Кантактах...” ёсьць ліст айца Аляксандра Надсана, які піша, што ў канцы 1982-га працаваў з фондамі Беларускай бібліятэкі і музэя імя Ф. Скарыны ў Лёндане адзін беларускі навуковец з БССР, а пасьля зрабіў публікацыю ў “Голасе Радзімы”. Пры гэтым скарыстаў прыватныя гутаркі з а. Надсанам. Яны чакалі, што матэрыял будзе крытычны (інакш пра палітычных эмігрантаў тады было пісаць нельга), але атрымалася значна горш. Такіх расчараваньняў у кантактах з беларусамі з БССР хапала, але, напэўна, было больш пазытыву.

Увогуле тэма сувязі паміж эміграцыяй і беларусамі ў БССР і ПНР вельмі цікавая і вартая асобнага дасьледаваньня. “Кантакты” — гэта першая цаглінка, кропка адліку. Пачакаем, калі зьявяцца наступныя працы.

**Зьміцер Літвін**

## ГІСТАРЫЧНЫ РАМАН ПРА БЕЛАРУСКАГА “ЧОРНАГА КАТА” АД БЫЛОГА СУПРАЦОЎНІКА РАСЕЙСКАГА САЎБЕЗУ

У 2016 годзе ў Менску выйшаў гістарычны раман Валерыя Казакова “Чорны кот”. З “СБ. Беларусь сегодня” ад 24 чэрвеня даведаўся, што аўтар працаваў у Савеце бясьпекі Расеі. Падумалася, што можа ён доступ меў да сакрэтных архіваў і імі пакарыстаўся. Магчыма, але ў кнізе гэта амаль не адчуваецца, хутчэй начытаўся інтэрнэт-публікацый.

Галоўны герой рамана — лейтэнант КДБ РБ Вячаслаў Скарга, які па сваёй ініцыятыве шукае звесткі пра створаную падчас вайны беларускую арганізацыю “Чорны Кот”. Яму дапамагае ветэран дзяржбясьпекі, былы “бандалоў” Ягор Салевіч. Вельмі хутка Скарга




знаходзіць архіў польскай Арміі Краёвай, а ў ім — зашыфраваныя нямецкія дакумэнты, якія вывелі яго на схрон пад Заслаўем з картатэкамі на агентуру нямецкіх спэцслужбаў. У канцы рамана лейтэнант яе спальвае... А яшчэ ён закахаўся ў "БНФаўку", якую вырваў з рук "ментоў", параніў паляка, які таксама шукаў архіў, завербаваў яго і нясьвіжскага ксяндза, знайшоў 500-гадовыя пляны нясьвіжскіх падзямельляў. А яшчэ ў Скаргі ёсьць тайнік у нясьвіжскім доме, які дастаўся яму ад продкаў...

Падзеі цяперашняга часу пераплятаюцца з падзеямі часоў Другой сусьветнай вайны, паваеннага часу. Сярод дзеючых асобаў — вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху, праўда, у большасьці зь іх крыху зьмененыя прозьвішчы: Акунчыц (Фабіян Акінчыц), Міхаіл Гінько (Міхась Ганько), Ларыса Гайнюш (Ларыса Геніюш), Надзея Абрымава (Надзея Абрамава), Натальля Арэсьева (Натальля Арсеннева), генэрал Вітушкін (Міхась Вітушка), ксёндз Гандлеўскі (Вінцэнт Гадлеўскі), Велемір Астроцкі (Радаслаў Астроўскі), Яўген Джыхар (Жыхар).

У 1949 годзе ў Заходняй Нямеччыне нямецкі генэрал Гелен сустракаецца з прадстаўнікамі БЦР і БНР. Разам з Рагулем, "Вітушкіным", "Астроцкім" прысутнічае прэзыдэнт БНР... Захарка. Той самы, які памёр у 1943 годзе. Казакоў пераблытаў яго з Абрамчыкам. Але гэта яшчэ ня ўсё. Да іх завітаў маёр Геруліс, той, якога, нібыта, расстралялі яшчэ ў 1945-м... Як бачым, для тых, хто ў тэме, месцамі раман чытаецца нават весела.

Высьвятляецца, што чалавек "Чорнага Ката" працаваў у Савеце міністраў БССР, а яго прыёмная дачка была сувязной

(у яе пасьля закахаўся “бандалоў” Салевіч). Пасьля сыходу за мяжу Вітушкіна з групай партызанаў, іх “закансэрвавалі”, а з часам ліквідавалі свае ж. Увогуле ў картатэцы налічвалася больш за 31 тысячу агентаў. Але лейтэнант КДБ вырашыў не шукаць гэтых людзей ды іх нашчадкаў, пасьля жахлівага сну ён ім “дараваў”. Ня верыцца, але менавіта так заканчваецца першая частка. Цяжка пакуль уявіць, пра што будзе другая. А аўтар, здаецца, плянуе ўжо напісаць і сцэнар для фільма.

**Сяргей Ёрш**

# ПРА НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭНЬНЕ Ў НЯСЬВІЖЫ Ў 1954 ГОДЗЕ

10 сьнежня 2016-га ў ЖЖ на старонцы bulbaed.livejournal.com былі апублікаваныя цікавыя дакумэнты. Аўтар піша: "У жніўні 1954 году з радыёкропак несьвіжан замест звыклых пазыўных роднага савецкага радыё раптам загучалі "варожыя галасы"! Якая была рэакцыя слухачоў на гэтую навінку? Мо спалохаліся, што Эйзенхаўэр ужо ў Маскве (а тады тэма новай вялікай вайны была на слыху, яе баяліся, а ў Заходняй Беларусі некаторыя нават і чакалі), а мо і ўзрадаваліся нечаканай магчымасьці. Прынамсі, да верасьня жыхары вуліц Ленінскай і Садовай маральна разлагаліся пад дзеяньнем буржуазнай прапаганды, пакуль нехта не данёс куды трэба. І тут аказалася, што за ідэалагічнай дывэрсіяй стаяць не панскія ці нацдэмаўскія недабіткі, а партыйцы-ленінцы! Карацей, вось гэта кур'ёзная гісторыя шурпатай мовай партыйнага пратакола".



§-6.

О случаях передачи радиостанции "Голос Америки" по радиоточкам города Несвижа.

В конце августа месяца и в первых числах сентября 1954 года в городе Несвиже было отмечено четыре случая трансляции радиостанции "Голос Америки" по радиоточкам, установленным в квартирах граждан, проживающих по улицам Ленинской и Садовой.

6 сентября 1954 года проверкой работниками райотделов милиции и связи установлено, что передачи радиостанции "Голос Америки" в перерыв работы городского радиоузла с 15.00 по 16.00 часов транслировались из квартиры члена КПСС тов.РУДАКОВА, радиоприёмник которого настраивался на волну указанной станции. В связи с тем, что радиоприёмник был соединён с радиоточкой, которой пользовался тов.РУДАКОВ от городского радиоузла, и была слышимость передачи радиостанции "Голос Америки" по радиоточкам, установленным в квартирах граждан по улицам Ленинской и Садовой. В момент обнаружения у радиоприёмника находилась член КПСС тов.ГАГАРИНА Т.К., находившаяся в то время в отпуске у тов.РУДАКОВА, которая и организовала слушание передачи радиостанции "Голос Америки".

Во время слушания передач "Голос Америки" ГАГАРИНОЙ Т.К. с ней находилась и дочь РУДАКОВА Н.А., РУДАКОВА Тамара Николаевна, член КПСС, но мер к запрещению указанных действий не приняла.



\- 5 -

Тов.РУДАКОВ Н.А. не предупредил никого из членов семьи о подключении приёмника от городской радиосети во время его работы, чем создал условия для трансляции передач радиостанции "Голос Америки".

БЮРО ГК КПБ ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. За непринятие мер к предотвращению передач радиостанции "Голос Америки" от радиоприёмника по радиоточкам, члену КПСС тов.РУДАКОВУ Николаю Александровичу ОБЪЯВИТЬ СТРОГИЙ ВЫГОВОР с занесением в учётную карточку.

2. Член КПСС тов.РУДАКОВА Тамара Николаевна заслуживает строгого партийного взыскания, но учитывая то, что она не знала, что радиоприёмник соединён с городской радиосетью, а также, что она не является главой семьи, за непринятие мер к запрещению слушания, ГАГАРИНОЙ Т.К. передач райдиостанции "Голос Америки", - члену КПСС тов.РУДАКОВОЙ Тамаре Николаевне ОБЪЯВИТЬ СТРОГИЙ ВЫГОВОР.

3. Довести до сведения Пензенского ГК КПСС для принятия мер о том, что член КПСС ГАГАРИНА Тамара Константиновна, находясь в отпуску в городе Несвиже, в конце августа и в начале сентября 1954 года слушала по радиоприёмнику принадлежащему её дяде РУДАКОВУ Н.А. передачи радиостанции "Голос Америки" и в связи с тем, что приёмник был соединён с городской радиостанцией, допустила четыре раза трансляцию передач по радиоточкам, установленным на двух улицах города. -

# 25 ГАДОЎ ТАМУ БЫЛО АБ’ЯЎЛЕНА, ШТО ЯЗЭП ПІЛСУДЗКІ — БЕЛАРУС



У кастрычніку 2016 году, 25 гадоў таму, было аб’яўлена, што вядомы палітычны і вайсковы дзеяч Польшчы, кіраўнік польскай дзяржавы Язэп Пілсудзкі (1867 — 1935) зьяўляецца беларусам, піша “Эўрарадыё”. Сэнсацыйную інфармацыю ў кастрычніку 1991-га паведаміла БЕЛТА, яе падхапілі ўсе тагачасныя беларускія СМІ. Адзначалася, што ў Галоўным архіўным упраўленьні Рэспублікі Беларусь “знойдзены дакумэнт, які абвяргае існуючую думку, што вядомы палітычны дзеяч Польшчы 20-х — 30-х гадоў Юзаф Пілсудзкі быў палякам”. У пратаколе допыту 19-гадовага рэвалюцыянера 10 сакавіка 1887 году пазначана, што Пілсудзкі сказаў: па нацыянальнасьці ён беларус.

Пазьней прафесар Аляксандр Хацкевіч у сваім артыкуле “Юзэф Пілсудзкі. Беларус ці паляк?” працытаваў той дакумэнт: “Завуць мяне Осіп Осіпавіч Пілсудзкі; ад роду маю 19 гадоў; паходжаньне і народнасьць дваранін, беларус...”. Гісторык дапускаў, што род Пілсудзкіх меў “беларускую каталіцкую галіну”. Сам Язэп, які нарадзіўся на Віленшчыне, валодаў беларускай мовай і выступаў на ёй перад беларускай аўдыторыяй. У той жа час Хацкевіч адзначаў, што “нельга ідэалізаваць пратакольны адказ Пілсудзкага ў час допыту аб тым, што ён “беларус”, паколькі “ілжывыя адказы арыштаваных да рэвалюцыі па палітычных матывах рэвалюцыянераў, з мэтай зьбіць з панталыку паліцыю,

добра вядомы”.

● ДАСЬЕ ЦІКАВАГА ФАКТА

# ПІЛСУДСКІ — БЕЛАРУС?

У Галоўным архіўным упраўленні Рэспублікі Беларусь знойдзены дакумент, які абвяргае існуючую думку, што вядомы палітычны дзеяч Польшчы 20-х — 30-х гадоў Юзэф Пілсудскі быў палякам. Захаваўся пратакол допыту дзевятнаццацігадовага Пілсудскага па справе «першамартаўцаў», датаваны 10 сакавіка 1887 года. У гутарцы з падпалкоўнікам Стравевым тады мала каму вядомы юнак сцвярджаў, што ён ад нараджэння Іосіф Іосіфавіч, дваранін, і па нацыянальнасці беларус.

— Гэта навіна сапраўды сенсацыйная, — лічыць начальнік Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Аляксандр Міхальчанка. — І хоць справа не ў нацыянальнасці таго ці іншага палітычнага дзеяча, думаю, наша знаходка дапаможа даследчыкам па-новаму паглядзець на дзейнасць Пілсудскага і яго палітыку ў адносінах да Савецкай Расіі. Сёння ў энцыклапедыях можна прачытаць, што Юзэф Пілсудскі быў настроены варожа адносна Краіны Саветаў. Можа, прычына гэтай варожасці ў нацыянальных каранях!

Дарэчы, вядома, што большую частку беларускай і польскай інтэлігенцыі Юзэфу Пілсудскаму ўдалося схіліць на свой бок менавіта дзякуючы выдатнаму веданню беларускай мовы. Гісторыкі таксама сцвярджаюць, што выступаць перад аўдыторыяй ён лічыў за лепшае на беларускай мове.



*Зацемка ў мінскай газэце “Добры вечар” ад 31 кастрычніка 1991 году.*

# Юзэф Пілсудскі. Беларус ці паляк?



*Артыкул у газэце “Чырвоная змена” ад 28 сьнежня 1993 году.*

# СПОЎНІЛАСЯ 90 ГАДОЎ, ЯК РАСЕЯ ВЯРНУЛА БЕЛАРУСІ ГОМЕЛЬСКІ І РЭЧЫЦКІ ПАВЕТЫ

*be.wikipedia.org*

У сьнежні 2016-га споўнілася 90 гадоў, як Расея вярнула Беларусі Гомельскі і Рэчыцкі паветы (у іх на той час жылі 649 тысяч чалавек). У гісторыі гэтая падзея называецца “Другім узбуйненьнем БССР”.

Пасьля заключэньня паміж Польшчай і Савецкай Расеяй Рыжскай дамовы 1921 году наша краіна аказалася падзеленая. Заходняя Беларусь увайшла ў склад польскай дзяржавы. Значная частка Усходняй Беларусі была ўключаная ў склад РСФСР. БССР складалася толькі з 6 паветаў — часткова Менскага, Барысаўскага, Бабруйскага, Ігуменскага, Мазырскага і Слуцкага. У 1924 годзе адбылося “першае ўзбуйненьне” савецкай Беларусі, калі ёй са складу Расеі вярнулі значныя ўсходнія беларускія тэрыторыі. Гомель і Рэчыца вярнуліся толькі праз два гады. Іх вяртаньня дамагаліся ад маскоўскага кіраўніцтва беларускія камуністы, інфармуе euroradio.fm.

# У 1960-Я ЗА БЕЛАРУСКІМІ НАЦЫЯНАЛІСТАМІ ЗАЦЬВЕРДЗІЛАСЯ МЯНУШКА “БУЛЬБАШЫ”

У жніўні 2013-га на сайце *“Историческая правда”* з’явіўся артыкул пра ахвяраў украінскіх нацыяналістаў у 1940-50-я гады ў паўднёвых абласьцях Беларусі. Нас зацікавіў адзін з камэнтароў, які зрабіў **Аляксандар Кірсанаў** (пазьней ён чамусьці быў выдалены). Ён пісаў наступнае (падаем у перакладзе на беларускую мову):

“Не ўсё так адназначна. На Піншчыне дзейнічалі беларускія нацыяналісты. Гэта з апавяданьняў майго бацькі. Білі яны ўсіх запар — і немцаў, і рускіх. Тое, што яны супрацоўнічалі з украінцамі, сумневаў не выклікае. Таксама забівалі савецкіх актывістаў, асабліва ў вёсцы. Бацька казаў, што яшчэ ў канцы пяцідзесятых гадоў “ястрабкі” з Пінска ладзілі аблавы на раёне. Тых, каго лавілі, звычайна прывозілі альбо ў турму на Брэсцкай вуліцы, альбо на падворак езуіцкага Калегіюму. Дакладней не скажу, але яшчэ магу даведацца.

Дарэчы, у шасьцідзесятых [гадах] за беларускімі нацыяналістамі замацавалася мянушка “бульбашы”. Ня ведаю дакладна, да якога часу яны дзейнічалі, але яшчэ ў сярэдзіне шасьцідзесятых я пачуў як пра кагосьці казалі нашы суседзі — “Бульбашы забілі”. Гэта я тады ўпершыню пачуў, будучы дзіцём”.

*http://www.istpravda.ru/bel/research/4770/*

# СТРЭЛЫ НА САВЕЦКІМ ПАМЕЖЖЫ

Ужо некалькі дзён на ўсім савецкім памежжы, як уначы, так і ўдзень, можна пачуць шматлікія стрэлы са стрэльбаў і кулямётаў. Але гэта не стрэлы памежнікаў, якія трэніруюцца, бо кожны раз яны чутны ў розных месцах. Адзін, два, тры стрэлы за раз, другі раз у іншым месцы некалькі, а нават і некалькі дзясяткаў стрэлаў.

Як распавядаюць уцекачы з савецкай Расіі, гэтыя стрэлы зьяўляюцца рэхам аблаваў і сутычак памежных аддзелаў з дзеючымі на савецкім памежжы групамі "лішэнцаў", высланцаў, якія ўцяклі з месцаў свайго высланьня і хаваюцца ў лясах і палях, часта нападаюць на жаўнераў, камсамольцаў, міліцыю і агітатараў за калектывізацыю. Праўдападобна найбольш дзеючых груп знаходзіцца на Случчыне, каля Узды.

Гэтыя весткі падобныя на праўду. "Лішэнцы" г. зн. пазбаўленыя правоў, а таксама сродкаў да жыцьця, заробкаў, неяк мусяць выжываць. Таксама мусяць выжываць людзі, якія хаваюцца ад высылкі і непазьбежнай сьмерці ў халоднай краіне поўначы ад голаду ці ад страшэннай цынгі.

*Zycie Nowogródzkie (Наваградзкае жыцьцё), 1930, № 185, 11 жніўня*

# БОЙ КУЛАКОЎ З САВЕТАМІ Ў БЕЛАРУСІ

Савецкая прэса ў Мінску згадвае пра хваляваньні і актыўнасьць кулакоў у Савецкай Беларусі. Паводле падлікаў на працягу паўгода яны замардавалі 58 камуністаў і 48 агітатараў за калектывізацыю. У той жа пэрыяд былі наўмысна падпалены 50 калектыўных гаспадарак, 40 дзяржаўных будынкаў і некалькі соцень хлявоў агульнай вартасьцю некалькі мільёнаў злотых.

*Zycie Nowogródzkie, 1930, № 187, 14 жніўня.*

.

# ДЗЯРЖЫНСКАЯ МІЛІЦЫЯ НАЗВАЛА СВАЙГО ПЕРШАГА НАЧАЛЬНІКА "БАНДЫТАМ"

Чытаў нядаўна кнігу пра гісторыю міліцыі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласьці (Высоцкий Н. Милиция Дзержинщины: история и современность. Дзержинск, 2008) і быў уражаны тым, што яны называюць свайго першага начальніка Паўла Калечыца... "бандытам". Ён быў прызначаны на гэтую пасаду 8 сьнежня 1918-га выканкамам павятовага зьезду Саветаў. У жніўні 1919-га, калі прыйшлі польскія акупанты, быў арыштаваны, але пасьля вызвалены. У лістападзе 1920-га разам зь іншымі мясцовымі беларускімі дзеячамі арганізаваў Койданаўскую самастойную рэспубліку, якая праіснавала 4 дні і была ліквідаваная Чырвонай Арміяй. У 1921 годзе савецкія агенты схапілі Калечыца ў Стаўбцах і вывезьлі ў савецкую Беларусь, дзе ён быў расстраляны.

Аўтар кнігі пра міліцыю піша, што ў раёне Койданава ў 1919-1921 гадах "зьверствавалі і мясцовыя бандыты, сярод якіх аказаўся і былы начальнік міліцыі Павел Калечыц". Аднак ніякіх фактаў такіх "зьверстваў" не прывёў.

Незразумелы сэнс гэтай акцыі. Што будуць адчуваць цяперашнія міліцыянты, даведаўшыся пра "бандыта" на пасадзе мясцовай міліцыі амаль сто гадоў таму. Тым больш, гэта ж няпраўда. Ня быў Калечыц бандытам! Ім бы ганарыцца такім начальнікам, беларускім патрыётам, а яны яго паліваюць брудам.

**Іван С.**,
Стаўбцы

# АЛЕСЬ БЕЛАКОЗ

*svaboda.org*

1 сьнежня 2016-га на 89-м годзьдзе жыцьця памёр вялікі беларускі патрыёт, вядомы краязнаўца, настаўнік Алесь Белакоз. Яшчэ ў савецкія часы ён стварыў у Мастоўскім раёне ўнікальны Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-гістарычны музэй. Белакоз — заслужаны настаўнік Беларусі, заслужаны дзяяч культуры, адзін з першых быў ушанаваны мэдалём імя Францішка Скарыны.

Алесь Белакоз паўдзельнічаў у пасьляваенным беларускім антысавецкім Супраціве. Ён у адным з інтэрвію распавядаў, як у 1948 годзе, калі быў маладым настаўнікам, напісаў на аркушах паперы заклік “Змагайцеся за незалежную Беларусь!” ды раскідаў іх з цягніка па дарозе ў Менск. Пасьля надрукаваў антысавецкія ўлёткі, якія з сябрамі распаўсюджваў у Горадні. Тады беларускі патрыёт цудам пазьбег арышту, але на працягу дзесяцігодзьдзяў быў пад наглядам дзяржбясьпекі.

Белакоз паспрыяў выхаваньню шматлікіх беларускіх патрыётаў. Створаны ім музэй, мы верым, будзе насіць яго імя.

На пахаваньне Белакоза ў Гудзевічах выйшла ўся вёска. Людзі разьвіталіся са сваім знакамітым земляком, шчырым і ахвярным чалавекам.

Сьветлая памяць!

# СЯРГЕЙ ХАНЖАНКОЎ

*svaboda.org*

16 сакавіка 2016 году ў Менску памёр Сяргей Ханжанкоў, беларускі палітвязень савецкіх часоў. За тры дні да гэтага яму споўнілася 74 гады.

Ханжанкоў — легенда антысавецкага Супраціву. Народжаны ў сям'і палітвязьняў, ён, будучы студэнтам Беларускага політэхнічнага інстытуту, у 1962 годзе стварыў невялічкую кансьпірацыйную групу. Антысаветчыкі зьбіраліся ўзарваць радыёглушыльную вежу ў Менску, а пасьля гэтага распаўсюдзіць лістоўкі. Аднак адзін з сяброў Сяргея Ханжанкова аказаўся сэксотам дзяржбясьпекі. Акцыю правесьці не пасьпелі, удзельнікі групы былі арыштаваныя. Ханжанкоў атрымаў 10 гадоў зьняволеньня. У мардоўскіх лягерах пазнаёміўся з тагачаснымі дысыдэнтамі з усяго СССР, з беларускімі патрыётамі Цімохам Вострыкавым і Іванам Раманчуком.

Пасьля вызваленьня Сяргей Ханжанкоў жыў у Менску, працаваў інжынерам. Пра яго актыўна сталі пісаць у СМІ ў 2000-я гады, яго асоба зацікавіла і тэледакумэнталістаў. Пры гэтым ён так і ня быў рэабілітаваны (але рэабілітацыі і не прасіў). Ханжанкоў прымаў удзел у грамадзскім жыцьці, наведваў праваабарончыя

мерапрыемствы і акцыі, удзельнічаў ва ўшанаваньнях ахвяраў савецкага таталітарызму.

Гэта быў чалавек з няпростым лёсам. Цьвёрды ў сваіх перакананьнях, ідэйны, сьціплы. Неаднаразова дзяліўся ўспамінамі, дапамагаў падчас напісаньня намі тэкстаў пра беларускіх патрыётаў, пра таго ж Раманчука.

Сьветлая памяць!

## ЛЕЎ БЯЛЕВІЧ

Са спазьненьнем на некалькі месяцаў прыйшла вестка пра сьмерць у сьнежні 2015 году Льва Бялевіча, беларускага



патрыёта, удзельніка падпольнага СБП у Глыбокім у 1945-1947 гг. Ён нарадзіўся ў вёсцы Багуцкія цяперашняга Мёрскага раёну 10 сакавіка 1926 году. За ўдзел у Саюзе беларускіх патрыётаў 10 гадоў правёў у сталінскім ГУЛАГу. Пасьля вызваленьня жыў на Інце, пасьля — у Полацку. Памёр у Санкт-Пецярбурзе.

У 2006-м у лісьце на Радыё Свабода Бялевіч пісаў: "Калі ў паваенны час нас было вельмі мала, то цяпер тысячы юнакоў і дзяўчат сьмела ідуць пад бел-чырвона-белым сьцягам, баронячы волю і незалежнасьць нашай краіны. Іх зьбіваюць, кідаюць за краты, але розьніца ёсьць у параўнаньні з тым, як пакаралі нас, "гартаўцаў", наш "Саюз беларускіх патрыётаў". Чатырох нашых кіраўнікоў прысудзілі да сьмяротнага пакараньня, якое потым замянілі на 25 гадоў няволі. Сёньня змаганьне за свабоду, за сувэрэнітэт Беларусі знаходзіцца ў моцных руках нашай моладзі. Я веру, перамога будзе на іх баку".

Сьветлая памяць!

# СЯРГЕЙ ВЕРАЦІЛА: НАШЫМ НАРОДАМ БЫЛА ШЛЯХТА, ЯКУЮ ВЫНІШЧЫЛІ

Беларускі пісьменьнік **Сяргей Вераціла**:

“Я — аўтахтон, я тут нарадзіўся, мяне тут усе ведаюць. Праблема мне бачыцца ў тым, што мы не разумеем сам панятак “народ”. Што такое гэты самы народ? Вось, скажам, старажытныя цюркі падзялялі ўсіх на ханаў, народ і насельніцтва. Так і пісалі ў кожнай грамаце — аксіок (народ) і карабудун (чорныя людзі). Народам называлі сьвядомую частку людзей. У нас гэта была шляхта, якую вынішчылі пад корань. Падкрэсьлю, шляхта была нашым народам, а пазьней народам сталі называць народанасельніцтва, вось у чым памылка. Народанасельніцтва — не народ. Народ — гэта тое, што народжвае, што дзяржаватворнае. Калі некалькі адсоткаў цяперашніх сьвядомых беларусаў створаць дзяржаву, яны і будуць народам. Я сябе лічу часткай народу. Безь мяне народ няпоўны, і я без народу няпоўны”.

*Радыё Свабода, 22 ліпеня 2016 г..; http://www.svaboda.org/a/27873587.html*

# БЕЛАРУСЫ МОГУЦЬ АДСТАЯЦЬ СЯБЕ І СВАЁ, КАЛІ АПРАНУЦЬ УЛАСНЫ ВАЙСКОВЫ МУНДЗІР

Газэта "Новы час" друкавала цікавыя ўспаміны вядомага беларускага навукоўца-фальклярыста, дзеяча беларускай культуры **Арсеня Ліса**. Прапануем ўвазе нашых чытачоў дзьве цытаты пра падзеі другой паловы 1950-х гадоў.

"Аднойчы пры зборцы старэйшых пісьменнікаў І[ван] Шамякін загаварыў пра тое, што Кёнігсберг трэба было аддаць беларусам — мелі б выхад да мора. Запытальна глянуў на прысутных, але падтрымкі не пачуў".

"На Нясвіжчыне завітаў да былога вязня польскіх астрогаў Лукаша Капыткі. З увагі на не знаёмага яму маладзёна, былы дасведчаны падпольшчык асцярожненька, спасылаючыся нібы на нейкага старога дзеда, выдаў мне сваю думку наконт таго, калі беларусы могуць адстаяць сябе і сваё ад няпрошаных гасцей — менавіта, калі апрануць уласны вайсковы мундзір".

*Новы час, 2016, № 5, 5 лютага, б. 10-11.*

# КРАЎЦЭВІЧ: БЕЛАРУСКІМ ГІСТОРЫКАМ НЕ ХАПАЕ ДОЛІ ЗДАРОВАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

У кастрычніку 2016-га, чытаючы лекцыю ў Менску, вядомы беларускі гісторык **Алесь Краўцэвіч** выказаў шмат цікавых думак. Адну зь іх тут працытуем паводле паведамленьня сайта belsat.eu:

"Мой закід беларускім гісторыкам: яны шукаюць аб'ектыўнасьць, у той час як суседнія гісторыкі пішуць нацыянальную гісторыю. А мне гэта не падабаецца. У нас не хапае долі здаровага нацыяналізму. Нават там, дзе мы можам выпячваць сваё, мы — прыніжаем. Вось Вячорка пераклаў афіцыёзную гісторыю Летувы на беларускую. Але гэта прапагандысцкае выданьне, дзе ВКЛ пачынацца з тэрыторыі сучаснай Летувы, там няма Беларусі! Дык навошта ў гэтым удзельнічаць?".

## 70-я гадавіна пацыфікацыі беларускіх вёсак на Беласточчыне

2 лютага 2016-га споўнілася 70 гадоў пацыфікацыі беларускіх вёсак на Беласточчыне — Заняў, Шпакоў і Канцавізны. Злачынцы палілі выключна дамы праваслаўных, — распавядаюць сьведкі, зь якімі паразмаўляла Радыё Рацыя. 2 лютага 1946 году ў Занях загінулі 24 чалавекі, найстарэйшай ахвяры было 83 гады, наймалодшай — 3. У Шпаках загінулі 8 чалавек, у Канцавізне 2 лютага не было ахвяраў. Гэтыя злачынствы ўчынілі ўдзельнікі польскага антысавецкага падпольля.

## Каля Мілавідаў зьявіўся валун з прозьвішчамі паўстанцкіх камандзіраў

У красавіку 2016-га каля вёскі Мілавіды, дзе 3 чэрвеня 1863 года адбылася бітва паміж паўстанцамі Каліноўскага і расейскім войскам, усталявалі валун з прозьвішчамі паўстанцкіх камандзіраў. На там жа валуне ёсьць мэдальён з партрэтам Кастуся Каліноўскага.

## У Касьцюковічах зьявіўся помнік міліцыянтам

У траўні 2016 года ў Касьцюковічах зьявіўся памятны знак у гонар міліцыянтаў, якія загінулі пры выкананьні службовых абавязкаў. На ім 5 прозьвішчаў. Трое міліцыянтаў (Міхаіл Лістападаў, Дзмітрый Захараў і Аляксей Янюцін) загінулі ў 1946 годзе падчас ліквідацыі “бандыцкай групы”.

## Слонімцы памятаюць пра кіраўніка беларускага моладзевага антыбальшавіцкага падпольля

9 сакавіка 2016-га група слонімцаў наведалі на гарадскіх могілках па вуліцы Чырвоных партызан магілу Васіля Супруна (1926 — 2007), паэта, краязнаўца, кіраўніка беларускага моладзевага антыбальшавіцкага падпольля ў 1946-1947 гадах (“Чайка”, “Цэнтар беларускага вызваленчага руху”). Яны ўсклалі на яе і на магілу яго жонкі кветкі, згадалі пра сустрэчы і размовы са знакамітым земляком, прагучалі вершы Супруна. Сёлета на 10-е сакавіка прыпадалі 90-я ўгодкі з дня яго нараджэньня.

## У Курапатах усталявалі крыж у памяць пра Вацлава Ластоўскага

29 красавіка ў Курапатах усталявалі дубовы крыж у памяць вялікага беларуса Вацлава Ластоўскага (1883 — 1938). Ініцыятарамі зьяўляюцца сябры Таварыства аматараў гісторыі імя Ластоўскага, праект выканаў мастак Алесь Цыркуноў, а крыж — разьбяр Юрась Камандзірчык.

## Ветэран вайны падтрымаў бел-чырвона-белы сцяг

Восеньню 2016-га падчас збору ў Менску маладафронтаўцамі подпісаў за прызнаньне бел-чырвона-белага сьцягу гісторыка-нацыянальнай каштоўнасьцю на пікет прыйшоў 91-гадовы ветэран Другой сусьветнай вайны Мікалай Сурын. Ён падпісаўся. Зьміцер

Дашкевіч пісаў у Facebook: “91-гадовы партызан адмыслова для гэтай місіі апрануў усе баявыя ўзнагароды, а на разьвітаньне ўзьняў над Менскам бел-чырвона-белы сьцяг. Ён выглядаў велічна — нават воўчая зграя не асьмелілася кінуцца да яго і скласьці пратакол”.

## У Гродне зьявілася сьцяна з прозьвішчамі міліцыянтаў, якія загінулі ў баях з “ляснымі братамі”

10 лістапада 2016 г. у Гродне ўрачыста адкрылі Сьцяну памяці супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі падчас выкананая службовых абавязкаў. Яна стала часткай памятнага знаку, які быў усталяваны 12 гадоў таму, а цяпер — рэканструяваны, піша газэта “СБ. Беларусь сегодня”. На сьцяне высечанае 141 прозьвішча міліцыянтаў, большасьць зь іх загінулі ў паваенны час у баях з “ляснымі братамі”.

## Памяці паўстанцаў Каліноўскага

У кастрычніку 2016-га на Сьвіслаччыне прайшло традыцыйнае ўшанаваньне паўстанцаў 1863-1864 гадоў. Актывістаў з розных гарадоў краіны пасьля пачалі прыцягваць да адказнасьці за ўдзел у "несанкцыянаванай акцыі".

## Ахвяраў НКВД могуць выдаваць за ахвяраў нацыстаў

У Беларусі могуць працягвацца спробы падмены гістарычнай праўды. Як паведаміў у кастрычніку тэлеканал "Белсат", парэшткі 172 расстраляных у 1930-я гады каля вёскі Хайсы на Віцебшчыне выдаюць за ахвяраў нацыстаў. Такім чынам сьціраюцца сьляды сталінскага тэрору. Падобныя навіны зьяўляюцца з 1990-х гадоў, прычым з розных рэгіёнаў Беларусі. Ня можам прыпомніць выпадку, каб экспэрты засьведчылі, што выяўленыя парэшткі — ахвяры НКВД. Звычайна яны заяўляюць, што знойдзеныя ахвяры вайны. І ўсё.

## У Летуве знайшлі схованку з дакумэнтамі "лясных братоў"

Восеньню 2016 году ў Марыямпальскім раёне знайшлі схованку з дакумэнтамі летувіскіх "лясных братоў" партызанскай акругі "Таўро". Яны былі схаваныя ў бідоне, на які натрапіў фермер падчас палявых працаў. Ён завёў знаходку ў краязнаўчы музэй у Марыямпаль, а той адправіў дакумэнты ў архіў у Вільню. Як адзначае "Дэлфі", за апошнія 20 гадоў гэта самы буйны знойдзены партызанскі архіў. У ім налічваецца каля 2 тысяч аркушоў дакумэнтаў, падпольныя выданьні. Для іх рэстаўрацыі спатрэбіцца некалькі гадоў.

## Жалобная акцыя ў Менску

29 кастрычніка ў Дзень памяці ахвяраў палітычных рэпрэсій на прыступках КДБ у Менску зьявіліся партрэты расстраляных прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай інтэлектуальнай эліты. У

ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937-га ў сутарэньнях унутранай турмы НКВД сталінскія каты расстралялі больш за 100 чалавек — паэтаў, пісьменьнікаў, навукоўцаў, дзяржаўных дзеячоў.

## На Валыні паставілі помнік на магіле беларуса, байца УПА

У сьнежні 2016-га ўкраінскія СМІ паведамілі, што ў вёсцы Сераховічы Старавіжаўскага раёну Валынскай вобласьці (на поўдзень ад Ратна і Камень-Кашырскага) быў урачыста, у прысутнасьці мясцовых жыхароў, сьвятароў і прадстаўнікоў улады, усталяваны помнік на магіле беларуса Ёны Шышкевіча, які быў байцом УПА, меў псеўданім “Сагайдачны”. У 1945 годзе яго, параненага, схапілі энкавэдысты і доўга катавалі. Пасьля, яшчэ жывога, закапалі каля вёскі Буцынь. Уначы вяскоўцы перапахавалі паўстанца. Яны яго ведалі, як звычайнага селяніна, добрага гаспадара, чалавека, які сьпяваў у царкоўным хоры.

Помнік на магіле Шышкевіча вырашыў паставіць ураджэнец Сераховіч, былы дэпутат Андрэй Бандарчук, што і выканаў за свой кошт.

*Каля магілы беларуса-паўстанца УПА*

*Міхась Кукабака. Фота: ПЦ «Вясна»*

## Выйшла кніга “Міхась Кукабака”

У пачатку сьнежня 2016-га ў Беларусі прайшлі прэзентацыі дакумэнтальнай кнігі “Міхась Кукабака”. Яна прысьвечаная беларускаму дысыдэнту часоў савецкай акупацыі Міхасю Кукабаку. Гэта — зборнік інтэрв’ю, артыкулаў, лістоў Кукабакі, там зьмешчаная яго аўтабіяграфія. Выданьне падрыхтавалі праваабаронцы з “Вясны” і Цэнтру дасьледаваньняў грамадзянскай супольнасьці Беларусі. На прэзентацыях прысутнічаў і выступаў і сам 80-гадовы Міхась Кукабака, які прыехаў з Масквы. Праваабаронца і былы палітвязень Алесь Бяляцкі назваў яго жывой легендай беларускай праваабарончай дзейнасьці, падкрэсьліў, што ён “заўсёды прытрымліваўся прынцыпу мірнага супраціву”.

## Сабраныя подпісы за перайменаваньне вуліцы Камсамольскай ў вуліцу Слуцкіх паўстанцаў

Слуцкія грамадзкія актывісты летам 2016-га сабралі 550 подпісаў грамадзян за перайменаваньне Камсамольскай вуліцы ў вуліцу Слуцкіх паўстанцаў. У 1920-м яна была Шырокай, у будынку Эдварда Вайніловіча зьбіралася Рада Случчыны. Слуцкі раённы выканкам ініцыятыву не падтрымаў, спаслаўся на нейкі таямнічы сход 62 жыхароў вуліцы, якія выказаліся супраць перайменаваньня.

Восеньню 2016-га ў Слуцку распачаўся і збор сродкаў на ўсталяванне помніка слуцкім паўстанцам. З такой ініцыятывай выступіла сябра рады Руху “За Свабоду” Аліна Нагорная. Помнік плянуецца ўсталяваць насупраць будынка Слуцкага краязнаўчага музэю, дзе ў лістападзе 1920-га прайшоў зьезд Случчыны, які і абвясьціў барацьбу за незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі.

## Польскі часопіс зрабіў галоўнай постацьцю сьнежаньскага нумару генэрала Булак-Балаховіча

Польскі часопіс “Historia Do Rzeczy” зрабіў галоўнай постацьцю сьнежаньскага нумару генэрала Станіслава Булак-Балаховіча. Гісторык Пётр Зыховіч распавёў пра жыцьцёвы і баявы шлях таленавітага вайскоўца. Ён адзначае, што ў 1920 годзе войска Булак-Балаховіча было шматнацыянальным, а большая частка яго жаўнераў “паняцьця ня мела, што існуе нешта такое, як Беларусь”. Зыховіч мяркуе, што генэрала цяжка назваць беларусам, гэтак сама як палякам ці расейцам.

*“Балаховіча трэба памятаць, і трэба памятаць яго войска,* — так пракамэнтаваў публікацыю ў інтэрв’ю radyjo.net беларускі гісторык Ігар Мельнікаў. — *Гэта адна са старонак вайсковай гісторыі Беларусі. Аднак героямі варта рабіць тых, хто змагаўся менавіта за Беларусь. А гэтага беларускага акцэнту больш у слуцкіх паўстанцаў”.*

# Ушанавалі памяць айца Вінцэнта Гадлеўскага

Рух Салідарнасьці “Разам” ушанаваў памяць ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага (1888 — 1942). Акцыя традыцыйна праходзіць на каталіцкія Каляды, калі нацысты забілі сьвятара, лідара беларускага нацыянальнага антынацысцкага Супраціву. Ва ўрочышчы Благоўшчына ў Трасьцянцы ў 2008 годзе быў усталяваны

*racyja.com*

РОДНЫ
КРАЙ
'93

**Кантактныя адрэсы:**
**rezystans@gmail.com**
**rezystans2004@yahoo.com**

З усімі нумарамі «БР»  можна азнаёміцца на
**www.kamunikat.org**